Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 13 снежня 1985 г. № 50 (3304) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Дні культуры Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі ў Беларускай ССР

Урачыстае адкрыццё Дзён у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Выступае намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. МАЗАЙ.

Міністр культуры БССР Ю. М. МІХНЕВІЧ і старшыня рэспубліканскага камітэта па культуры, член Выканаўчага веча Скупшчыны СР Славеніі доктар Мацяж КМЕЦЛ (у цэнтры) адкрываюць выстаўкі ў Палацы мастацтваў.

Пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Праблемы вайны і міру ў сучаснай літаратуры».
Фота Ул. КРУКА.

Сябры з берагоў Ядрана

У свята братэрства, агульнасці лёсаў народаў ператварыліся Дні культуры Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі, якія праходзілі ў нашай рэспубліцы з 5 па 10 снежня. Для ўдзелу ў іх прыехала афіцыйная дэлегацыя на чале з першым намеснікам Старшыні Выканаўчага веча Скупшчыны Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі доктарам Б. Фрлецам. У аэрапорце гасцей сустрэлі намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ І. І. Антановіч, кіраўнікі раду міністэрстваў і ведамстваў, актывісты Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Дэлегацыі былі прыпаднесены традыцыйныя хлеб-соль, піянеры ўручылі гасцям кветкі.

Урачыстае адкрыццё Дзён адбылося 5 снежня ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Ад імя арганізацыйнага камітэта гасцей сардэчна вітала намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай.

Кіраўнік афіцыйнай дэлегацыі Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі, намеснік Старшыні Выканаўчага веча Скупшчыны Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі доктар Б. Фрлец адзначыў, выступаючы на адкрыцці Дзён, што вузы, якія звязваюць Славенію і Беларусь, з кожным годам становяцца ўсё больш глыбокімі і сардэчнымі і прымнажаючы іх, мы дзейнічаем ў інтарэсах усяго чалавецтва таму, што толькі мір, дружба, узаемаразуменне і ўзаемапавага маюць будучыню. Іншага шляху няма.

Прысутныя з цікавасцю пазнаёміліся з майстэрствам Славенскага духавога квінтэта, Люблянскага актэта, сусветна вядомай піяністкі Д. Томшыч-Срэбатняк.

На ўрачыстым адкрыцці Дзён прысутнічалі Старшыня Савета Міністраў БССР У. І. Бровікаў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Г. С. Тарасевіч, сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ І. І. Антановіч і С. А. Броннікаў.

У рамках Дзён праходзіў фестываль славенскіх фільмаў у Мінску, у Палацы мастацтваў працавалі выстаўкі славенскай партызанскай графікі, малюнка і плаката, а таксама дзіцячых малюнкаў, ілюстрацый кніг для дзяцей і юнацтва, вырабаў народных умельцаў. У Доме літаратара прайшло пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Праблемы вайны і міру ў сучаснай літаратуры», у якім прынялі ўдзел госці і вядомыя беларускія пісьменнікі. На мове братэрства вёўся дыялог і ў час літаратурнага вечара.

Госці наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь», знаёміліся з выдатнымі мясцінамі горада-героя Мінска, выступалі ў палацах культуры, на прамысловых прадпрыемствах. Сустрэчы, канцэрты адбыліся таксама і на сяле.

Дэлегацыя Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі на Днях славенскай культуры ў Беларусі была прынята ў ЦК КПБ. Сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін падзякаваў пасланцам братняга народа за вялікую і плённую работу па падрыхтоўцы і правядзенні гэтага свята, расказаў аб дзейнасці рэспубліканскай партарганізацыі па мабілізацыі працоўных калектываў на дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС і XXX з'езда КПБ, патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных і ў першую чаргу моладзі.

Кіраўнік дэлегацыі Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі доктар Б. Фрлец падзякаваў за цеплыню і гасціннасць, якія ўдзельнікі Дзён адчувалі ў Беларусі, падкрэсліў, што прайшоўшыя Дні культуры стануць своеасаблівай ступенькай, па якой нашы народы паднімуцца на больш высокі ўзровень супрацоўніцтва ва ўсіх галінах. Ён расказаў аб тым, як у іх рэспубліцы ідзе падрыхтоўка да X з'езда Кампартыі Славеніі.

У гутарцы прынялі ўдзел намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ І. І. Антановіч, С. А. Броннікаў.

Свята культуры і дружбы завяршылася 10 снежня. На ўрачыстым закрыцці ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі выступілі намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай і кіраўнік славенскай дэлегацыі, намеснік Старшыні Выканаўчага веча Скупшчыны СР Славеніі доктар Б. Фрлец. Вечар завяршыўся святочным канцэртам, фінальным акордам якога стала сімфонія Я. Глебава «Да міру». Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам БССР дырыжыраваў вядомы славенскі музыкант С. Хубад.

Праз дзесяць месяцаў з візітам у адказ у Славенію прыедуць беларускія майстры мастацтваў.

Дні культуры Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі ў Беларускай ССР

ПЕРАКЛАДЧЫКІ — НЕ ПАТРАБУЮЦЦА

Беларуская і славенская мовы шмат у чым роднасныя і блізкія паміж сабой, але не толькі таму ў мінулую пятніцу для большасці наведвальнікаў Палаца мастацтваў у Мінску перакладчыкі не патрабаваліся. На першым паверсе адкрылася некалькі выставак нашых сяброў, а мова ж выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — мова агульнанародная. Асабліва, калі творы адлюстроўваюць падзеі, аднолькава блізкія і зразумелыя кожнаму. Такія падзеі і ў беларусаў, і ў славенцаў звязаны з барацьбой супраць фашызму.

Дрэвы, абвугленыя так, што на фоне неба нагадваюць нейкіх дзіўных істотаў, якія працягнулі нямоглыя рукі, пасылаючы праклёны тым, хто сее смерць і слёзы. Знішчаныя вёскі, спаленыя людзі, разбураныя дамы... Гэта ўсё, што нясе з сабой фашызм. Таму не выпадкова падабенства матываў у творах розных аўтараў, прадстаўленых у экспазіцыі «Славенская партызанская графіка і малюнак». Большасць з іх самі прымалі актыўны ўдзел у народна-вызваленчай вайне і народнай рэвалюцыі ў Славеніі, сваімі вачыма бачылі тое, пра што расказваюць.

Хвалююць творы Ф. Міхеліча, хвалююць так, як можа хваляваць мастацтва, дакументальнае ў сваёй аснове, напоўненае вялікай праўдай рэчаіснасці. «Спаленая вёска», «Магіла ў лесе», «Пахаванне», «Партызанскія могілкі» — знаёмішся з гэтымі і іншымі работамі і быццам праходзіш і па нашай шматпакутнай зямлі, вяртаючыся ў тыя гады, якія аплачаны смерцю кожнага чацвёртага беларуса.

Актыўным удзельнікам барацьбы з фашызмам быў і Б. Якац. Творчасць яго ў той перыяд развівалася ў іншым кірунку. Разумеючы, што нашчадкі праз гады захочуць мець праўдзівае ўяўленне аб незабыўных падзеях, убачыць воблікі байцоў і кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху, Б. Якац стаў мастацкім летапісцам ваеннага часу, працуючы ў асноўным у жанры партрэта. Яго творы знаёмяць як з канкрэтнымі людзьмі — «Міле Калібарда», «Бранка», «Кулямётчык Кланчар», «Кур'ер Янезек», так і маюць абагульнены характар — «Ранены партызан з Істры», «Белакраньскі партызан», «Славенскі партызан у Розе», «Ісцерскі партызан».

Калі Ф. Міхеліч, Б. Якац, а таксама М. Пірнат, Д. Клеменчыч і іншыя аўтары пачыналі свой творчы шлях яшчэ да вайны, а ў час суровай барацьбы з фашызмам іх талент умацаваўся, набыўшы грамадзянскі кірунак, сацыяльную напоўненасць, дык такія сёння вядомыя майстры славенскай графікі, як І. Шубіц, А. Герловіч, Ф. Слана і іншыя, належаць да сярэдняга пакалення. Менавіта ў гады вайны з фашызмам, у час змагання за нацыянальнае вызваленне сказалі яны сваё першае важкае слова ў мастацтве. Як і старэйшыя таварышы, адлюстроўвалі дзве асноўныя тэмы, увогуле характэрныя для партызанскай графікі Славеніі. З аднаго боку — паказ мужнасці і гераізму лепшых прадстаўнікоў народа, з другога — выкрыццё варварства фашыстаў.

І. Шубіц. Усё спалена.

І. Селяк-Чопіч. Маці, якая ўцякае.

Тэматычна блізкая да гэтай экспазіцыі і выстаўка «Славенскі партызанскі плакат». Зноў жа адчуванне такое, што ўсё гэта недзе бачыў. Грубаватая, шэрага колеру папера, не надта дасканалая тэхніка выканання, пэўная сюжэтная абмежаванасць. Як быццам беларускія плакаты гадоў вайны з экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ці з Дзяржаўнага музея БССР! Але як радуе такое падабенства! Як яшчэ раз нагадвае аб тым, наколькі агульныя лёсы ў беларускага і славенскага народаў.

Нават назвы плакатаў у чымсьці знаёмыя, бо ўсе гэтыя работы маюць ярка выражаны агітацыйны характар. «А што ты зрабіў для вызвалення славенскага народа?» У. Лаковіча, «Славенскі селянін, хавай сваё зерне ад акупанта» В. Турка, «Зробім усё для нашай арміі» Я. Відзіца, «Возьмемся ўсе за зброю» М. Пірната, «Збірайце, дарыце Чырвонаму Крыжу» І. Шубіца... Што ні твор — уменне аўтараў паказаць сапраўдны твар фашызму і ўзвысіць чалавека-барацьбіта за свабодную Славенію.

Адначасова адкрылася выстаўка дзіцячага малюнка. Як і ўсе экспазіцыі падобнага плана, яна радуе шчырасцю і непасрэднасцю, з якой юныя аўтары імкнуцца адлюстраваць навакольны свет, расказаць аб тым, што хвалюе і радуе іх, падзяліцца самымі лепшымі сваімі марамі. Як і беларускія дзеці, славенскія хлопчыкі і дзяўчынкі малююць вялікае, быццам вогненны шар, сонца, ствараюць ўсмешлівыя партрэты сваіх блізкіх, сяброў і знаёмых.

А гэта тое, што адрасуюць сваім маленькім сябрам прафесійныя мастакі. Ілюстрацыя славенскай кнігі мае даўнія традыцыі. Нацыянальны коларыт асабліва адчуваецца, калі аўтары бяруцца за афармленне твораў для дзяцей і юнацтва, памятаючы пра маляўнічасць, адначасова імкнуцца, каб кожная работа несла пэўную інфармацыю, садзейнічала ідэйна-эстэтычнаму выхаванню маленькіх грамадзян. Гэтым задачам адпавядаюць ілюстрацыі, выкананыя такімі майстрамі сваёй справы, як М. Бізавічар, К. Волчаншэк, М. Ступіца і іншыя.

Узрадавала ўсіх, хто прыйшоў у Палац, і выстаўка твораў народнага мастацтва. Знакамітыя славенскія майстры пляцення з саломкі і лазы, ганчары прапанавалі арыгінальны посуд, дзіўныя фігуркі казачных персанажаў, густоўныя кашы і нават звычайныя сялянскія мяцёлкі, якія вельмі падобны на мётлы, якімі карыстаюцца ў беларускіх вёсках, але, як мяркуюць госці, у Славеніі яны ўсё ж лепшыя. Тое ж славенцы гатовы сказаць і пра іншыя традыцыйныя прылады сялянскай працы. А калі сур'ёзна, дык сапраўды — нельга не здзіўляцца таленту народа, які нават у звычайным, будзённым здольны ўбачыць паэтычнае і хораша, адметна ўмее перадаць яго. Асабліва маўляўнічыя славенскія нацыянальныя касцюмы. Шматколернасць іх усцешвае вока, а замыславатасць арнаменту сведчыць аб шчодрасці фантазіі народа, невычэрпнасць яго талентаў, спрыяльныя ўмовы для развіцця і самавыяўлення якіх сталі асабліва плённымі пры народнай уладзе.

М. ГЕЛЬСКІ.

У АБАРОНУ МІРУ І ПРАГРЭСУ

Сёння; калі па-ранейшаму ў свеце трывожна і неспакойна і ўсё яшчэ знаходзяцца вар'яты, гатовыя развязаць новую сусветную бойню, задача кожнай літаратуры не абыходзіць сваёй увагай праблем міру і вайны, змагацца за сацыяльны прагрэс, за светлую будучыню чалавецтва. Зразумела, слова не можа сарваць планы ваенных стратэгаў, але яно можа і павінна абуджаць і фарміраваць грамадскую думку, садзейнічаць таму, каб людзі добрай волі ва ўсім свеце зразумелі, што іх заўтрашні дзень залежыць ад іх жа саміх.

У гэтым сэнсе ў беларускай і славенскай літаратурах задачы агульныя. Таму і невыпадкова, што ў рамках Дзён быў праведзены «круглы стол» «Праблемы міру і вайны ў сучаснай літаратуры». У канферэнц-зале Дома літаратара на сустрэчу з гасцямі ў суботу сабраліся вядомыя беларускія пісьменнікі, прадстаўнікі розных жанраў. Сярод іх нямала тых, хто сам прымаў удзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ведае цану перамозе.

Пасяджэнне адкрывае першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР **Н. Гілевіч.** У наш час, гаворыць ён, дзе б ні збіраліся пісьменнікі, якія б літаратуры яны ні прадстаўлялі, гаворка пра вайну і мір, а правільней пра мір, пра тое, каб вайну прадухіліць, заўсёды становіцца галоўнай. У нас проста няма права не гаварыць пра гэта. Асабліва цяпер, калі сустрэліся беларускія і славенскія пісьменнікі. Акрамя прычын агульных, ёсць на тое яшчэ адна, пра якую ні ў якім разе нельга забываць. Дарэчы, аб ёй ужо нагадаў на нашых сустрэчах першы намеснік Старшыні Выканаўчага веча Скупшчыны Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі Б. Фрлец. Нашы два братнія народы з'яўляюцца тымі народамі, якія ў час барацьбы з фашызмам панеслі асабліва вялікія ахвяры. Таму нельга забываць аб 'перажытым, проста недаравальна забываць.

Зразумела, зазначае Н. Гілевіч, усе грані тэмы вайны і міру ў літаратуры абгаварыць вось так, адразу, немагчыма, бо яна надзвычай шырокая і шматгранная, але сам падыход да яе заслугоўвае пільнай увагі. І справа не ў нейкіх прыватных ацэнках ці вывадах. Магчыма, тут у чымсьці могуць быць і разыходжанні. Галоўнае, што перад агульнай памяццю мы можам і павінны зразумець адзін аднаго.

Выступаючы ад імя славенскага боку старшыня Саюза пісьменнікаў Славеніі **Т. Партліч,** прадставіўшы сваіх калег, якія прыйшлі на сустрэчу, характарызуе ў некалькіх словах жыццё творчага саюза рэспублікі, закранаючы аспекты тэмы вайны і міру ў славенскай літаратуры. Як відаць з выступлення Т. Партліча, славенскія пісьменнікі, гэтаксама як і беларускія, галоўную задачу бачаць у тым, каб ствараць творы, якія б не проста глыбока, а шматгранна, усебакова раскрывалі подзвіг народа ў барацьбе з фашызмам. Зразумела, што ў сувязі з гэтым кожны бачыць перад сабой не толькі канкрэтную задачу, але і своеасаблівую звышзадачу, каб наблізіцца да ўзроўню класічных твораў сусветнай літаратуры. У славенскіх пісьменнікаў неаднаразова ўзнікала гаворка наконт магчымасці стварэння новай «Вайны і міру». Прамоўца мяркуе, што падобныя творы па сацыяльным заказе не пішуцца. Не кожнаму таленту па сіле такая грандыёзная задача. Ды і другая сусветная вайна па свайму размаху адрозніваецца ад баявых дзеянняў 1812 года. Іншая справа, што кожны аўтар павінен імкнуцца пісаць так, каб сказаць усю праўду аб вайне. І тут клопаты і ў славенцаў, і ў беларусаў агульныя.

Гаворку прадаўжае старшыня рэспубліканскага камітэта па культуры, член Выканаўчага веча Скупшчыны СР Славеніі доктар **М. Кмецл.** Ён расказвае аб тым, як на працягу доўгай гісторыі славенскі народ самасцвярджаўся не войнамі, а культурай, як ва ўсе часы імкнуўся да міру. Нават у час другой сусветнай вайны, калі паўсюдна панаваў жорсткі тэрор, у Супраціўленні ўзнікла культурнае ядро, прадстаўнікі якога — пісьменнікі, мастакі, акцёры — змагаліся супраць ворага, і словам, і зброяй. Культурная работа ў той час, зазначае М. Кмецл, была гэткай жа зброяй, як і вінтоўка.

У гады супраціўлення было створана 250 кароткіх п'ес, якія заклікалі народ да барацьбы, апявалі мужнасць змагароў і выкрывалі зверствы фашыстаў. Гэткай жа праблематыкай была напоўнена і паэзія, якая таксама ўвесь час знаходзілася на пярэднім краі барацьбы. 10 тысяч вершаў засталося з той пары. Усе творы — і п'есы, і вершы — перавыдаюцца, каб служыць нашчадкам, уносіць уклад у агульную справу барацьбы за мір.

ПАКАЗАНА ЛЕПШАЕ

Урыўкі са спектакляў «Пядынак» М. Матукоўскага, «У спадчыну — жыццё» А. Петрашкевіча, «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага, «Дыскжакей» С. Палякова і іншых сваіх лепшых работ паказалі акцёры Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі ў час творчай справаздачы, прысвечанай XXVII з'езду КПСС, што прайшла ў Доме работнікаў мастацтваў. Прысутныя змаглі яшчэ раз ацаніць па вартасцях майстэрства заслужаных артыстаў БССР Л. Цімафеевай, Р. Маленчанкі, М. Пятрова, артыстаў С. Жураўля, Ж. Друцкай, Ю. Кухаронка, А. Жука, М. Лявончыка...

Галоўны рэжысёр тэатра У. Караткевіч расказаў аб творчым жыцці калектыву паміж двума партыйнымі з'ездамі. Сваіх сяброў віталі самадзейныя артысты Дома піянераў і школьнікаў Кастрычніцкага раёна г. Мінска, а таксама вучаніца восьмага класа СШ № 140 І. Баркун.

Сцэна са спектакля «Як гартавалася сталь».

Г. АНТОНАЎ.
Фота Ул. КРУКА.

У дзень нараджэння выдатнага беларускага паэта і перакладчыка, класіка нацыянальнай літаратуры Максіма Багдановіча, ушанаваць яго памяць да помніка, які ўстаноўлены ў Мінску, прыйшлі шматлікія прадстаўнікі грамадскасці горада-героя, супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча і іншых музеяў, студэнты. Да падножжа былі ўскладзены кветкі.

Фота Ул. КРУКА.

Канечне, працягвае прамоўца, у час вайны ўмоў для развіцця эпічных жанраў не было. Славенская літаратура, як і ўсе літаратуры ў падобных умовах, вырашала задачы ідэйна-агітацыйнага плана. Таму пісаліся кароткія п'есы, а не драмы, нават з'яўляліся партызанскія меладрамы, якія шмат у чым сталі асновай для напісання ў пасляваенны час празаічных твораў. Ды і сама тэматыка

Генадзь БУРАЎКІН і Тоне ПАЎЧЭК пасля пасяджэння «круглага стала».

Фота Ул. КРУКА.

твораў значна пашырылася. Ужо не толькі зверствы фашыстаў выкрывалі аўтары, не толькі пра мужнасць змагароў пісалі. Паступова на першы план пачынае выходзіць гаворка аб страце маральных каштоўнасцей на вайне, тым самым літаратура абжывала новыя гарызонты, узіралася ў тыя далягляды, якія раней абыходзіліся ўвагай.

Нам лёгка гаварыць, зазначае **В. Быкаў**, бо падобнасць перажытага вызначае і падобнасць нашых літаратур, асабліва прозы аб мінулай вайне. І беларуская літаратура ў рамках усёй савецкай літаратуры, і славенская ў рамках югаслаўскіх літаратур гучыць упэўнена, іх набыткі відавочныя. Але не трэба забываць, што ўсё галоўнае пакуль што напісана — прытым ва ўсіх жанрах — непасрэднымі ўдзельнікамі падзей. Узноўлена і перададзена як непасрэдна перажытае. Але час няўмольны ў сваёй хадзе, пакаленні франтавікоў адыходзяць. Таму нельга забываць, што, як гаварыў К. Сіманаў, усёй праўды аб вайне не ведае ніхто, акрамя самога народа. Пакуль у народзе жыве памяць, яе трэба выкарыстоўваць для літаратуры, для мастацтва. У сувязі з гэтым значэнне набываюць кнігі дакументальнага жанру, як «Я з вогненнай вёскі...» А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, як кнігі С. Алексіевіч. Мастацтва, працягвае В. Быкаў, суб'ектыўнае ў сваёй аснове, яно па сутнасці ідзе ў бок аўтарскага адлюстравання падзей. Чыстая праўда ляжыць там, дзе жыве народная памяць і яе, праўду гэтую, патрэбна ўзяць. І чым хутчэй, тым лепш, бо ўжо нават некаторыя ўдзельнікі вайны пачынаюць страчваць крытэрыі ў ацэнцы таго, што адбывалася, шмат чаго дамысліваюць, думаючы, што гэта было на самой справе. Але ж міфы і легенды не самае лепшае для рэалістычнага мастацтва.

Вядомы славенскі паэт і перакладчык **Т. Паўчэк** таксама засяроджвае ўвагу на тым, наколькі важна пісьменнікам напамінаць чытачу ў сваіх творах аб небяспецы новай вайны. Літаратура сёння не мае права заставацца ў баку ад праблем вайны і міру, не мае, бо яшчэ шмат у свеце нянавісці, няшчырасці. У сяго-таго гатова ўзнікнуць пытанне, а што можа зрабіць адзін верш у гэтай небяспечнай сітуацыі, калі ў мінуту на ўзбраенне трацілася адзін мільён долараў? Можа, калі паэзія будзе напоўнена такімі вечнымі паняццямі, як мір, свабода, вера. Няхай яна грамадскую свядомасць нават рухае наперад малымі крокамі, але гэта не можа не даць жаданых вынікаў. Важна, каб паэты не забывалі аб вялікіх гуманістычных традыцыях літаратуры, паглыблялі іх, развівалі далей.

І ў беларускіх, і ў славенскіх пісьменнікаў адны і тыя ж імкненні, жаданні, зазначае **Я. Брыль**. Мінулую вайну, гаворыць ён, неабходна паказваць так, каб гэта выглядала найбольш праўдзіва. Я б нават дазволіў сабе такі выраз — народна. Менавіта па-народнаму праўдзіва трэба імкнуцца гаварыць пра тое, што сам народ перажыў. Я. Брыль дзеліцца ўражаннямі, якія выклікала ў яго знаёмства з кнігай публіцыстыкі І. Андрыча, публіцыстыкі, якая так хораша чытаецца пасля цудоўнейшай прозы гэтага выдатнага майстра слова, успамінае аб сваёй паездцы ў Югаславію.

Расказаўшы аб тым, якія кнігі аб мінулай вайне выйшлі і выходзяць у славенскім выдавецтве «Борец», у прыватнасці, творы В. Быкава, вядомы драматург, празаік і публіцыст **У. Каўчыч** звяртаецца непасрэдна да свайго творчага вопыту. Я рана зразумеў, прызнаецца ён, што не мая задача пісаць аб тым, аб чым пісалі ці расказвалі іншыя. Самога ўдакладнення патрабаваў падыход да раскрыцця ўнутранага свету чалавека на вайне. Звычайна ў паводзінах людзей асобныя аўтары бачылі дзве крайнасці, паказваючы толькі чорнае і белае, адмоўнае і дадатнае. Але ж, кіруючыся падобным прынцыпам, можна перайсці да павярхоўнага адлюстравання падзей, спрашчэння ў нечым самой сутнасці барацьбы з фашызмам. Напрыклад, завастрае ўвагу У. Каўчыч, здараецца часам і так, што чалавек знаходзіцца ў стане ворага, але ў яго ёсць і добрыя якасці. Ці, наадварот, барацьбіт за свабоду, а душа быццам раздвоена. Значыць, у кожным выпадку патрэбна ўлічваць спецыфічныя ўмовы, каб не адысці ад праўды. Прамоўца прызнаецца, што спачатку не ўсе адобрылі такія яго мастакоўскія прынцыпы ў паказе чалавека на вайне. Але задача кожнага пісьменніка і заключаецца ў тым, каб правільна пранікнуць у сутнасць кожнай з'явы. Літаратура, на думку У. Каўчыча, ідзе далей палітыкі ў служэнні сваім гуманістычным мэтам і задачам.

І. Навуменка таксама закранае праблему станоўчага і адмоўнага ў раскрыцці характару героя, заўважаючы, што сапраўды тут нельга быць аднабаковым. Мелехаў з «Ціхага Дона» — былы белагвардзеец, але як праўдзіва здолеў М. Шолахаў зазірнуць у душу гэтага чалавека, спасцігнуць усю яго сутнасць, няпросты ўнутраны свет. Увогуле, пры напісанні твораў аб вайне, гаворыць прамоўца, мы шмат чаму павінны вучыцца адзін у аднаго. І. Навуменка прыгадвае, што на пачатку сваёй творчай дарогі вучыўся ў югаслаўскіх пісьменнікаў, як адлюстроўваць барацьбу з фашызмам. Шмат дапамаглі і кнігі вядомых аўтараў, і югаслаўскія ваенныя фільмы. Нельга забываць, што сама барацьба — гэта адно, а мастацтва — другое. Выдзеліць героя з масы — задача для літаратуры далёка няпростая. Прамоўца дзеліцца ўражаннямі ад наведвання Югаславіі, расказвае аб тым, што робіцца ў беларускім літаратуразнаўстве па вывучэнні братніх літаратур. У прыватнасці, у наступным годзе ў выдавецтве «Навука і тэхніка» выходзіць кніга Г. Тварановіч «Маральны свет героя. Беларуская і югаслаўская ваенная проза 60—70-х гадоў».

Сорак гадоў мы жывём у міры, а гаворым і пішам аб вайне, пачынае сваё выступленне **І. Чыгрынаў**. Не можам не гаварыць, не пісаць, бо за гэты час па падліках вучоных было толькі 26 дзён, калі ў ніводным кутку планеты не адбываліся войны. Часам нават пачынаеш думаць, а ці не бяссільныя мы, пісьменнікі, у спыненні вайны? Вядома, перабольшваць аналітычнае значэнне літаратуры, магчыма, і не трэба, але пакуль звон будзе званіць, людзі будуць адчуваць, што не ўсё яшчэ спакойна на планеце. Грамадская свядомасць будзе абуджацца, шукаць выйсця з таго трывожнага становішча, якое склалася ў свеце.

Адзначаючы плённасць пісьменнікаў — і беларускіх і славенскіх — у адлюстраванні вайны, прамоўца выказвае сваю думку і адносна таго, ці з'явіцца калі-небудзь кніга, падобная раману «Вайна і мір» Л. Талстога. Не трэба забываць, зазначае І. Чыгрынаў, што зусім іншая была цяпер вайна. Мастацкі летапіс яе, своеасаблівая «Вайна і мір» ствараюцца намаганнямі многіх пісьменнікаў, у тым ліку і югаслаўскіх, якія пісалі ўжо аб вайне, а таксама тых, хто возьмецца за гэтую ўдзячную справу.

Мы яшчэ не сказалі ўсёй праўды аб мінулай вайне, падкрэслівае прамоўца. Усё новыя і новыя пакаленні будуць звяртацца да гэтай вечнай тэмы, імкнучыся сказаць сваё слова. На тое некалькі прычын. Вопыт мінулага — своеасаблівая навука на будучае. Адлюстроўваючы ўчарашнія падзеі, літаратура адначасова вырашае і сучасныя задачы. Для беларускай жа літаратуры, зазначае І. Чыгрынаў, неўміручасць гэтай тэмы яшчэ і ў тым, што пасля другой сусветнай вайны ўвесь свет даведаўся, хто ж мы, беларусы, як народ.

Тоне Партліч і **Н. Гілевіч**, выступаючы ў падагульненне гаворкі, адзначаюць, што плённасць гэтай сустрэчы за «круглым сталом» відавочная. Няхай не ўсе аспекты пытання закрануты, няхай не заўсёды ўдалося выйсці на канкрэтныя творы ў дзвюх братніх літаратурах — прычына таму тое, што ўзаемныя кантакты і ўзаемавывучэнне адзін аднаго толькі пачынаюцца, але важна, што і славенскія, і беларускія пісьменнікі разумеюць: сёння, калі пагроза тэрмаядзернай вайны яшчэ не знікла, агульнымі намаганнямі трэба змагацца за мір, ствараючы высокаідэйныя, высокамастацкія творы, якія б праўдзіва адлюстроўвалі падзеі мінулай вайны, выкрывалі фашызм, сцвярджалі гуманізм.

А. МАРЦІНОВІЧ.

І ДЗЕЦЯМ, І ДАРОСЛЫМ

Вясёлы і таварыскі, як дваровы сабачка, Лісец — казёл з Вішні Горы. Капрызліва-цнатлівая Капусная Галава. Сонейка, якое хавалася за хмару, бо яму... абрыдла штодня асвятляць і сагграваць кожную кучку гразі. Стары пажадлівы Слімак, перад якім схіляліся «бацькі горада». Каларытны натоўп абывацеляў, якія знайшлі, нарэшце, «козла отпущения», учынілі суд над бедным Лісецам і пацягнулі яго на шыбеніцу... Такія вось персанажы дзейнічалі ў прытчы пра казла з Вішні Горы, які аднойчы толькі глянуў на качан капусты.

Па матывах гэтай славенскай прытчы напісаны арыгінальны твор Святланы Макаравіч, які паставіў на сцэне Люблянскага тэатра лялек рэжысёр Міран Герцаг. Спектакль быў паказаны ў Францыі, Італіі, Кітаі, Бразіліі. Цяпер яго паглядзелі і мінчане.

Дарэчы, у гэтыя дні тэатр з Любляны ўпершыню выступаў у Савецкім Саюзе. І нашым гледачам было цікава пазнаёміцца з мастацтвам славенскіх артыстаў-лялечнікаў. Традыцыі яго параўнальна маладыя: тэатр быў створаны ў 1948 годзе. Праўда, у гады другой сусветнай вайны Славенія мела партызанскі тэатр лялек — адзіны ў Еўропе. Гэты адметны факт паведаміў нашым гледачам дырэктар люблянскай трупы Ігнацій Шуніч, які выступіў перад пачаткам першага прадстаўлення ў Мінску.

«Мова нашага спектакля не мае патрэбы ў перакладзе, — дадаў ён. — Бо гэта мова сатыры і гумару». І сапраўды, хоць зала Дзяржаўнага тэатра лялек БССР была на гэты час забяспечана апаратурай для трансляцыі перакладу, красамоўней за словы падавалася сама пластыка відовішча: вынаходлівая, часам па-лубачнаму грубаватая, зразумелая і дарослым, і дзецям. Для далейшага культурнага супрацоўніцтва Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі і Беларусі важна, што госці з Люблянскага тэатра лялек мелі дзелавыя сустрэчы і творчыя гутаркі з беларускімі калегамі.

Сцэна са спектакля Люблянскага тэатра лялек.

С. ВЕТКА.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

Госці выказваюць словы ўдзячнасці акцёрам.

З кожным годам пашыраюцца шэфскія сувязі тэатральных калектываў рэспублікі з працаўнікамі вёскі. Даўнія традыцыі шэфства і ў купалаўцаў. А цяпер набірае жыццё яшчэ адна форма ўзаемных кантактаў. Вырашана, што перадавікі сацыялістычнага спаборніцтва асобных раёнаў, будуць прыязджаць на спектаклі, якія будуць паказвацца спецыяльна для іх.

Першымі гасцямі былі хлебаробы, жывёлаводы, механізатары Валожынскага раёна. Яны з цікавасцю паглядзелі спектакль «Характары» — адну з найбольш значных работ купалаўцаў, у якой знайшлі сцэнічнае ўвасабленне вобразы, створаныя В. Шукшыным.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Вестку аб прысуджэнні Дзяржаўнай прэміі СССР стваральнікам спектакля «Радавыя» на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы з асаблівай радасцю сустрэлі студэнты і выкладчыкі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. На тое ёсць свая прычына. Усе, удастоеныя высокай дзяржаўнай узнагароды — і драматург А. Дударэў, і рэжысёр В. Раеўскі, і мастак Б. Герлаван, і выканаўцы роляў А. Дзянісаў, В. Манаеў, В. Філатаў,— выпускнікі гэтай вышэйшай навучальнай установы.

І вось сустрэча-віншаванне ў сценах альма-матэр, якую вёў рэктар інстытута, доктар мастацтвазнаўства, прафесар А. Сабалеўскі. На шматлікія пытанні прысутных адказалі А. Дударэў, В. Раеўскі, А. Дзянісаў і В. Манаеў. Адбыўся своеасаблівы дыялог лаўрэатаў і студэнтаў, які закрануў розныя аспекты сцэнічнага жыцця рэспублікі.

Тэкст і фота Ул. КРУКА.

Сустрэчу вядзе А. Сабалеўскі.

Дні культуры Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі ў Беларускай ССР

АГУЛЬНАСЦЬ ЛЁСАЎ ПАЯДНАЛА

Літаратурны вечар адкрывае Ніл Гілевіч.

У суботу вечарам прасторную залу Дома літаратара запоўнілі пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскасці Мінска, шматлікія чытачы. І тыя, хто ўжо знаёмы з творчасцю славенскіх аўтараў, і тыя, каго на гэты вечар, гэтаксама як і на іншыя мерапрыемствы, запрасілі маляўнічыя афішы Дзён. Да прысутных звяртаецца першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР **Н. Гілевіч.** На нашай зямлі, гаворыць ён, сапраўднае свята, якое прынеслі добрыя сябры са Славеніі. Я маю на ўвазе Дні культуры Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі ў Беларускай ССР, якія дазваляюць пазнаёміцца з літаратурай і мастацтвам самабытнага краю, адчуць душу народа, кроўнага і блізкага нам.

Ніл Гілевіч згадвае асобныя факты з багатай гісторыі шматпакутнай славенскай зямлі, што перажыла тысячу дзвесце гадоў няволі, але не скарылася захопнікам. Дванаццаць стагоддзяў ворагі-чужаземцы, пануючы ў сферах палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця, насаджалі ў гэтым краі сваю культуру і мову і не змаглі духоўна зламаць, абяскровіць гэтае гордае, свабодалюбівае славянскае племя!

Гэткім жа мужным быў славенскі народ і ў гады другой сусветнай вайны, калі змагаўся з фашызмам, верачы ў перамогу, бачачы ў Савецкім Саюзе і сілу, і надзею. Н. Гілевіч прыводзіць вытрымку з адозвы ЦК Кампартыі Славеніі, надрукаваную ў Любляне 22 чэрвеня 1941 года: «Славенцы... Рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя, увесь працоўны народ Славеніі! Гітлераўская злачынная зграя хоча знішчыць краіну пралетарскай рэвалюцыі і сацыялізм, каб гэтым самым зламаць і міжнародны пралетарыят... Хоча знішчыць СССР, каб заняволіць сялян усіх народаў... Напад гэтай зграі на СССР — гэта варварскі напад на культуру ўсяго чалавецтва!.. Рабочыя! Сяляне! Славенцы! Камуністы! Камуністычная партыя Славеніі заклікае вас згуртаваць свае рады ў адзіны вызваленчы фронт супраць імперыялістычных акупантаў!.. Наша дасённяшняе супраціўленне няхай перарасце ва ўсенародную свяшчэнную вайну!».

Гэтая адозва, нагадвае Н. Гілевіч, заканчвалася так: «Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — вялікая надзея і абарона заняволеных народаў і ўсіх прыгнечаных! Смерць фашысцкім злачынцам!». Прамоўца падкрэслівае, што з першых жа дзён акупацыі ў шарэнгі барацьбітоў сталі і славенскія пісьменнікі. У Любляне, заўважае Н. Гілевіч, якая, дарэчы, з'яўляецца першым у Югаславіі горадам, удастоеным звання героя, у славутай універсітэцкай бібліятэцы мне паказалі зборнікі вершаў антыфашысцкай славенскай паэзіі часоў акупацыі — зборнікі, выдадзеныя ў падполлі, у тым ліку кнігу выдатнейшага паэта М. Бора «Перавіхурым віхуру» з прысвячэннем на вокладцы: «Таварышам-партызанам, паўшым за свабоду». Там жа бачыў я і газету ЦК Кампартыі Славеніі «Дело» — нумар ад трэцяга верасня 1941 года, у якім на першай старонцы змешчаны верш-заклік вялікага песняра Славеніі О. Жупанчыча «Абавязак свой ведаеш, паэт?». Жупанчычу ўжо тады было больш як шэсцьдзесят, але ён, як і нашы Купала і Колас, не мог сядзець у зацішку.

Наогул, засяроджвае прамоўца ўвагу прысутных, у барацьбе супраць фашызму ўдзельнічалі сотні і тысячы дзеячаў літаратуры і мастацтва Славеніі. У антыфашысцкім падполлі ці ў радах Народна-вызваленчай арміі знаходзіліся: паэты О. Жупанчыч, Э. Коцбек, М. Клопчыч, М. Бор, Е. Удовіч, Б. Водушак, Т. Селішкар, Б. Фатур, Ц. Выпатнік, Ф. Космач, П. Левец, Л. Кракар, Ц. Злобец, празаікі, драматургі, крытыкі — П. Уоранц, Е. Відмар, Ф. Штурм, Ю. Козак, Ц. Космач, Б. Крэфт, М. Кранец, І. Потрыч... Смерцю храбрых загінулі такія выдатныя паэты, як М. Ярц, К. Дастоўнік-Каюх, Ф. Козар, празаік і драматург Т. Чуфар, крытык І. Брнчыч і многія, многія іншыя. Думаю, зазначае Н. Гілевіч, што лепшыя традыцыі сучаснай славенскай літаратуры ідуць не толькі ад вялікіх паэтаў і пісьменнікаў-класікаў, але адтуль, ад тых песень нянавісці і любові, песень барацьбы, з якімі ў гады другой сусветнай вайны змагаліся супраць фашысцкіх акупантаў байцы Народна-вызваленчай арміі. Адтуль і вера сучасных паэтаў, празаікаў, дзеячаў мастацтва Славеніі ў свой народ, у яго непераможную жыццястойкасць, у яго творчыя сілы, у яго вялікую сацыялістычную будучыню. Адсюль жаданне мацаваць дружбу з народамі нашай краіны, развіваць творчыя кантакты з творчай інтэлігенцыяй Саюза ССР, жаданне, на якое мы адказваем братарскім узаемаразуменнем і ўзаемнасцю.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР **І. Чыгрынаў** дае слова старшыні рэспубліканскага камітэта па культуры, члену Выканаўчага веча Скупшчыны Сацыялістычнай Рэспублікі Славеніі, члену ЦК Кампартыі Славеніі, доктару **М. Кмецлу,** які знаёміць прысутных з Указам Прэзідыума СФРЮ аб узнагароджанні за заслугі ў галіне перакладу і папулярызацыі твораў славенскай і іншых югаслаўскіх літаратур, а таксама за вялікі ўклад у развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж СФРЮ і Савецкім Саюзам даўняга прапагандыста і перакладчыка славенскай літаратуры на беларускую мову Н. Гілевіча ордэнам Югаслаўскай зоркі са стужкай і ўручае яму высокую ўзнагароду.

Н. Гілевіч шчыра дзякуе за ўзнагароду і выказвае ўпэўненасць, што дружба паміж беларускім і славенскім народамі, творчыя кантакты і ўзаемасувязі будуць і ў далейшым плённа развівацца і мацавацца.

Вершы, урыўкі з празаічных твораў госці чытаюць на сваёй роднай мове, але прысутныя добра разумеюць, што гавораць Т. Паўчэк, Т. Партліч, У. Каўчыч, Ф. Вурнік. Паасобныя творы іх гучаць і ў перакладзе беларускіх паэтаў, а яшчэ А. Грачанікаў, Я. Сіпакоў, Г. Бураўкін знаёмяць са сваімі вершамі, прысвечанымі і Славеніі, і ўсёй Югаславіі.

Шэраг твораў славенскіх паэтаў — Ф. Прэшэрна, О. Жупанчыча, І. Грудзена, Я. Менарта, К. Дзястоўніка-Каюха — у сваім перакладзе чытае Н. Гілевіч. Сярод іх і славуты верш О. Жупанчыча «Абавязак свой ведаеш, паэт?», што стаў заклікам да змагання ў грозным сорак першым годзе:

Абавязак свой
ведаеш, паэт?
Дзе ж твой голас-звон?
Песню кінь у свет!

Працягам верша стаў вялікі канцэрт — сапраўдная песня дружбы, супрацоўніцтва паміж двума народамі-братамі.

У вечары прынялі ўдзел загадчык аддзела культуры ЦК КПБ І. І. Антановіч і саветнік па культуры і друку пасольства Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславія ў Маскве К. Сератліч.

А. ВІШНЕЎСКІ.

АД СЭРЦА ДА СЭРЦА

Выступае Люблянскі актэт.

Сваё майстэрства дорыць духавы квінтэт.

Фота Ул. КРУКА.

Любое свята не можа абысціся без выступленняў музыкальных калектываў. Дні славенскай культуры ў гэтым сэнсе не толькі не выключэнне, а, наадварот, найлепшае пацвярджэнне таму, наколькі славенцы любяць музыку. І класічную, і народную, і эстрадную. На беларускую зямлю прыехалі шэраг ансамбляў, знакамітыя выканаўцы, майстэрства якіх добра вядома не толькі ў Югаславіі, але і далёка за межамі краіны. Паасобныя з іх прымалі ўдзел у канцэрце, што адбыўся пад час урачыстага адкрыцця Дзён, а таксама на заключным канцэрце, які праходзіў у аўторак. А ўвогуле, канцэртнай пляцоўкай для нашых гасцей стала ўся рэспубліка.

Аматары класічнай музыкі Мінска і госці сталіцы рэспублікі не пашкадавалі, калі прыйшлі ў філармонію на аўтарскі вечар прафесара Люблянскай музычнай акадэміі, лаўрэата міжнародных конкурсаў піяністкі Д. Томшыч-Срэбатняк. Выпускніца акадэміі, у якой цяпер працуе, Д. Томшыч-Срэбатняк удасканальвала сваё майстэрства ў Нью-Йорку. Ёй прысвоена Калумбійскім універсітэтам званне бакалаўра навук.

Некалькі канцэртаў даў Люблянскі актэт, у тым ліку выступіў перад рабочымі, служачымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі Мінскага вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі, выязджаў да працаўнікоў Гродзеншчыны. Гэты самабытны калектыў, які вызначае дасканалая тэхніка выканання, высокі мастацкі густ у адборы твораў для рэпертуару — патрэбна адзначыць, што асаблівую непаўторнасць яму надаюць вакальныя творы сучасных кампазітараў, якія беражліва памнажаюць і захоўваюць народныя традыцыі — узнік на базе Акадэмічнага хору імя Тоне Томшыча як студэнцкі ансамбль. Стаўшы прафесіянальным, актэт ператварыўся ў адзін з лепшых выканаўцаў вакальнай музыкі ў Югаславіі. Мастацкім кіраўніком калектыву з'яўляецца піяніст і дырыжор І. Швара.

У канцэртнай зале Сафійскага сабора ў Полацку выступіў Славенскі духавы квінтэт. Аматары музыкі старажытнага горада мелі ўжо магчымасць сустракаць у сябе шмат якія праслаўленыя калектывы, але і на гэты раз мелі сапраўднае задавальненне, сустрэўшыся з выканаўцамі, якія па-майстэрску перадаюць своеасаблівасць кожнага твора.

У мінскім жа Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў імя Ільіча аматараў эстраднай музыкі сабраў папулярны ансамбль «Шок», а таксама вядомая эстрадная спявачка М. Мочнік. Праграму вызначала жанравая разнастайнасць, дынамічнасць, віртуознасць выканаўцаў.

І, вядома ж, нельга не сказаць пра фальклорную групу «Каляда», якая так беражліва ставіцца да народнай спадчыны, імкнецца збіраць і прапагандаваць лепшыя ўзоры фальклорнай творчасці, спалучаючы нумары рознай тэматычнай і сюжэтнай скіраванасці, дасягаючы адзінства танцавальна-песенных элементаў і пастановачных, дзякуючы чаму ствараецца сапраўдны спектакль, які прымушае здзіўляцца таленту народа, што праз гады пранёс любоў да прыгожага. «Каляда», як і беларускія прафесійныя і самадзейныя калектывы, што будуюць сваю праграму на фальклорных творах ці на сучасных, якія маюць у сабе элементы народнай творчасці, уносіць у выкананне іх і сваё, непаўторнае, што дазваляе гаварыць аб самабытнасці калектыву.

М. РАМАНЕНКА.

Для ўсіх-значыць для кожнага...

Расказ генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ», дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, заслужанага машынабудаўніка рэспублікі М. Ф. ЛАЎРЫНОВІЧА з каментарыем

«...Наўрад ці трэба сёння каму-небудзь тлумачыць, што меў на ўвазе Канстанцін Сяргеевіч Станіслаўскі, калі зазначыў: тэатр пачынаецца з вешалкі. У словах гэтых закладзены высокі сэнс: чалавек ідзе ў храм мастацтва на сустрэчу з той чароўнай таямніцай, якая надае ягонаму жыццю новы імпульс, новы душэўны ўсплёск. І трэба, каб настрой гэты суправаджаў яго з першай да апошняй хвіліны, каб нішто, ніякая дробязь, не азмрочыла яму вечар...

Прабачце, але пры чым тут завод? — запытае мяне сёй-той. Якое дачыненне мае той тэатр да вытворчасці? Вельмі проста магу адказаць: таму, што «настрой на працу» рабочага пачынаецца таксама не ў самім цэху, не ля станка, а раней, тады яшчэ, калі ён пераступае парог прахадной...»

Я адразу зразумела, што меў на ўвазе генеральны, калі пабыла ў корпусе інструментальна-штампавай вытворчасці, куды мы прыйшлі разам з намеснікам старшыні прафкома аб'яднання Тамарай Паўлаўнай Кірэевай. Дарэчы, гэта менавіта той корпус, з якога ў 1944 годзе пачынаў сваю працоўную біяграфію Мінскі аўтамабільны завод.

Да канца змены было яшчэ далёка. Мы пазванілі ў дзверы мужчынскай гардэробнай, якія адчыніла дзяжурная. Прасторнае памяшканне з прыемным мяккім святлом у некалькі соцень квадратных метраў. Шафаў з замкамі, звычайных атрыбутаў прадпрыемства, якія мне не раз даводзілася бачыць, тут не было. Вопратку рабочыя здаюць у гардэроб, атрымліваюць там жа спецадзенне. Наогул, тут усё радуе вока. Інтэр'ер аздоблены дрэвам светлага тону, шмат люстраў, арыгінальных свяцільнікаў, у невялікіх холах — кутках адпачынку — кветкі, сучасная зручная мяккая мэбля, якую, дарэчы, па арыгінальных эскізах зрабілі тут жа, на заводзе. А шматлікія душавыя з блакітнай кафлі, а цудоўная саўна! Паўсюль чыста, цёпла, утульна.

— Такія гардэробныя неўзабаве будуць працаваць ва ўсіх цэхах завода, цяпер ідзе рэканструкцыя старых, — тлумачыць не без гонару Тамара Паўлаўна, і дадае: — У гэтай справе мы — піянеры сярод прадпрыемстваў...

Здаецца, натуральным для генеральнага дырэктара такога магутнага аб'яднання, куды ўваходзіць восем буйных заводаў (прытым на адным МАЗе працуюць дзесяткі тысяч чалавек), было гаварыць толькі пра надзённы вытворчы клопат — план, якасць, графік. Але Міхаіл Фёдаравіч з такой жа зацікаўленасцю гаварыў, напрыклад, пра эстэтыку, зручнасць рабочага адзення.

«...Так, я лічу, што сённяшні рабочы чалавек павінен стаяць ля станка ў чыстай і зручнай спецоўцы. Бо гэта таксама ўваходзіць у паняцце культуры вытворчасці. Паверыце, былі выпадкі, калі брудна, неахайна апранутага рабочага не дапускалі да працы... На тэрыторыі завода мы адкрылі, дарэчы, адзіны ў рэспубліцы, салон-магазін спецвопраткі. Рабочы можа тут падабраць па густу камбінезон, робу, іншае адзенне, у якім яму будзе зручна працаваць. Салон-магазін з'явіўся не так даўно — каля трох месяцаў назад. Таму сёе-тое трэба яшчэ дарабляць.

І яшчэ. Мы параіліся з людзьмі і вырашылі адкрыць у будучым годзе сваю заводскую пральню самаабслугоўвання на чатыры з паловай тысячы абанементаў. Гэта будзе вялікай падмогай нашым жанчынам. Нагадаю, што хатнія клопаты сёння «паглынаюць» у жанчын, якія працуюць, — ва ўсякім разе так сведчыць статыстыка, — да трыццаці гадзін у тыдзень. А гэта, натуральна, замінае іх духоўнаму і культурнаму росту, удзелу ў грамадскім жыцці. Максімальна разгрузіць жанчыну ад гэтых клопатаў — абавязак не толькі ўсяго грамадства, але і кожнага канкрэтнага прадпрыемства... Словам, нашу «службу вольнага часу», мы так яе называем, будзем удасканальваць».

Служба вольнага часу... Трохі гучыць дзіўна. Але на заводзе гэтыя словы сталі зусім звыклымі. Што ўваходзіць у службу? Не здзіўляйцеся, я ў першую чаргу назвала б камбінат харчавання.

Так, ніхто, відаць, дакладна не скажа, як на выкананне працоўнай нормы ўплывае смачны абед. Не ўсміхайцеся. На пусты страўнік работы не будзе...

Дык вось, заводскі камбінат паспявае накарміць адначасова дзве тысячы рабочых. І накарміць няблага, сама пакаштавала.

Відаць, я зрабіла б памылку, калі б не ўспомніла пра спецыяльную аўтаматызаваную лінію «Рытм» у сталовай корпуса інструментальна-штампавай вытворчасці: па стужцы канвеера рухаюцца падносы з комплекснымі абедамі (дарэчы, у гарнірах шмат рознай агародніны — зялёнай цыбулі, агуркоў, памідораў і г. д., усё гэта вырашчана ў заводскіх цяпліцах, якія знаходзяцца тут жа, на тэрыторыі МАЗа). Асартымент багаты, нават узбітая смятанка ёсць у ім. Здаецца, усяго хапае.

Але генеральны дырэктар між іншым расказваў мне, што прадстаўнікі аўтазавода ездзілі па вопыт на рыжскі «ВЭФ», дзе на адзіным у краіне такога роду камбінаце харчавання ўвасоблены навейшыя дасягненні тэхнікі, аўтаматыкі, электронікі. Міхаіл Фёдаравіч дадаў: «Будзем рабіць і ў сябе такі, вядома, з пэўнымі карэктывамі. Сябры з Латвіі абяцалі дапамагчы».

Здаецца, я не сказала, што рабочыя спраўляюцца з абедам за 7—8 мінут. Застаецца яшчэ недзе паўгадзіны перапынку. У той дзень, калі там была я, менавіта ў перапынак завадчане яшчэ паспелі паслухаць канцэрт сімфанічнай музыкі ў выкананні Акадэмічнага сімфанічнага аркестра Ленінградскай дзяржаўнай філармоніі імя Д. Шастаковіча, які ўдзельнічаў у «Беларускай музычнай восені».

Коратка пра частку камбіната харчавання — магазін кулінарыі. Не буду нагадваць пра тое, што тут прадаецца, скажу толькі, што мазаўцам пашэнцавала: за некалькі хвілін яны купляюць для дома ўсё — ад свежай выпечкі да мясных і рыбных паўфабрыкатаў.

І праўда, час на Мінскім аўтамабільным эканоміць умеюць.

«...Завод — чалавеку, чалавек — заводу. Вось той магутны фактар, які вызначае канчатковы вынік нашай агульнай працы — стварэнне надзейных «МАЗаў». З галоўнага канвеера прадпрыемства нашы машыны і аўтапаязды ідуць у пяцьдзесят дзве краіны свету. Усё гэта вымагае галоўнага — культуры вытворчасці. Яна складаецца, як я ўжо гаварыў, з многіх кампанентаў. Не на апошнім месцы і клопат пра вольны час самога рабочага — стварэнне ўмоў для адпачынку, умацавання здароўя, творчага развіцця асобы. Здаецца, для арганізацыі здаровага і цікавага адпачынку на заводзе зроблена нямала. Ёсць у нас Палац культуры і тэхнікі, спартыўны клуб і басейн, тэнісныя корты і стадыён, клуб юнага тэхніка і турыстычны лагер «Юнацтва».

На заводзе шмат моладзі, і мы ўлічваем гэта, выдаткоўваючы значную частку грамадскіх фондаў на развіццё культуры і спорту. У верасні гэтага года прэзідыум прафкома зацвердзіў палажэнне аб спартыўна-культурным комплексе. Прайшлі дні адпачынку аўтазаводцаў і іх сем'яў, розныя спартыўныя святы.

І яшчэ пра адно. Барацьбу з п'янствам. Што і казаць, сярод пэўнай часткі рабочых гэтая загана была даволі распаўсюджанай. Асабліва сярод моладзі, што жыве ў інтэрнатах. Вядома, складана пракантраляваць дзевяць інтэрнатаў, дзе жыве амаль чатыры тысячы чалавек, аднак, цяпер арганізоўваем пастаянныя рэйды-праверкі, і калі знаходзім апівоху, дык прымаем да яго жорсткія меры: пераносім чаргу на кватэру, пазбаўляем прэмій, выключаем нават з членаў прафсаюза. Мы вядзём дзейсную антыалкагольную прапаганду. У адным з нашых інтэрнатаў працуе клуб цвярозасці, да канца года мяркуем стварыць такія клубы ва ўсіх мужчынскіх інтэрнатах. Гэтае пачынанне ўжо дало свой плён.

Я вось пра што яшчэ часта думаю. Ветэраны завода — яго «гвардыя», чыімі рукамі створана ягоная слава, традыцыі, сёння — людзі пенсійнага ўзросту. Неўзабаве на іх месца прыйдуць маладыя рабочыя. Але працоўная слава ў спадчыну не перадаецца — яе трэба заваёўваць самім.

Выхаванне заўтрашняй працоўнай змены павінна пачынацца намнога раней, чым юнак або дзяўчына стане да станка. І вось тут немалаважная, на маю думку, роля нашага Палаца культуры. Хоць мне здаецца, што яшчэ зашмат у ім так званых «парадных» мерапрыемстваў. Але разам з тым Палац робіць нямала. Вы ведаеце, ён называецца Палацам культуры і тэхнікі. Гэтае спалучэнне вельмі знамянальнае ў век тэхнічнага прагрэсу. Толькі трэба, мне здаецца, не абмяжоўвацца дасягнутым, а павярнуць работу некаторых тэхнічных гурткоў на праблемы, блізкія вытворчасці. Менавіта такім асяродкам творчай думкі хацелася б бачыць у будучым і наш Дом юнага тэхніка, у якім створана і працуе дваццаць гурткоў тэхнічнай творчасці. Трэба, каб будучая наша змена не толькі добра валодала сакрэтамі мадэліравання, уяўляла сабе не толькі прыгажосць і рамантыку працы, але і складанасці вытворчасці, патрабаванні, якія прад'яўляе да маладога чалавека яе спецыфіка. Словам, і нашым культасветработнікам ёсць над чым падумаць, хоць увогуле, паўтараю, дзейнасць Палаца культуры і тэхнікі нашага завода разнастайная і плённая...»

Клопатам пра завод, пра яго людзей прасякнута кожнае слова генеральнага дырэктара. У свой час ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб рабоце партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый, адміністрацыі Мінскага аўтазавода вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ» па выкананні Закона СССР «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі». Я пацікавілася, што ўжо зроблена? Дарэчы, дваццаць шэсць канкрэтных пунктаў у плане прысвечаны паляпшэнню ўмоў працы, быту і адпачынку аўтазаводцаў. Тут і будаўніцтва пакояў эмацыянальнай разгрузкі, і адкрыццё на прахадной завода комплекснага прыёмнага пункта па рамонце абутку, раскрою тканіны, хімчыстцы, і арганізацыя продажу агародніны і кветак з падсобнай сельскай гаспадаркі. Тут і будаўніцтва Дома культуры, бібліятэкі ў той жа падсобнай гаспадарцы ў Бярэзінскім раёне, пансіянат на возеры Нарач, базы сямейнага адпачынку «Сонечная паляна» на рацэ Бярэзіна. Наогул, трэба сказаць, у час адпачынку аўтазаводцам ёсць куды паехаць. У пасёлку Сходніца Львоўскай вобласці пабудаваны метадам каапераванння сродкаў пансіянат «Карпаты», дзе лечацца завадчане з захворваннем страўніка, печані. Такім жа спосабам узведзены спальныя корпусы на беразе Чорнага мора ў Алушце і ў пансіянаце «Місхор». Ды і летам з сем'ямі адпачываць — таксама праблемы бадай няма: працуе база сямейнага адпачынку і яшчэ будуюцца. А цяпер клопат завода — пра дзяцей: ідзе рэканструкцыя піянерскага лагера «Зубраня», што ў Волме. «Хочацца, каб ён быў, як казка», — сказалі мне ў прафкоме...

Менавіта гэтым надзённым пытанням — развіццю на вытворчасці культуры, масавай аздараўленчай работы, спорту, базавых месц адпачынку — і было прысвечана адно з апошніх пашыраных пасяджэнняў парткома вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ».

Тое, што чытач даведаўся з расказа генеральнага дырэктара і каментарыяў аўтара, вядома, далёка не вычэрпвае таго, што робіцца на заводзе, каб зрабіць жыццё гэтага працоўнага калектыву больш змястоўным, разнастайным, актыўным. Не сказана было пра будаўніцтва шматпавярховых дамоў для аўтазаводцаў (толькі ў канцы года ў іх атрымаюць кватэры 1400 сем'яў), якія, без перабольшання, упрыгожваюць некалькі раёнаў сталіцы рэспублікі, пра дзіцячае кафэ «Космас», што ў Чыжоўцы, якое ўражвае фантазіяй мастакоўскай думкі і якое так любяць маленькія аўтазавадчане, пра заасад і заводскую падсобную гаспадарку, пра ўзвядзенне ў 12 пяцігодцы чатырох новых, дзіцячых камбінатаў...

І хацелася тут у заканчэнне ўспомніць, мне здаецца, вельмі трапны выраз, які я пачула з вуснаў Міхаіла Фёдаравіча Лаўрыновіча: «Завод—чалавеку, чалавек — заводу». Вось яна — увага да чалавечага фактара.

Колерамузычны фантан каля Палаца культуры і тэхнікі Мінскага аўтамабільнага завода.

Запісала і пракаменціравала Л. КРУШЫНСКАЯ.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

ЧАС ТВОРЧЫХ ПОШУКАЎ І ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

Неўзабаве ў Каралішчавічах адбудзецца чарговы семінар маладых пісьменнікаў. Напярэдадні гэтага свята маладой літаратуры наш карэспандэнт задаў некалькі пытанняў вядомаму паэту, галоўнаму рэдактару часопіса «Маладосць» Анатолю Грачанікаву.

— Анатоль Сямёнавіч, хацелася б пачуць вашу думку пра найбольш цікавыя здабыткі маладой беларускай літаратуры.

— Пра найбольш цікавыя здабыткі нашых маладых літаратараў, калі мець на ўвазе пачаткоўцаў, яшчэ не членаў Саюза пісьменнікаў, гаварыць яшчэ рана. А вось выявіць тэндэнцыі развіцця маладой беларускай літаратуры за апошнія гады ўжо можна. Тым больш, што за гэты перыяд у часопісах «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», «Неман», газеце «Літаратура і мастацтва» выступіла шмат маладых са сваімі першымі і новымі публікацыямі.

Адразу ж адзначу «рэгіянальную» нераўнамернасць прыходу маладых у літаратуру. Ва ўсіх нас на памяці прыкметнае ажыўленне літаратурнага руху на Віцебшчыне, нядаўна прэзідыум Саюза пісьменнікаў прыняў у члены саюза цэлую групу маладых з Брэстчыны, актыўна заяўляюць пра сябе гродзенскія літаратары. Няма пакуль што прыкметнага прытоку маладых з Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

Вядома, у літаратурнай справе не можа быць так званай ураўнілаўкі, але і гэты працэс выклікае пэўную заклапочанасць у тых, хто працуе з маладымі, сочыць за іх творчым ростам, спрыяе іх творчаму станаўленню.

У нашай рэспубліцы, у Саюзе пісьменнікаў, у рэдакцыях газет і часопісаў склалася пэўная сістэма работы з пачаткоўцамі. І яна прыносіць ужо добры плён. Заўважаецца, як правіла, кожнае новае імя, з дэбютантамі працуюць кваліфікаваныя рэдактары, іх творчасць аналізуюць вядомыя пісьменнікі і крытыкі, іх новыя творы абмяркоўваюцца на секцыях па жанрах літаратуры, на камісіі па рабоце з маладымі, якую ўзначальвае Янка Сіпакоў.

Своечасова былі заўважаны і падтрыманы маладыя празаікі А. Наварыч, У. Арлоў, І. Жарнасек, М. Барэйша, М. Філіповіч, А. Казлоў, І. Казлова, драматург А. Асташонак, паэты П. Шруб, Т. Зіненка, В. Шлыкаў, Л. Дзікавіцкая, А. Сыч, С. Адамовіч, крытыкі Г. Пойманава, В. Стральцова, У. Зінкавец.

Лаўрэатамі «Маладосці» гэтага года за лепшыя публікацыі сталі празаікі Віктар Супрунчук і Іна Казлова, паэт Павел Шруб, крытыкі Сяргей Кавалёў і Галіна Сачанка, публіцыст Мікалай Кярнога. Сярод лаўрэатаў міжрэспубліканскага конкурсу, які часопіс «Маладосць» праводзіць сумесна з рэдакцыямі камсамольска-маладзёжных часопісаў Літвы, Латвіі і Эстоніі, нашы аўтары — Уладзімір Саламаха (першая прэмія), а таксама Васіль Ткачоў і Анатоль Ярась (трэцяя прэмія).

Што адметнага нясуць сённяшнія маладыя ў літаратуру? Хочацца адзначыць рост культуры творчасці, ранні прафесіяналізм, спробу заглыбіцца ў псіхалагічны стан сваіх герояў, жаданне выявіць матывіроўку іх дзеянняў і ўчынкаў, імкненне прасачыць уздзеянне асяроддзя, жыццёвых сітуацый, часцей за ўсё канфліктных, на гэтыя ўчынкі. Усё гэта, як кажуць, заслугоўвае ўвагі і павагі. І ў той жа час мы бачым, як нялёгка маладым пісьменнікам пісаць пра сваіх равеснікаў, і яны больш ахвотней бяруцца абмалёўваць людзей старэйшага пакалення — дзядоў, бабуль, у якіх ужо ўсталяваны характар, багаты жыццёвы вопыт, выпрацаваны лад жыцця. Вядома, малады герой увесь у руху, часам супярэчлівы, няўстойлівы, цяжка паддаецца мастацкаму аналізу, вызначаным псіхалагічным параметрам.

Але тут якраз і павінны сказаць сваё слова маладыя. Мне імпануе ў гэтым сэнсе творчасць В. Гігевіча. Ён, як ніхто з маладой кагорты, умее зазірнуць у праблемы сучасніка горада і вёскі свежым вокам, паглядзець, чым і як жыве яго герой, наколькі ён духоўна спелы і маральна багаты. Пісьменнік не баіцца рызыкі, часам наўмысна абвастрае сітуацыі, каб прыцягнуць нашу ўвагу да тых з'яў і праблем, да якіх мы нібыта прызвычаіліся ці наогул застаёмся раўнадушнымі.

Нечаканай з'явай стаў для нас раман Г. Далідовіча «Гаспадар-камень». Напісаны пра падзеі, якія прыпадаюць на час першай сусветнай вайны, гэты твор надзіва актуальны ў наш неспакойны, наэлектрызаваны ядзерны век. Тут і выбар маладымі сваёй жыццёвай дарогі, і шырокая панарама народнага жыцця, і пакутлівыя пошукі высокай ідэі служэння свайму народу, і трагічны подых сусветнай крывавай бойні. І ўсё гэта зроблена на добрым мастацкім узроўні, ярка і праўдзіва.

Нагадваю гэта, каб заахвоціць маладых да шырокага дыяпазону творчых пошукаў, да выяўлення ў сабе яшчэ неадкрытых магчымасцей.

— Традыцыі і наватарства... Як яны, на ваш погляд, выяўляюцца ў творчасці маладых?

— Гэтыя пытанні знаходзяцца пастаянна ў полі зроку нашага Саюза пісьменнікаў. Дастаткова прыгадаць даклады і выступленні на пленумах І. Чыгрынава, Б. Сачанкі, В. Зуёнка, а таксама крытычныя публікацыі ў часопісах і штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Часопіс «Маладосць» штогод аналізуе творчасць маладых на сваіх старонках. У другім нумары часопіса агляд маладой беларускай прозы-85 зробіць крытык А. Сідарэвіч. Г. Каржанеўская ў трэцім нумары часопіса 1986 года прааналізуе маладую паэзію за гэты год. Гэтыя ж пытанні закранаў і я ў сваім выступленні на адкрытым партыйным сходзе, прысвечаным тэме «Малады пісьменнік. Яго грамадзянская і творчая пазіцыя».

Зазначу толькі, што кожны, хто прыходзіць у літаратуру, бясспрэчна, праходзіць перыяд вучнёўства, пападае пад уплыў таго ці іншага вядомага пісьменніка. І ў гэтым няма нічога дрэннага. Дрэнна, калі гэты перыяд зацягваецца, калі малады пачынае «пець» з чужога голасу, баіцца самастойнасці, рызыкі, пошукаў.

Часам даводзіцца чуць, што, маўляў, пісьменнікі, якія прыйшлі ў літаратуру на пачатку 60-х гадоў, знаходзіліся ў больш спрыяльных грамадскіх умовах. Не буду аспрэчваць гэту думку. Хачу толькі падкрэсліць, што сённяшні наш дзень, наша рэчаіснасць дае вялікія падставы для ўзлёту творчай думкі. Асабліва цяпер, калі партыя, увесь савецкі народ павялі рашучую і бескампрамісную барацьбу з негатыўнымі з'явамі, з усім тым, што перашкаджае нашаму імкліваму руху наперад. Як бачым, ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ўсё часцей і часцей, не прыніжаючы ролі аўтаматызацыі, электронікі, сучасных робатаў, гаворыцца пра чалавечы фактар. А гэта якраз тое, чым жыла, жыве і будзе жыць літаратура. На маю думку, зараз склаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця творчай асобы, няхай будзе гэта малады пісьменнік, рабочы ці калгаснік. Наша грамадства выходзіць на якасна новую ступень у сваім эканамічным і сацыяльным развіцці. І перад маладымі тут неабмежаванае поле дзейнасці. Талент, у якой бы сферы жыцця ён ні праявіўся, заўсёды знойдзе разуменне і падтрымку. У тым ліку і ў літаратуры.

Нядаўна ўсе мы віталі А. Дударава з прысуджэннем яму Дзяржаўнай прэміі СССР за п'есу «Радавыя». Нешта не прыгадваецца выпадак за апошняе дзесяцігоддзе, каб пісьменнік яго ўзросту быў адзначаны такой высокай узнагародай. Гэта — яскравае сведчанне клопату нашага грамадства аб далейшым развіцці літаратуры і мастацтва.

Адказ на пытанне хочацца закончыць у вершаванай форме:

Літаратар без традыцыі,
Як салдат без амуніцыі.
Без канцэпцыі наватар,
Як на сцэне імітатар.

— У апошні час шмат гаворыцца пра шаноўны ўзрост большасці дэбютантаў, асабліва ў жанры прозы. Напэўна, гэтая з'ява хвалюе і рэдакцыю часопіса «Маладосць»?

— Так, сапраўды, нашы маладыя не спяшаюцца развітвацца з гэтым прывабным узростам. Хацеў бы вылучыць Л. Галубовіча, які аздобіў сваю маладосць свежасцю думкі і пачуцця, Х. Лялько, якая з першых апавяданняў здзівіла разважлівасцю і лірызмам. У творчым «пастарэнні» маладых вінаваты і мы, старэйшыя, бо самі часам не хочам змірыцца з шаноўным узростам, ды і сістэма прыёму ў члены Саюза пісьменнікаў, калі абавязкова трэба на стол прыёмнай камісіі пакласці асобную кніжку.

Часам здараецца так, што аповесць маладога празаіка ляжыць у рэдакцыйным партфелі 2—3 гады. Дапрацаваўшы яе, улічыўшы заўвагі супрацоўнікаў рэдакцыі, пісьменнік гэты як бы замірае, нічога новага не піша, пакутліва чакаючы публікацыі. Пасля гэты твор столькі ж праляжыць у выдавецтве ў чаканні сваёй чаргі. А час ідзе. Глядзіш, малады ўжо і сямейкай аброс, а ў маладых застаўся. Гэта нядобра. Трэба падумаць, як паскорыць працэс выдання першых кніг маладых пісьменнікаў.

— Колькі год чуюцца нараканні пра малы аб'ём часопіса «Маладосць». Што робіцца для таго, каб шырэй і аператыўней прадстаўляць чытачу маладых літаратараў?

— Шчыра кажучы, аб'ём часопіса «Маладосць» не такі ўжо малы. Украінскі «Дніпро» прыблізна такога ж памеру. Справа ў іншым. Сучасны літаратурны працэс у нашай рэспубліцы, як і ў іншых рэспубліках нашай шматнацыянальнай краіны, набыў такія памеры, што нам абавязкова давядзецца ставіць пытанне перад адпаведнымі органамі аб адкрыцці новага часопіса, такога, як «Кіеў», што пачаў выходзіць на Украіне з 1983 года. Можна выкарыстаць таксама вопыт часопіса «Молодая гвардия», пры якім створаны спецыяльны аддзел па выпуску бібліятэчкі часопіса колькасцю 54 кнігі маладых пісьменнікаў у год. У гэтай справе мы знаходзім падтрымку ў Саюзе пісьменнікаў БССР. Хацелася б, каб гэта пытанне вырашылася станоўча.

КРЫТЫКА БІБЛІЯГРАФІЯ

СЦВЯРДЖАЮЧЫ ЛЮБОЎЮ

Паэзія на старонках часопісаў «Полымя», «Беларусь», «Маладосць»

НА ПАЧАТКУ гаворкі пра вершы, змешчаныя ў кастрычніцкіх нумарах нашых часопісаў, мушу зрабіць удакладненне. Нататкі не прэтэндуюць на ўсебаковасць і паўнату крытычнага разгляду. Хоць бы таму, што «часопісная паэзія» аднаго месяца падобная на гэткі бліцздымак — яна толькі фрагмент, толькі кароткі міг жыцця. А значыць, «па-за кадрам» застаюцца многія імёны і з'явы. Але ўсё ж гэта, безумоўна, тая драбніца, без якой немагчыма ўяўленне пра цэлае, той «зрэз», без якога было б няпоўным уяўленне аб сённяшнім узроўні паэтычнай думкі.

Калі гаварыць пра перыёдыку, дык, несумненна, найбольш аўтарытэтнае беларускае паэтычнае слова ідзе да чытача са старонак трох часопісаў — «Полымя», «Беларусь» і «Маладосць». Таму размова — менавіта пра іх.

Перадусім пра тое, што найбольш уразіла.

У кастрычніцкай публікацыі «Беларусі» Генадзь Бураўкін паўстае перад чытачом у крыху абноўленым творчым абліччы. Не, ён не другі, бо змена адбылася не за кошт адмаўлення ад ранейшай сістэмы каштоўнасцей, а, так сказаць, за кошт паглыблення мастацкага і душэўнага зроку паэта. Звычайна падкрэслена публіцыстычны, тэмпераментны верш Г. Бураўкіна загучаў разважліва-мудра, часам нават да шчымлівасці спавядальна, інтымна. Грамадская думка, застаючыся як і раней пэўнай і актыўнай, узбагацілася глыбінёй і шматфарбнасцю лірычнага пачуцця і паядналася са сталасцю майстэрства.

У тым, што творчае аблічча пісьменніка з часам мяняецца, няма нічога дзіўнага. Звычайна такая змена адбываецца спакваля, часам не без страт, але навідавоку ў чытача, і тады тое якасна новае, што паступова набывае паэт, не ўражвае так, як у выпадку з Бураўкіным, які здолеў складаны працэс сацыяльна-псіхалагічнага пастаялення, які ён прайшоў разам з нашай паэзіяй, перажыць спачатку засяроджана ў асобных вершаў, калі аўтар не заўсёды па-мастацку канкрэтызуе пафас выказвання. Каб праілюстраваць гэта, згадаем хоць бы радкі з верша «Сабе і іншым» (зборнік «Выток»), у якім скрозь антытэзы і клічнікі:

Як многа ў нас звычайнасці!
Як мала ў нас адчайнасці!
Як многа ў нас прабачлівасці!
Як мала ў нас прадбачлівасці!

Бураўкін сённяшні менш за ўсё ўсклікае дзеля эмоцыі, заклікае дзеля закліку. Публіцыстыка набывае адзнаку асабістасці, прачулага лірызму, а сацыяльна-грамадзянскую дамінанту ўдала падкрэслівае аспект маральны, на якім, можа, найчасцей і спыняецца цяпер паэт.

Свет мой родны,
Свет мой мілы,
Поўны шчэбету і траў!
Колькі ты маіх памылак
Літасціва дараваў!
. . . . . .
Пасталелы,
Я іначай
На цябе гляджу цяпер...
Ці паспею я аддзячыць
За цярплівасць і давер?

Пра эвалюцыю Бураўкіна-паэта можна гаварыць і больш канкрэтна, скажам, у межах адной тэматыкі. У гэтым сэнсе цікава параўнаць вершы «Не думаючы надта пра вякі...» (публікацыя «Беларусі») і «Не рабіце з людзей багоў...» (зборнік «Выток»). У першым на поўную меру заяўлена і спеласць грамадскай думкі, і глыбіня чалавечага вопыту аўтара, і сталасць ягонага мастацкага зроку. А другі, ранейшы, сёння выглядае трохі дэкларатыўна, бо прыкметна пазбаў-

Часопісы ў снежні

«ПОЛЫМЯ»

«І скажа той, хто народзіцца першы» — заканчэнне рамана В. Адамчыка, «Электра» — апавяданне В. Супрунчука.

Змешчаны вершы С. Гаўрусёва, В. Макарэвіча, К. Камейшы, У. Скарынкіна, С. Шушкевіча, В. Шымука.

Пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС» — артыкул старшыні Дзяржаўнага камітэта БССР па працы А. М. Фаміча «Эксперымент набірае моц».

«Вытокі яго зямлі» — нарыс В. Алешкі і М. Пацёмкіна.

У раздзеле «Навука» — артыкул А. Яскевіча «Ёсць алгебра гармоніі».

«Крытыка і літаратуразнаўства» прадстаўлена артыкуламі Р. Шкрабы «Асцярожна: школа!», М. Кусянкова «Далягляды паэта», В. Дышыневіч «Скарына і адносіны да першакрыніц».

Матэрыялы А. Лапінскене «Пачатак працы», Т. Кабржыцкай і В. Рагойшы «Акрылены рэвалюцыяй», А. Мальдзіса «Англійскі дзённік» аб'яднаны ў раздзеле «Успаміны. Дзённікі. Дакументы».

З рэцэнзіямі выступаюць М. Ярош, Т. Чабан, А. Гурская, І. Шпакоўскі, С. Дубавец.

лены паэтычнага даверу да жыццёвага вопыту, а таму пафас яго не абгрунтаваны з дастатковай мерай псіхалагічнай прычыннасці. (Прынамсі, тое ж самае можна сказаць і пра верш «Жанчын прыгожых трэба берагчы...» з кастрычніцкай нізкі, які гучыць, на маю думку, неяк безасабова-інфармацыйна).

Сцвярджэнне непарыўнай сувязі грамадзянскага і чалавечага збавязку, адчуванне асабістай адказнасці перад часам — такая тэматычная і змястоўная амплітуда верша «Не думаючы надта пра вякі...» І трэба сказаць, аўтар рэалізуе сваю задуму бліскуча, звяртаючыся да сапраўды шырокіх магчымасцей свайго паэтычнага голасу: тут і сацыяльная відушчасць, і кампазіцыйная зладжанасць, і дакладная мера іроніі, нарэшце, самога мастацкага густу.

Або вось гэтыя радкі Г. Бураўкіна:

Я славы не малю,
Пашаны не вымольваю,
Люблю сваю зямлю,
Найлепшую, па-мойму.

Знаёмы матыў любові да Радзімы, увогуле традыцыйны для беларускай паэзіі. Лёгка «збіцца» на прыгожы шаблон. Але некатэгарычнасць, даверальнасць аўтарскай інтанацыі ратуюць ад дэкларатыўнасці, а мудрая прастата, спавядальнасць у спалучэнні з манерай, набліжанай да размоўнай, надаюць яму такую дарагую ў паэзіі якасць—шчырасць. Дарэчы асобныя радкі гэтай нізкі міжволі нагадваюць інтанацыі лозняга Панчанкі: разважліва-мудрыя, пранікліва - спавядальныя. Пацвярджае такую асацыяцыю і добрае суседства лірыкі і іроніі, а то і нечаканае кантрастнае іх суіснаванне.

Жыццёвая пазіцыя пісьменніка непазбежна адбіваецца ў яго творчасці. Адсюль, відаць, і непарыўная еднасць двух лёсаў — жыццёвага і творчага. І трэба мець мужнасць, каб азірнуцца назад, праўдзіва ацаніць пройдзены шлях.

«Мы хацелі праўды і справядлівасці ў чыстым выглядзе, без скідак на складанасць часу, без дыпламатыі і нейкіх агаворак. Як і ўсе ў такім узросце (і дзякуй за гэта маладосці!), мы былі непапраўнымі ідэалістамі і патрабавалі ад старэйшых яшчэ больш, чым ад саміх сябе. Потым, з цягам часу, з надыходам сталасці, прыйшлі да нас і спакойная разважлівасць, і непазбежнае прыманне жыцця ва ўсёй яго шматаблічнасці, і здольнасць дараваць не толькі сабе, і права на памяркоўнасць, і цвярозае ўмельства вызначаць галоўнае і адкідваць неістотнае», — гэта радкі з успамінаў Г. Бураўкіна пра Петруся Броўку, надрукаваныя ў чэрвеньскай кніжцы часопіса «Неман». Тут выбалелае пра сваіх аднагодкаў і пра сябе. Так атрымалася ў жыцці. Так атрымалася і ў паэзіі.

У. Паўлаў належыць да таго ж пакалення, што і Г. Бураўкін. Гэта, з аднаго боку, дае магчымасць шукаць моманты падабенства ў творчых набытках паэтаў, а з другога, — найперш выявіць арыгінальнасць іх бачання і светаадчування.

Паэзія У. Паўлава прадстаўлена ў кастрычніцкай перыёдыцы даволі шырока. Чытач знойдзе ягоныя вершы і на старонках «Полымя» і «Маладосці».

Калі ў публікацыі Г. Бураўкіна вершы робяць уражанне мастацкай і эмацыянальнай цэласнасці, дык пра нізкі У. Паўлава гэтага не скажаш. Найбольш і найменш удалыя з яго твораў рэзка адасоблены. Напрыклад, добра гучаць вершы «Развітанне з пушчай», «Уяўленне». Вытрыманыя ў спакойнай апавядальнай манеры, яны вельмі натуральныя і пераканаўчыя, бо аўтар давярае свайму жыццёваму вопыту, агульнаму для паэтаў пакалення, чыё дзяцінства апаліла згубным дыханнем вайна. Як тут не згадаць і прозу У. Паўлава, напрыклад, аповесць «Яжэліха», дакладную і моцную сваім біяграфічным сведчаннем аб праўдзе ваеннай пары.

У вершы «Развітанне з пушчай» паэт назіральны, дакладны ў дэталях:

Крок ласіны да берага скрадвае мох.
Цягне з вёскі пушчанскае дымам з націны.
Звечарэлы туман у лагчыне залёг
І не хоча вылазіць з сівой павуціны.

Вядома, ад У. Паўлава мы чакаем адкрыццяў не толькі ў пейзажнай лірыцы, бо ведаем яго выразную арыентацыю на заглыбленасць зместу, у «няпростую прастату» формы. У. Паўлаў надзвычай добра ўзнаўляе народны лад думкі і эмоцыі, ён па-сапраўднаму, хочацца сказаць, па-беларуску, сціплы ў лепшых сваіх вершах, дзе прастата і арганічнасць выказвання знаходзяць адпаведную паэтычную і стылявую норму. Але, на жаль, паэт бывае іншы раз і недакладны, неахайны, як, напрыклад, у гэтым вершы:

...Хатынскі лес у россыпе прамення.(?)
Накрыты попел цяжкаю плітой.
Сыны, устаньце мужнымі з з каленяў—(?)
Наш боль няхай не зведае ніхто.

Гляджу на свет адкрыта, па-юначы
І кожны дзень іду да адкрыцця.
Тады ў жыцці я чаго-небудзь значу,(?)
Калі не буду седнем ля жыцця.(?)

Вазьму ў руку зямлі вясновай грудку,
Шчакой адчую: цёплая ралля.
Ва ўсе часы і радасці, і смутку
Благаславёнай будзь, зямля мая.

Думкі і пачуцці тут відочна не знайшлі сябе ў слове, і гэта крыўдна, бо чытач ведае У. Паўлава як аўтара добрых вершаў на падобную тэму (прыгадаем хоць бы «Слязу на вейцы» з аднайменнага зборніка).

А вось два вершы, напісаныя ў выразна народным стылі: «Галубовая хустка» і «Маладая вішня». Першы з іх — творчая ўдача: ён шчыры, прачула лірычны, кампазіцыйна зграбны. Другі менш атрымаўся. Ён неяк залішне зухаваты. Аўтар не ўсюды дакладны ў дэталях, радок яго часам таўталагічны («А туман у малацэ. Мочыць вус абвіслы»), дый спроба «асучасніць» верш глядзіцца няўдалай:

Ява ўсё, а не міраж —
«Па апошняй фірме».
Ступіць крок — і іскры аж,
Быццам у мультфільме.

Заўважым, што верш у Паўлава заслугоўвае найчасцей папроку на ўзроўні радка, так сказаць, на «студыйным» узроўні, бо ход ягонай паэтычнай думкі, як і сама стылявая арыентацыя, не выклікаюць пярэчання. Можна сказаць, што У. Паўлаў даўно прывучыў нас прымаць сваю манеру такой, якой яна склалася, і мы ўжо даўно прынялі і ацанілі яе, як і наогул творчасць гэтага самабытнага паэта.

Калі У. Паўлаў працуе больш у традыцыйнай манеры, дык у творчасці У. Някляева — адчуваецца неспатольная прага эксперыменту. Увогуле, эксперымент—справа няпростая, бо тоіць у сабе і вялікія магчымасці, і вялікую рызыку. Але апраўданы ён у любым выпадку. І перш за ўсё таму, што сведчыць пра актыўнасць пісьменніцкага пошуку, хоць поспех, як правіла, прыходзіць тады, калі эксперымент падрыхтаваны логікай развіцця творчай думкі аўтара. І вопыт У. Някляева, мастацкай манеры якога ўласцівы стылявая шматкампанентнасць, жанравая разнастайнасць, публіцыстычны напал, вельмі цікавы ў гэтым сэнсе.

На фоне свайго ранейшага паэтычнага вопыту, для якога ўласцівая хутчэй шырыня дыяпазону пошуку, чым прыхільнасць да нейкіх пастаянных, улюбёных прыёмаў, У. Някляеў у паэме «Гарбун» засяроджыўся, прычым, самым «традыцыйным» чынам, на апавядальным раскрыцці ўнутранага свету героя. І гэтае своеасаблівае даследаванне чалавечай душы, складаных жыццёвых калізій, вырашана сродкамі традыцыйнай паэзіі. Нягледзячы на пэўную палемічнасць і «літаратурнасць» тэмы (назва «Гарбун» гаворыць сама за сябе), увасабленне яе пераканаўчае: паэма арганічная, натуральная, эмацыянальны апавядальны тон яе набывае часам рысы баладнасці. Паэма, бясспрэчна, заслугоўвае асобнай размовы. Але, здаецца, нельга не сказаць пра значнасць факта яе напісання ў творчай біяграфіі аўтара. Па ўсім відаць, што адбываецца нейкая ломка, перабудова паэтавай мастацкай свядомасці, і гэтае памкненне праяўляецца ў актывізацыі творчага пошуку. Ці не пра тое ж сведчыць і апублікаваная нядаўна паэма «Наскрозь» — твор, які вырашаны ў прынцыпова іншым ад паэмы «Гарбун» ключы і цікавы як сваёй жанравай своеасаблівасцю, важнасцю абранай тэмы, так і самім характарам яе вырашэння. Значыць, «эксперымент» У. Някляева мае даволі шырокі і тэматычны, і стылявы, і жанравы абсяг.

З нізкаю вершаў выступіла Р. Баравікова. Гэтую паэтэсу заўсёды пазнаеш праз яе верш: усё той жа натуральны лірызм, засяроджанасць на ўнутраным свеце сваёй гераіні-сучасніцы. І — нязменная шчырасць. Уважлівы чытач адчуе ў звыклым на першы погляд гучанні радкоў Р. Баравіковай і новыя ноткі. Хоць у яе вершах на змену юнацкай непасрэднасці, парывістасці і стыхійнасці эмоцый, даўно прыйшлі сталасць і выверанасць пачуццяў, не ўлагодненасць, але жыццёвая мудрасць чалавека, які зразумеў складанасць навакольнага свету, гэтыя змены ў новай публікацыі заяўлены як бы першапачаткова і выразна. А ўвогуле тут працяг пошукаў той Баравіковай, якой яна паўстае ў шмат якіх вершах нядаўняга зборніка «Адгукнуся голасам жалейкі!»

Тэматычна блізкая да нізкі вершаў Р. Баравіковай публікацыя Г. Каржанеўскай у часопісе «Маладосць». Варта адзначыць, што паэтэса таксама ідзе да ўскладнення і ўзбагачэння сваёй творчай манеры, імкнецца пашырыць сэнсавыя і выяўленчыя межы самога верша. Працэс гэты, безумоўна, няпросты і працяглы, і адбываецца звычайна не без пэўных страт, аднак у лепшых сваіх праявах набывае адзнаку дакладнасці і вобразнай завершанасці:

Прайшло не многа і не мала,
Каб азірнуцца.
Дзе той дзень,
Што пёк, нібыта авадзень,
А я каменьчыкі збірала?

Паэзія, кажуць, асабліва чуйная да фальшу. Вось чаму ні вытанчанасць, ні згладжанасць стылю не нададуць пераканальнасці тым радкам, якія не сагрэты шчырым, непрыдуманым пачуццём. Менавіта дзякуючы выверанасці, суаднесенасці з уласным жыццёвым вопытам, прагучалі ў кастрычніцкіх публікацыях вершы А. Лойкі і М. Арочкі, чаго, на жаль, нельга сказаць пра малодшых удзельнікаў гэтай «паэтычнай размовы». Нізкі іх вершаў робяць нейкае дзіўнае ўражанне, якое потым акрэсліваецца ў думку - запытанне: што цікавіць тых, хто сёння на пачатку свайго шляху ў паэзію?

Амаль кожны з маладых паэтаў лічыць за неабходнае прызнацца ў любові да роднага кута, сказаць пра вернасць бацькоўскаму запавету. Што ж, тэма ўдзячная, але разам з тым — няпростая. І менавіта таму патрабуе асаблівай адказнасці, далікатнасці і чуйнасці, а не зацяганых, выпадковых радкоў, аўтары якіх здаецца, часам больш клапоцяцца не пра сапраўднасць і натуральнасць пачуццяў, а нібыта пра выкананне нейкага прызначанага рытуалу. А тады, здараецца, вершаваныя радкі робяцца своеасаблівым рэбусам для чытача. Як, скажам, разумець такое:

...І спавівацца Прыдзвінне
У вятры,
Адданыя святлу,
Край таго ветру пацалуй —
Ты для яго ізноў адзіны.

Гэта пачатак верша «Прыдзвінне» Алеся Касценя. Урэшце, можна, відаць, і здагадацца пра той сэнс, які імкнуўся ўкласці ў яго аўтар, але навошта тады мастацтва паэзіі, якая найперш гаворыць пачуццю, а праз яго — думцы? Робяць прыкрае ўражанне і наступныя радкі:

...Працуе кожны для сябе,
Але, урэшце, — для Радзімы.
І найбліжэйшая радня
Усім нам —
жыццядайнасць тая,
З якой сявец будзённым дням
Душу шырока адкрывае...

Ці, напрыклад, верш «Цётка Люба». У ім — абразкі з жыцця адзінокай вясковай жанчыны. Чалавек яе загінуў на фронце, дзеці абжыліся ў горадзе, калі-нікалі прысылаюць на лета ўнукаў. Цётка Люба «Цепліць печ, З адзіноцтай вякуе, І па соннай, халоднай траве Кожны ранак да студні прастуе», а чытач у сваю чаргу чакае, чым скончыцца гэты пералік штодзённых цётчыных спраў, і думае, дзеля чаго, нарэшце, ён спатрэбіўся аўтару. У апошнім радку верша паэт усклікае: «Маладзец, цётка Люба! Жыве!» Гэта, відаць, і ёсць адказ на магчымыя недаўменні. «Але што незвычайнага ў тым, што цётка Люба жыве і чаму яе за гэта трэба хваліць?» — мусіць, здзівіцца іншы чытач і, відаць, будзе мець рацыю.

На жаль, нашым маладым аўтарам бракуе менавіта канкрэтнага адчування свайго месца ў жыцці і ў пакаленні. З аднолькавай лёгкасцю пішуць вершы і пра родны край, і пра вайну, і пра каханне, і пра прыроду. У кастрычніцкіх публікацыях ёсць вершы пра цётку Любу, пра бабку Марушку, пра вясковага дзеда, пра «кніжны храм», пра плач Яраслаўны... І сярод іх ніводнага (!) — пра свайго сучасніка, сучасніка тых змен, што адбываюцца сёння ў нашым жыцці. Быццам увогуле не існуе ні вялікіх будоўляў, ні заводскіх корпусаў, ні студэнцкіх аўдыторый, ці, урэшце, той пагрозы міру, якая турбуе сёння кожнага з нас. Размова ідзе, вядома ж, не пра навязванне тэматыкі, а пра такое неабходнае для сапраўднай паэзіі пачуццё далучанасці да праблем сённяшняга дня і да лёсу свайго пакалення.

Вераніка СТРАЛЬЦОВА.

«МАЛАДОСЦЬ»

У гасцях у «Маладосці» — украінскі маладзёжны часопіс «Дніпро». У перакладах Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, А. Грачанікава, Л. Дайнекі змешчаны творы Б. Алейніка, У. Забаштаньскага, Д. Іванова, У. Каламійца, М. Лубкіўскага, М. Шаўчэнкі, В. Шкляра...

Друкуюцца вершы Я. Міклашэўскага, урывак з паэмы К. Цвіркі «На сваёй зямлі», трагедыя У. Караткевіча «Маці ўрагану».

Сярод публіцыстычных матэрыялаў — артыкул Ф. Зайца «У рамках эксперыменту», нарыс В. Гігевіча і Д. Міхлеева «Родны дом», фотарэпартаж В. Ждановіча «Слава Гудзевічаў», рэцэнзія Л. Тарасюк на новую кнігу Н. Мацяш — «Светласць даверу».

Слова пра творчасць Э. Скобелева ў сувязі з 50-годдзем пісьменніка гаворыць А. Марціновіч — «Права на першаадкрыццё».

«БЕЛАРУСЬ»

«Падарожжа ў казку» — навагодні фотарэпартаж Л. Суханавай і В. Ганчарэнкі.

Друкуецца рэпартаж з пасяджэння «круглага стала», прысвечанага праблемам аграпрамысловага комплексу.

С. Марцалеў рэцэнзуе трохтомнае падпісное выданне «Усенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 — ліпень 1944 гг.)»—«Твая слава, народ».

Вершы А. Міцкевіча прапануюцца ў перакладзе К. Цвіркі. Творы маладых паэтаў Л. Пятруль, А. Глобуса, Я. Мальчэўскай і М. Шэляговіча прадстаўляюць Д. Бічэль-Загнетава, М. Стральцоў, Ю. Свірка і І. Шамякін.

Апавяданне акцёра Анатоля Жука «Пажар» друкуецца з уступным словам А. Дударава.

Нататкі А. Савіцкага, Б. Смольскага, А. Сабалеўскага публікуюцца да юбілеяў Э. Скобелева, М. Сярдобава, І. Шацілы.

Успаміны К. Шэрмана «Сустрэча з Гільенам» змешчаны пад рубрыкай «З далёкіх і блізкіх дарог».

Сярод іншых матэрыялаў чытача зацікавяць нарысы Ф. Шлыка і П. Шота «Жыццёвыя скрыжаванні», Я. Шунейкі «Там, дзе нараджаюцца вясёлкі», штрыхі да творчага партрэта кінарэжысёра В. Нікіфарава «Прага духоўнасці», напісаныя Е. Бондаравай, артыкул А. Сардарава «Сабор Парыжскай божай маці» («Эцюды аб шэдэўрах»), фотарэпартаж В. Жука «Наўсцяж па Нямізе», нататкі Д. Падбярэзскага «Музыка ў навагоднюю ноч».

«НЕМАН»

Чытач пазнаёміцца з вершамі Д. Бічэль-Загнетавай (пер. Т. Лейка і Г. Івановаі) і А. Гаўрона (пер. В. Ліпневіча).

Публікуецца заканчэнне рамана І. Пташнікава «Алімпіяда» (аўтарызаваны пераклад У. Кудзінава), навелы «Памяць» Я. Дзвінскай.

Пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС — нарыс М. Сердзюкова «Зігзагі гарызонта».

«Ланцугі капіталу і эвалюцыя культуры ў ЗША» — артыкул І. Антановіча.

Эсэ В. Карамазава пра А. Пысіна «Проста ўспомніў я цябе...» прапануецца ў раздзеле «Запіскі. Успаміны. Дакументы» ў аўтарызаваным перакладзе Г. Бубнава.

У. Ягоўдзік рэцэнзуе кнігу «Максім Гарэцкі: успаміны, артыкулы, дакументы» — «Чалавечнасць». У. Конан аналізуе даследаванне М. Мушынскага «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 40-ыя — першая палавіна 60-х гадоў» — «Дзейснасць літаратуразнаўчай думкі».

ПАЭЗІЯ

Кастусь ЦВІРКА

Шкадую тых, што ніколі
Не сеялі, не касілі,
На глебу патрэсканую —
хоць кроплю —
У неба дажджу не прасілі.

Не палівалі ні разу
Потам уласным палетак,
Зямлю не ўздымалі плугам,
Каб выпусціць зоры лета,

Тых, што не ўзгадавалі
І жмені зярнят — хоць на
дзіва,
Што за жыццё нават дрэўца
На свеце не пасадзілі.

Шкадую тых, што век свой
Паміж зямлёю і небам
Стракозамі мітусяцца,
Цаны не ведаюць хлеба.

●

Не запірайце душу на завалы,
не замыкайце!
Яе вы ў сябе,
нібы ў клетцы якой,
не трымайце!
Душа — гэта сонца,
якое і грэе, і свеціць,
Жыццё наша
ўсмешкамі радасці
квеціць.

Даволі нам хмараў,
панурых, свінцовых —
Душы
дайце слова!
Няхай сабе смела
гаворыць яна,
хай спявае,
Свет, ад варожасці
заледзянелы,
няхай растапляе!

Хто на трыбуну там выйшаў
з казённай прамовай —
Бетон ды жалеза
замест чалавечага слова?

А дом хто па схеме замшэлай
па сёння штампуе?
Хто рэчку спрамляе?
Крынічку лясную
касуе?

Нашто тое слова,
якое нам сэрца не радуе?
Каму ён патрэбны,
дом гэты без радугі?

І што нам бяздумная
меліярацыя,
Калі асушаць душу?
Дзе тут рацыя?

Мо досыць нуды,
безаблічнасці,
шэрасці?
Сунімем у свеце
бяздушнасці шэсце!

Душу расчыняйце шырокую
насцеж,
З усімі дзяліцеся
горам і шчасцем!

Няхай жыве шчырасць!
У дом,
што вы зранку будуеце,
У кволае дрэўца,
што ў садзе гадуеце,

У рэчы, што дома
альбо на заводзе вы робіце,
У словы, якія
з трыбунаў ці ў хаце гаворыце,

Ва ўсё, што ствараеце,—
не забывайце, —
Бы дрожджы у брагу,
душу ўсю ўкладайце!

Тады ў цэлым свеце
душа ваша будзе
Святіць,
нібы сонца высокае,
людзям!

●

Дзень прапаў у мяне...
А як хораша ён пачынаўся!
Як ён птахам дзівосным увысь
узлятаў,
як іскрыўся і ззяў,
калі я прачынаўся!

І не згледзеў,
калі адляцеў і сканаў,
склаўшы — ціха так — крылы
(Толькі стужкай расстайнай
зары памахаў
мне з небасхілу).

Дзень прапаў...
У мяне яго ўкралі з-пад носа
(І чапляўся ж ён так за мяне
пальцамі сонечных промняў
з нябёсаў!)

Дзень прапаў...
Не пярсцёнак, не золата,
не каралі —
Дзень укралі ў мяне,
дзень укралі!

Я прыгадваць пачаў,
Хто ж украў яго ўсё-такі,
дзень мой,
Дзе шукаць яго толькі,
у якіх — мо хто бачыў —
зладзеяў?

Адабраў у мяне
дня часцінку
нязграба-тралейбус
(Як ён пхнуўся па вуліцы,
тузаўся,
як ён бяздарна людзей вёз!)

Сход — яшчэ адхапіў яго
(Так пакрасамоўнічаць там
хацелася кожнаму!
Гадзіны мо тры таўклі ваду
ў ступе,
пералівалі

з пустога ў парожняе!)

Больш гадзіны забраў яшчэ
лектар
(«Атрымалася накладка,
таварышы,
казаў прафорг, трошкі яшчэ
пацярпіце:
Хай сваё аддалдоніць —
і яму ж трэба жыць які»)

А яшчэ... Ды ці злічыш
зладзеяў усіх,
якія
(мо трэба было трымаць
абцугамі?)
Па хвілінах
мой дзень,
як ваўкі, расцягалі!

Дзень прапаў у мяне...
Дзень гэты доля дала мне,
спусціўшы па сонечных
струнах —
Каб іграў і свяціў...
Які зраўняцца з ім можа
дарунак?

Ён адзіны быў. Гэткага болей
не будзе!
І вось у бездань вякоў
(паспрабуй адшукаць цяпер
там)
ён кануў.
Як
камень.
Дзень прапаў у мяне!
Дзень!

Не толькі ў сне было

Я волком бы
выгрыз
бюрократизм.
У. МАЯКОЎСКІ.

Мне сніўся сон...
Іду разорай дымнай
Пры сонцы ранішнім,
чырвоным, круглым,
І раптам бачу:
па вясновай ніве
Снуюць — о дзіва! —

ПРОЗА

Аль-танка

Мікола КУСЯНКОЎ

АПАВЯДАННЕ

I

Добра ехаць на возе лесам. Лес прыгарадны, машынам сюды няма ўезду, і па ўдзірванелай дарозе цупка ступае гняды ўкормлены конь. Валодзя не паганяе каня. Едзе ды слухае, як, бясконца расцягваючы сваё першае, траскучае каленца, шчабеча аж захліпаецца берасцянка; як нейкая сініца ці мо пеначка сама сябе падахвочвае: віць-віць-віць,—калі гняздо віць, дык ці не позна спахапілася — канец мая; а то ўжо і дрозд выдае часам кароценькую, але такую пералівіста-звонкую, акурат міліцэйскую трэль, што калі б гэта пра шпака, дык можна было б падумаць: прыхапіў, злётаўшы ў горад... Валодзя слухае ды гэтак жа ўсцешна ўдыхае п'янкі, гаркавы пах свежых асінавых дошчачак. Іх ён вязе на паляну да ручая. Там яго старыя, Пятровіч і Верамеевіч, змудравалі два дні назад прыгожую, дарма што прымітыўную альтанку. На чысты грудок, што крута абрываецца да альховай лагчынкі, забрыдаюць з горада закаханыя парачкі і старыя пенсіянеры, і каб ім было дзе пасядзець ды мо перачакаць раптоўны дождж, праектам і прадугледжана ў лесе такая альтанка. Цяпер, ужо амаль гатовая, яна стаіць у Валодзі ўваччу. Усё там чыста акорана — слупкі і падпоркі, што ад сярэдзіны слупкоў разыходзяцца коса пад дашак, дык і ўся яна, як аблупленае яечка, бялюткая і ўся такая ж акуратная. Засталося яе толькі накрыць — гадзіны на дзве работы, і Валодзя не паганяў каня, ехаў ды ўжо сам сабе і падумваў: а можа, яно і добра, што Фаміч падбіў яго летась на гэтае леснікоўства.

Ёсць у яго такі дзядзька — Фаміч. Валодзева маці, будучая, выйшла ўжо замуж, а яе малы брат толькі вылез яшчэ з калыскі. І Валодзя помніць, як маці ім абодвум, дзядзьку і пляменніку, адной хустачкай падцірала насы. Але цяпер Фамічу здаецца, што ён намнога за Валодзю старэйшы, нейкі выхаваўчы сверб не дае яму спакою, хочацца яму навучыць пляменніка, каб ён неяк хітрэй жыў на свеце. Бо сам Фаміч выгаду ловіць проста з паветра. Вярнуўся з арміі, дык не стаў шукаць работу ў горадзе, а пайшоў у леснікі, балазе што з яго крайняга гарадскога дома лес можна пакратаць рукою. Завочна адужаў нейкія лясныя курсы і цяпер гаспадарыць у прыгарадным лесе тэхнікам-лесаводам. Лесазводам — так сам ён жартуе. А як выгадвае ён з паветра, пра тое паслухаць трэба самога Фаміча. «Хе, — пасміхаецца ён са здзекам, —яны хацелі мяне абдурыць. Самі недзе душацца ў дыме ды ў чадзе, бо ў іх там нават і ў парку тысяча насоў палюе за адным дохлым атамам азону, у мяне ж гэтага азону — дыхай, хоць захлыніся..» А тут Валодзю летась не ўдалося паступіць у інстытут. Перагарэў, як рыхтаваўся да экзаменаў. Трохі напружыш памяць — і, здаецца, мозг усё роўна як сціскаецца над пераносіцай у адну малую кропку. Ты хочаш да нечага дапяць, нешта ўхапіць розумам, а яно няўлоўнае, як зусім няіснае, не даецца табе, нават колькі будзе двойчы два. Пайшоў да ўрача, бо ўжо стала балець галава, а ўрач і кажа: знайдзі часова лёгкі занятак, пажадана, каб на свежым паветры, і не хвалюйся, не бяры пакуль што нічога лішняга ў галаву. Збольшага Валодзя мусіў адкрыцца маці, а што было рабіць, вось тады і прыбег да яго Фаміч, прыбег назаўтра ж, і тут ён ужо адвёў душу, выхоўваў яго, як ніколі. «Гэта каб я сушыў так навукаю мазгі! Ды каму яна трэба цяпер, вялікая навука? Цяпер жыць трэба, а не вучыцца! Во я — цераз пень-калоду паспіхваў свае кантрольныя, і хай сабе коркі ў мяне сінія, затое сам я, дзякуй богу, чырвоны. А зірнуць на цябе. Вочы хоць кручком з-пад ілба даставай, мох на шчоках парос! Дык от паслухай, што я камандаваць буду. Пакуль зусім шарыкі за ролікі не заехалі, давай-ка ты, хлопча, да мяне на ўчастак — будзе табе і лёгкі занятак, і свежае паветра. А яшчэ ж і прэстыж — гэта ж табе сёння экалогія, недзе вунь партыя зялёных— чуў пра такую? Дык не раздумвай, заўтра ж на пяты кіламетр падскоч, там у нас кантора, скажу лясніччаму, каб афармляў, і хадзі сабе па лесе, паплёўвай на ўсе чатыры бакі. Ну не зусім — паплёўвай. Прыйдзецца трохі і пасанітарыць — паганяць караедаў, не без таго ж. А вясной згародзіш якую-небудзь альтанку, бо мы ж ля горада, дык нам і план такі даводзіцца, а як жа ты думаў?..»

2

За шырокай прасекай, да якой паціху набліжаўся Валодзя, кукавала непрыкаяная зязюля. Прасеку некалі засеялі шматгадовым сінім лубінам, і цяпер ён неўтаймоўна буяў не так мо сінім, як пранізліва-ліловым цветам, і гэткі ж, блакітна-ліловы яго водсвет мякка выплёскваўся ў рэдкі сасновы лес. Ліловатаю здавалася шэрая кара на камлях; радужна-ліловае ззянне ахінала маладжавую бухматасць светла-зялёных лапак, што яшчэ толькі адскочылі, але ўжо і важка абвісалі па ўсім старэйшым, цёмным голлі яловага падросту; і ўжо зусім ліловымі выдавалі кволыя, бледна-ружовыя кветкі лясной геранькі, што разгалістымі сцяблами і ўзорыстым, глыбока пасечаным лісцем ублытваліся сям-там у колка нашатыраныя чубкі гэткіх жа ліловатых пясчаных злакаў.

...Так Фаміч і завербаваў летась Валодзю ў леснікі, а цяпер, вясной, ён ужо і згарадзіў у лесе над ручаём сваю першую альтанку. Толькі ж не згарадзіў — гэта Фамічова слова, а не Валодзева. Старыя, Пятровіч і Верамеевіч, бурчалі, але выштукоўвалі яе сякераю, а сасновыя плашкі на лаву яшчэ і пагаблявалі рубанкам. Спачатку старыя не хацелі габлываць, ды нават і сякераю пашчыраваць упіналіся, маўляў, з яе ж не страляць, з гэтай альтанкі, нездарма ж, калі быў лесніком Фаміч, дык ён не прымушаў іх выгаблёўваць. Але Валодзя не паддаўся адсталым настроям, стаяў на сваім, і цяпер альтанка ў яго, што цацка. Ну, а старыя, ведама ж, учарашні дзень, ім дай першабытную каменную сякеру, дык яны будуць часаць ёю і казаць, што нічога больш гэтай альтанцы і не трэба.

Так Валодзя падумаў міжволі пра каменны век, але ён і ўявіць сабе яшчэ не мог, што гэтым самым і напраўду рыхтуе сябе да нечага першабытнага. Вось гняды, злёгку ўпінаючыся, трохі часцей затупаў на ўтравелым адхоне; седзячы, як на козлах, на стосе акуратных дошчачак, Валодзя ўз'язджае на высокі і чысты грудок, тут недзе яго зачакаліся ўжо з раніцы Пятровіч і Верамеевіч, вось ён ужо і на самой паляне. Але дзе ж альтанка?.. Ён спачатку падумаў, што гняды прывёз яго не на той грудок, але ж грудок быў той — вунь старая сасна пасярод паляны, дык куды ж падзелася альтанка?.. Не можа гэтага быць!.. Бо гэта ж, няйнакш, той самы першабытны век: нейкая гарыла выдрала з моху бялізны валун, вунь і чорная яміна ад яго, падымала і з усёй сілы абрушвала шматпудовы камень на пагабляваную, з зіхотна-жоўтымі сучкамі, лаву, на белыя, чыста акораныя слупкі, на далікатныя паплёцінкі дашка, і ўсё гэта, сухое і крохкае, распадалася на кароткія аскабалкі. Нейкі трагладыт нарыхтоўваў дровы: палова разгромленай альтанкі была ўжо спалена — крокаў за дзесяць ад яе масляна сінела прыбітае ўчарашнім дажджом вогнішча...

Валодзя, яшчэ з нейкай надзеяй, азірнуўся вакол: а можа, гэта ўсяго толькі страшны сон?.. І ён не адразу ўбачыў іх, Пятровіча і Верамеевіча: сцішаныя — таксама аглушана-зніякавелыя — яны сядзелі на нізкіх пяньках ля паляны, пад крайнімі дрэвамі. Валодзю страшнавата было набліжацца да іх, пакрыўджана-маўклівых, бо гэта ж найперш іхняе старанне пайшло прахам. Ужо зблізку прыгледзеўся да Верамеевіча: яго тонкія, скептычна сцятыя вусны былі як зашытыя пагусцелымі абапал рота маршчынкамі, і палохаў нежывы, утароплены Валодзю ў ногі, позірк. Пятровіч жа, наадварот, скіраваў неяк празмеру прыжмураны пагляд некуды ўгору, акурат паўз Валодзева плячо, як быццам недзе высока над лесам

людзі безгаловыя!
Аруць зямлю,
мяшкі згружаюць з воза,
На сеялках патрэсваюцца,
пыльныя...
Як ні глядзеў,
ды ў іх галоў не ўбачыў я!
Перад вачамі толькі —
рукі, рукі!
І я пабег,
пабег шукаць галовы тыя
За сонную дарогу,
да паселішча.
Шукаў я дзень
і ўрэшце апынуўся
У доме мураваным,
двухпавярховым.
Ледзь дзверы ў кабінет
прыадчыніў я,
Гляджу: яны —
вясёлыя, з усмешкамі галовы!
Над доўгімі сталамі
нахіляюцца,
У прэс-пап'е ўглядаюцца,
у бланкі,
Над жоўтымі лічыльнікамі
лбы маршчыняць,
Да тэлефонаў
вухам прыкладаюцца!
І без канца —
праз пісьмы, праз пасыльных —
Здалёк рукам
загады шлюць у поле.
А рукі —
як ім толькі растлумачыць?
Куды ні глянь,
неўпапад усё робяць.
Галовы гавораць:
засейце палетак жытам,
А рукі,
не бачачы, засеюць яго
асцюкамі,
Галовы гавораць:
насенне ў раллю кладзіце,
А рукі,
не бачачы,
сыплюць на камень, на
камень...
Галовы — сабе,
Рукі — сабе...
Так і працуюць —
Зямлю катуюць!..
— Гэй, што вы робіце! —
я закрычаў галовам,
Набраўшы ў лёгкія паветра і
нянавісці.
Ды толькі
на мяне яны і не зірнулі:
Спакойна пыл з пажоўклых
папак
здзьмухвалі,
Да тэлефонаў цераз стол
цягнуліся,
Кудысьці ў даль глядзелі...

Прывыкаем...

«Ну й што ж, што нялюбы?
З галавы, дачка, гэта выкінь!
Пажывеш з ім —
прывыкнеш!» —
Так маці дачку,
выпадкова я чуў,
павучала.
«Звыкнецца — злюбіцца», —
гэтак казала.

І звыклася ж, пэўне —
доля, кажуць, такая...
Да чаго толькі мы
так во
не прызыкаем!

О як нас узносілі некалі
на крылах юнацтва
туды, у захмары,
Найвысокія
мары!

А сёння —
і што гэта з намі
навала гадоў нарабіла? —
Нам добра хадзіць па зямлі
ўжо —
прывыклі! —
без крылаў.

Да мяккага крэсла свайго —
яго нам падсунуў выпадак —
мы так прыліпаем!
Да папяровага ілжэжыцця
прывыкаем...

Мы ўсе прывыкаем
жыць без лясоў і без росаў,
Без песні дразда ў грабняку,
без расчыненых насцеж
нябёсаў!

Да ціхага цмока сучаснага —
смога,
што нас дзень за днём
памаленьку з'ядае,
Мы прывыкаем!

Да шуму,
Да тлуму,
Да глуму,
Да валтузні бытавой,
у якой
з галавой
патанаем —
Мы прызыкаем.

А яшчэ прывыкаем, бывае,
да бяды,
да жуды,
да нястрыманай подласці,
пошласці,
Да ілжы, як іржы,
яе пошасці!

Бы селядцамі бочка,
бомбамі свет наш набіты —
мы, голаў стуліўшы,
запалкі толькі чакаем:
Разам са смерцю ўжо
жыць прывыкаем!

Мост дружбы

Хацеў бы збудаваць
У свеце гэткі мост я,
Каб мог ён, мост, звязаць
Краіны ўсе папросту.

Захочацца — па ім
Ідзі любы, па мосце
Араб, француз ці фін —
Заходзь ка мне
у госці.

Мы разам пасядзім,
Усё, як ёсць, разважым
Любы развеем дым,
Усе вузлы развяжам.

Хіба ж тады б мана
Надзела тогу праўды?
Варожасці сцяна
Між намі легла б прахам!

Якая ягамосць
Стаілася ў бетоне
І ў склепах копіць злосць
На цэлы свет сягоння?

Мы павука таго,
Што тчэ ўсім сеці згубы,
Усе разам — качаргой
За шкірку б з-пад падрубы!

Гуртом любы пажар
Згасілі б на карні б мы,
З багоў—глядзіце ў твар!—
Усе сарвалі б німбы.

Няхай наўкол цвітуць,
Бы кветкі, ўсмешкі ў свеце,
У садзік свой бягуць
Вясёлым ранкам дзеці,

Ды грае сок буйны
У вінаграднай гронцы...
Сагрэлі б шар зямны
Мы нашай дружбы сонцам!

●

А вецер зноў раўкамі
Пагнаў лісцё бяроз.
Не, я не наракаю
На ўласны лёс.

Усё цячэ ў прыродзе —
Накшталт таго лісця.
Ды не дарма мы ўсходзім
На небасхіл быцця.

У чорнай бесканечнасці
Мы зыркіх зор бяссонь.
Мы вечны чалавечнасцю,
Што па зямлі нясём.

У нас з табою, дружа,
Задача ёсць з задач:
Жыцця зямнога ружы
Абсыпацца не даць.

Пранесці — хай разводдзі! —
Далей яе ў прасцяг.
Мы ўсе — мільёнагоддзяў
Азораны працяг.

высачыў нешта такое, што было яму намнога важней, чым зруйнаваная альтанка.

— Турысты... На выхадныя прыходзілі... — Гэта Пятровіч усё ж адабраў нарэшце ў той высокай кропкі свой заклапочаны позірк і, унурваючы галаву, паныла абвяў плячамі. — Зусім апаскудзелі, не давядзі гасподзь ні чуць іх, ні бачыць. Лес бляшанкамі смярдзючымі паганяць, а шкляння — каб, як некалі, босай нагою, дык і не знаў бы, дзе ступіць. А летась двойчы пажару нарабілі...

— Пажару нарабілі!.. — нечакана крутнуўся на гэтыя словы Верамееевіч, зласліва зіркнуўшы на свайго напарніка. — Табе ж казаў Фаміч—караеды! Дык Фаміча трэба было і слухаць. А не гэтага зялёнага. Стукнула яму габляваць! Пры Фамічу ніколі не габлявалі! Чым габляваць, дык лепей гонты прывезлі б, дошчачак гэтых, ды ў той жа дзень і накрылі б. Так і Фаміч казаў. Накрылі б, а тады хай бы глумілі — альтанка была! А так, калі мы яе не накрылі, дык была яна ці не была? Хто нам цяпер заплоціць?.. На прыгажосці выгадаем!.. Выгадалі! Як Заблоцкі на мыле!..

3

«На прыгажосці выгадаем!..». Гэта ўжо Верамееевіч з'едліва падкусіў яго, Валодзю. Так ён, Валодзя, падахвочваў старога, калі той, габлюючы плашкі, незадаволена бурчаў—маўляў, каму яна трэба, гэтая гэбля, толькі час марнуем. «Каб у вас, пенсіянераў, ды не было часу, — лагодна ўломваў старых Валодзя. — Ну пакладзём якую лішнюю гадзіну, прагадаем у часе, затое ж выгадаем на прыгажосці!..» Дык вось цяпер Верамееевіч і перадражніў яго: маўляў, выгадалі... Але ж пры чым тут Заблоцкі?.. Той жа хацеў некага абдурыць. Прывязаў да парома мех з мылам — каб не плаціць паромшчыку, едзе і радуецца. Пераплыў раку, хоп за мех, а ў ім адны мыльныя бурбалкі. Дык так яму і трэба, бо нядобра ж рабіў. А ён жа, Валодзя, нікога не ашукваў, наадварот, для іншых стараўся, габляваў, каб на лаву сесці было прыемна. Дык ці ж можна раўняць яго з Заблоцкім?..

З такімі думкамі Валодзя і павёз назад у лясніцтва свае горкія, нездарма ж асінавыя, дошчачкі. Прывёз, распрог каня і, не заходзячы ў кантору, пабрыў на шашу. Уперадзе чуўся ўжо гул машын; у тым баку, высока над лесам, увачавідкі раставала лёгкае бёлае воблачка, і Валодзю здалося, што гэтак жа і ў ім растае, становіцца прывіднай слабая надзея, нібыта ў гэтым лесе і праўда можна, як раіў яму ўрач, не браць нічога лішняга ў галаву і не хвалявацца. Да болю ўваччу, пранізліва ясна ён уявіў сабе, як у пятніцу пад вечар, развітаўшыся каля альтанкі са старымі, натрапіў ён у лесе на тую джынсавую кампанію. Можа, хвіліны дзве, не болей, Валодзя бачыў іх перад сабою, турыстаў выхаднога дня — так іх называюць, але, мабыць, сэрца падказвала яму нешта нядобрае, і таму ён так пільна да іх прыглядаўся.

Іх ішло чацвёра: два хлопцы і дзве дзяўчыны. Адзін, каржакаваты, хлопец быў у пацёртай скуранай тужурцы, і з-за плячэй у яго вырастаў таўсматы рукзак, у які старчма ён увапхнуў два скручаныя спальнікі. Дзяўчыну, што ішла побач, вылучаў з усіх яе шэры, грубай вязкі світэр, і яго авальна выкруглены каўнер-хамуток надаваў асаблівую выразнасць ганарлівай паставе прыгожа адкінутай назад галавы. Гэтак дзяўчына, пагардліва выпінаючы, як у рыбіны, ніжнюю губу, раўніва, мабыць, прыслухоўвалася да гуллівай валтузні, якую разпораз усчынаў у яе за спіною другі хлопец з другой дзяўчынаю, што больш нагадвала сабою дзяўчынку-школьніцу. Хлопец удаўся цыбаты, акселерацыя, пэўна, ударыла яму найперш у ногі, і яшчэ ў яго былі прытуманеныя, як п'янаватыя, вочы. Рукзак нёс ён невялікі — відаць, толькі з харчамі, у адной руцэ трымаў дарагі магнітафон, другою ж яму ўвесь час карцела аблапіць за плечы сваю рыжаватую сяброўку. Ішла яна ў джынсавым касцюме — таго ярка-сакавітага чарнічнага колеру, калі ён яшчэ ні разу не мыты. У яе, шчакасценькай, былі, як у пластмасавай лялькі на ружовым твары, наіўныя, ярка-сінія вочы, і толькі, калі яна гулліва адбівалася ад хлопца — аберуч упіралася яму ў плячо, да гэтай наіўнасці дадавалася ўваччу і трохі няўмелага какетства. Размінаючыся з Валодзем, яна спачатку зірнула на яго, як на пустое месца, але потым трохі затрымала на ім абыякава-наіўны пагляд, тады і хлопец паблукаў па ім п'янаватымі вачамі і Валодзю здалося, што Цыбаты (так ён яго адразу ж назваў) праз туман уваччу, так і не ўбачыў яго выразна — нібыта не злавіў у фокус.

Ужо ў аўтобусе, ладна стомлены, Валодзя ўвесь час глядзеў за акно, каб міжволі не заплюшчыць вочы і зноў не ўявіць тую разнашэрсную, як здавалася яму, кампанію... Дома ў яго нешта пытала маці, ён нешта адказваў неўпапад, а потым пабрыў нехаця спаць. Нехаця, бо трэба ж іх заплюшчваць, вочы, каб хутчэй заснуць, але тады ўваччу ярка высвечваюцца між дрэў, як імгненна выхапленыя з цемры маланкаю, лесавыя турысты. «Чаму так, — не ў сілах быў заснуць, пытаўся сам у сябе Валодзя, — адны альтанку сатварылі, душу ў яе сваю ўдыхнулі, а другія зраўнавалі яе з зямлёй — паламалі, спалілі?..

4

Раніцай маці ані бразнула на кухні, але Валодзя праз рэдзенькі сон чуў яе там, і чуў, як потым, ідучы на работу, яна ціха прычыніла за сабою дзверы. І раптам гэты званок, пранізлівы, як быццам самога цябе ўключылі ў электрычны ланцуг. «Фаміч, хто ж яшчэ», — падумаў Валодзя, падымаючыся, каб адчыніць. Фаміч па-мядзведжы ўваліўся ў прыхожую і, не чакаючы запрашэння, папёр напралом у залу. Паспешліва, як быццам з-пад яго нехта мог выхапіць крэсла, падсеў бокам да стала, узлёг на яго адным локцем і глыбакадумна забарабаніў па стале пальцамі. На Валодзю не пазіраў, даючы зразумець, што ён і не варты ягонага позірку. Нарэшце лэпнуў далоняю па кішэні казённых, з зялёным кантам, штаноў — хапіўся за курыва, і гэта быў знак, па якім яны моўчкі падаліся на балкон. Валодзя, прадчуваючы непрыемную размову, паныла апусціўся на табурэт, на другі ж паказаў хмурным позіркам Фамічу. Але Фаміч не еў і не стаў закурваць; ашчаперыў адной даланёю шыракаватую, трохі прыгаджаную вераб'ямі парэнчу — і, нават не падымаючы на Фаміча позірку, Валодзя адчуваў на сабе яго ледзяную паблажлівасць і пагарду.

— От жа праўда: няма ў чалавека толку, дык свайго не ўставіш. Я ж табе казаў: сёння пачаў і к вечару кончыў. І тут жа, у лесе, выпісаў і закрыў нарад. Распісаліся, разбегліся, а тады хай ламаюць, хай паляць, грызуць зубамі — вось у цябе дакумент, план ты выканаў, а што будзе пасля, мы з табою ў тым не вінаватыя. А ты ўздумаў габляваць лаву! Маўляў, не кончым сёння, дык у бога дзён многа!.. Хлопча, ды каб твая альтанка пастаяла хоць з тыдзень, пенсіянеры самі с... і лаву пагаблявалі б. Дык не ўстаіць жа! І двух дзён не ўстаіць! Так ёй на раду ўжо напісана — назаўтра ж не паламаная, дык паваленая!..

З балкона было відаць, як па шашы з горада і ў горад беглі, разміналіся раз-пораз аўтобусы і легкавушкі, і Валодзю здалося, што так размінаюцца і яны з Фамічом: Фаміч гаворыць пра адно — як трэба з імі ўпраўляцца, з альтанкамі, — пачаў і к вечару скончыў, а сам ён думае пра іншае: хто і чаму іх ламае. Але Валодзя толькі так падумаў, што яны размінаюцца, сказаў жа ён нешта зусім процілеглае:

— Стукнемся мы з табою, Фаміч. Рана ці позна стукнемся...

— Як гэта — стукнемся, ілбамі, ці што? — Фаміч атарапеў на хвіліну.

— А-а-а... Ну, вядома ж, стукнемся... Ты ж у нас... Можа, я не здагадваюся, што ты пра мяне думаеш? Стук-грук — абы з рук! Скажаш, не так?.. Дык от не будзь такі разумны. Мне, можа, яно самому абрыдла, гэтае стук-грук. Але ж гэта нейкае насланнё,чыстыя караеды — габлюй не габлюй, яны ўсё роўна зглумяць!..

— Уеліся яны табе ў косці. Нават назву прыдумаў. Мне і старыя ўжо казалі, што ты завеш іх караедамі. А чаму яны ў цябе караеды?..

— Хе — чаму! Цёмны ты яшчэ, хлопец. Што такое караед? Вось пратачыў ён дзірачку, і ў гэтым месцы ў яго пад карой, як у нас, у людзей, агульная зала, сюды ён прыводзіць сваю караедку. А пасля точыць ход і ўбок. Праточыць, і там цяпер у іх, павучонаму, шлюбная камера. Усёк? Там яны цешацца між сабою. А як у гэтых тваіх турыстаў? Во тут, на паляне, яны тарнуюцца, а што ў іх там, у лясочку? А там у іх палатка. А іх жа па двое, дык адна пара ля вогнішча, а другая там. А пасля наадварот. Дык скажы, што яны не караеды? Не, браце, я ўжо іх вывучыў!..

— Дзіўна. Калі яны караеды, шкоднікі, дык чаму ж ты іх не труціш? Ты ж ляснік, дый не ляснік, а тэхнік. Вунь які граматны!

— Твая праўда. Злавіў аднаго — і дусту ў рот. А пасля другому. Дык забаранілі ж дуст. Дый хіба ўсіх пераловіш? Не адны, дык другія. Але нават не гэта галоўнае. Няважны з цябе філосаф. Жывому здароваму дрэву ніякі караед не страшны. Вось ён точыцца пад кару, а там адна кропелька смалы, ну не смалы, а жывіцы— о-о-п, абвалаквае яго з усіх бакоў — і хана караеду. Прырода яго выдумала, прырода і ўправу на яго знайшла. Праз тысячу год во так зірнеш — бурштынавая кропелька, а ў ёй гэты самы караедзік!..

5

Валодзя хацеў яшчэ раз сказаць: «Стукнемся мы з табою, Фаміч», але не сказаў, бо тут жа падумаў — а як ты з ім стукнешся? Не біцца ж з ім, ён жа табе не вораг, ён жа па-сваяцку толк табе ўстаўляе: прырода выдумала караеда, сама яна з ім і ўправіцца. І скажы ты каму, што ён такому цябе вучыць, дык хто ж табе паверыць? Бачыў жа Валодзя: у канторы Фаміч зусім другі чалавек, так умее крутнуцца перад лясніччым, аж абцасам прыстукне. І ляснічы думае: ну гэты ўжо навядзе парадак у лесе!..

Так разважаў Валодзя, а сам ужо чакаў наступных выхадных. І ў суботу ён зноў ішоў на тую ж самую паляну, і, напэўна, спявалі птушкі, але Валодзя не чуў іх, таму што ў думках прыкідваў: калі тыя чацвёра яшчэ не

(Заканчэнне на стар. 10—11).

Праблемы — сур'ёзныя

Беларускую прафесійную кампазітарскую школу лічаць даволі маладой. Яе станаўленне і росквіт — адно з яркіх дасягненняў Савецкай улады на беларускай зямлі. І тым больш адметна, што за параўнальна кароткі гістарычны перыяд нашы кампазітары здолелі набыць нямала цудоўных традыцый. Адна з такіх традыцый — цесная сувязь паміж жывой творчасцю і падзеямі грамадскага жыцця. Сацыяльныя змены ў жыцці людзей, важныя падзеі новай беларускай гісторыі знаходзілі вобразнае адлюстраванне ў партытурах, праўдзівымі і эмацыянальнымі вобразамі прыходзілі да людзей з беларускай опернай сцэны, з канцэртных пляцовак. Ды, напэўна, іначай і быць не магло, бо сваім развіццём беларуская прафесійная кампазітарская творчасць была абавязана тым вялікім зменам, якія прынесла на нашу зямлю Савецкая ўлада.

Таму, думаю, глыбока заканамерная пастаянная ўвага нашых кампазітараў да героіка-патрыятычнай тэмы. Гаворачы пра дасягненні апошніх гадоў, нельга не адзначыць, што найбольш яркія творчыя вынікі ў самых розных музычных жанрах непасрэдна або ўскосна звязаны з увасабленнем гэтай тэмы.

Уздым грамадскай актыўнасці, звязаны з падрыхтоўкай урачыстага святкавання 40-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, не мог не паўплываць і на творчую працу кампазітараў. Манументальнай араторыяй «Бітва за Беларусь» адгукнуўся на гэтыя даты старэйшы беларускі кампазітар А. Багатыроў, да старонак ваеннай гісторыі звярнуўся ў сваёй новай рабоце, араторыі «Партызанскія песні» У. Алоўнікаў. Высокім пафасам барацьбы за захаванне міру прасякнута праграмная, Пятая сімфонія Я. Глебава «Да свету» і вакальна-сімфанічны трыпціх І. Лучанка «Вайна не патрэбна». Важна, што хвалюе гэтая тэма і прадстаўнікоў больш маладога пакалення беларускіх кампазітараў. Рэквіем Л. Шлег па матывах кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», вакальна-сімфанічная паэма В. Помазава «Памяць», некаторыя іншыя сачыненні — дастойны прыклад звароту кампазітараў пасляваеннага пакалення да тэмы мінулай вайны. З распрацоўкай гэтай тэмы звязаны плённыя пошукі Э. Ханка, Л. Захлеўнага, Э. Зарыцкага, В. Іванова, некаторых іншых нашых калег у песенным жанры.

Сённяшні дзень — так заўсёды — уладарна ўрываецца ў жыццё творчае. Задачы, пастаўленыя перад камуністамі краіны ў новай рэдакцыі Праграмы партыі, абавязваюць кампазітараў рэспублікі да яшчэ больш напружанай творчай працы, да больш уважлівай і крытычнай ацэнкі дасягнутага. Завяршаюцца новыя работы, прысвечаныя XXVII з'езду КПСС, спеюць далейшыя творчыя планы. Ды як ніколі раней усведамляюць беларускія кампазітары, што аблічча сапраўды сучаснага мастака не можа вызначацца толькі **творчай** актыўнасцю. Кампазітар — **грамадскі дзеяч**, які ва ўсе часы быў абавязковым удзельнікам і стваральнікам культурнага прагрэсу, сёння як ніколі патрэбны на шырокім абсягу развіцця сацыялістычнай культуры.

Вырашэнне грандыёзных задач, пастаўленых партыяй перад савецкім народам, шмат у чым залежыць ад чалавечага фактару. І фарміраванне асобы свядомага і перакананага будаўніка новага грамадства, духоўна багатай асобы чалавека-творцы — высакародная і, пэўна, самая галоўная задача савецкага мастацтва. З ясным разуменнем гэтай задачы сустракае XXVII з'езд нашай партыі і беларуская кампазітарская арганізацыя.

Беларуская музыка за апошнія гады мае нямала набыткаў. Але настойлівае патрабаванне сённяшняга часу — дакладнае асэнсаванне надзённых праблем нашага музычнага мастацтва. Іх шмат, на ўсіх праблемах засяродзіцца ў кароткім артыкуле немагчыма. Спынюся на некаторых.

Як негатыўную тэндэнцыю я вызначыў бы пэўнае зніжэнне грамадскай цікавасці да развіцця так званых сур'ёзных жанраў. Ужо нямала гаварылі і пісалі пра дысправорцыю, якая ўзнікла ў нас паміж прапагандай сур'ёзнай музыкі і музыкі эстраднай. Апошнім часам такое становішча крыху мяняецца да лепшага, ды праблема, як мне здаецца, па-ранейшаму застаецца.

Беларуская песня, беларуская эстрада сёння зрабіла крок далёка за межы рэспублікі. Гэтым фактам мы па праве ганарымся. Песню любяць. Песням і іх выканаўцам прысвячаюцца цікавыя радыё- і тэлеперадачы, публікацыі ў масавым друку. Сур'ёзная ж музыка жыве куды больш сціпла. Рэдка сустрэнеш пра яе захапляючыя артыкулы ў газетах і часопісах. Як ні прыкра, прывычнаю з'явай сталі паўпустыя залы на канцэртах сімфанічнай і камернай музыкі. Невялікая колькасць сапраўдных аматараў і прыхільнікаў опернага і балетнага мастацтва. Апошнім часам ДАВТ БССР не песціць нас новымі спектаклямі на музыку беларускіх кампазітараў, наогул, пастаноўкамі сучасных савецкіх оперных і балетных твораў.

Усё гэта не можа не трывожыць. Бо гаворка ж вядзецца пра тыя музычныя жанры, якія ў значнай ступені вызначаюць узровень развіцця прафесійнай музычнай культуры рэспублікі. І мы ж не можам сказаць, што ў нас няма значных дасягненняў у гэтых жанрах. Ёсць дасягненні. Ды калі ў галіне сімфанічнай і тэатральнай музыкі яны, няхай зрэдку, але ўсё ж становяцца «набыткам» грамадскага жыцця, дык у галіне музыкі камернай гэтак, практычна, не бывае. Паслабленая ўвага да яе выяўляецца і ў тым, што беларускія кампазітары сёння амаль страцілі цікавасць да працы ў камерных жанрах.

Новыя інструментальныя санаты, квартэты і трыо, вакальныя цыклы з'яўляюцца ўсё радзей... Творы гэтых жанраў, праўда, ніколі не мелі асаблівай папулярнасці ў самага масавага слухача. Гэта натуральна. Яны часта складаныя па мове, для іх успрымання патрэбна адпаведная, часам прафесійная музычная падрыхтоўка. Аднак, такія сачыненні заўсёды былі творчай лабараторыяй кампазітараў, тут яны шукалі і знаходзілі новыя выяўленчыя сродкі, формы, удасканальвалі сваё прафесійнае майстэрства. І менавіта камерныя творы былі той нотнай літаратурай, па якой вучыліся музыцы як будучыя прафесіяналы, так і многія, многія аматары. Сёння ж востра стаіць праблема беларускага рэпертуару для тысяч навучэнцаў музычных устаноў рэспублікі.

Ні ў якім разе не хачу сказаць, што так званая сур'ёзная музыка апынулася ў амаль безвыходнай сітуацыі. Выйсце ёсць: клопат пра сур'ёзныя жанры павінен стаць неад'емнай часткай работы нашых устаноў культуры. (Зрэшты, гэта само сабой зразумела, бо не можам жа мы не прызнаваць, што без паспяховага развіцця «фундаментальнага» музычнага мастацтва немагчыма ў цэлым існаванне і развіццё ўсёй нашай нацыянальнай музычнай культуры).

У сістэме адносін паміж кампазітарамі і музычнымі ўстановамі асноўным «заказчыкам» твораў сур'ёзных жанраў заўсёды было Міністэрства культуры.

Рэпертуарныя камісіі праводзіліся некалі да чатырох разоў на год (а пры неабходнасці і часцей). Яны не толькі ацэньвалі новыя музычныя творы, але і вялі мэтанакіраваную работу па стымуляванні і развіцці ў рэспубліцы пэўных музычных жанраў. На жаль, сёння гэтую функцыю рэпертуарная камісія Міністэрства культуры БССР практычна страціла. Пагадзіцеся, хіба можна ўсур'ёз гаварыць пра мэтанакіраваную работу па фарміраванні рэпертуару, калі камісія, якой наканавана выконваць важнейшую частку гэтай работы, засядае з перыядычнасцю адзін раз у год?

Удасканаленне дзейнасці рэпертуарнай камісіі я лічу неабходным і самым першым крокам у рабоце па павышэнні ролі сур'ёзнай музыкі ў нашай паўсядзённасці.

Другім і, як мне здаецца, вельмі перспектыўным крокам павінна стаць сістэматычная работа са слухачом. Я не маю ілюзій наконт таго, што ў бліжэйшай будучыні мы зможам напоўніць нашы канцэртныя залы арміяй незлічоных прыхільнікаў сур'ёзнай музыкі. Праблема музычнага выхавання няпростая, яна — частка вялікай і складанай праблемы агульнаэстэтычнага выхавання.

Чалавека, які не чытае кнігі, лёгка магу сабе ўявіць у ліку паклоннікаў песеннага жанру і папулярных ансамбляў. Чалавек, раўнадушны да глыбокай літаратуры, да тэатра, да іншых відаў мастацтва, наўрад ці будзе сярод прыхільнікаў камерных твораў. Разам з тым, аматараў літаратуры і мастацтва не так ужо мала. Чаму ж не вабіць многіх з іх атмасфера нашых канцэртаў? Прычыну гэтага бачу ў даволі фармальным падыходзе да прапаганды твораў сур'ёзнай музыкі і, прынамсі, музыкі беларускай.

Гаворачы пра поспехі ў гэтай рабоце, мы вельмі часта ў якасці галоўнага аргумента называем колькасць канцэртаў і выкананняў. І перспектыву работы вельмі часта бачым менавіта ў павелічэнні колькасці канцэртаў. А ці шмат мы можам успомніць канцэртаў, напрыклад, сімфанічнай музыкі, якія задаволілі б нас сваёй якасцю? Вельмі мала. А хіба можа мастацтва быць нізкаякасным?! На тое ж яно і мастацтва, каб кожнае, без выключэння, выкананне было дэманстрацыяй бліскучага майстэрства, а не рамесніцкай падробкі! І, мусіць, калі на канцэртах сур'ёзнай музыкі (няхай сабе яны будуць і менш частымі) слухач прызвычаіцца да сустрэч з мастацтвам у сапраўдным сэнсе гэтага слова, тады, можа, не будзе ў нас так

АЛЬТАНКА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8—9).

спалілі альтанку датла, дык павінны ж яны заявіцца на гэта месца і другі раз. І Валодзя не памыліўся: яны, мабыць, прыйшлі сюды, як звычайна, у пятніцу, і цяпер ужо вогнішча ледзь курала — ад альтанкі засталіся адны чорныя галавешкі. Ля вогнішча, акурат па Фамічовай тэорыі, сядзелі на кароткім паленцы двое — каржакаваты, у скуранай тужурцы, хлопец і дзяўчына ў шэрым світэры. Двума белымі пальцамі яна павольна падносіла да пакрыўленых крыўдаю вуснаў праменькую цыгарэту і, спустошана гледзячы перад сабой невідушчымі вачамі, гэтак жа меланхалічна адводзіла яе ўбок. Валодзя нясмела падышоў і спытаў, чаму так не па-людску абышліся яны з альтанкаю. Дзяўчына замаруджана павяла на яго самнамбулічным позіркам, а хлопец, у якога на шчаках пагульвалі каменныя жалвакі, лена павярнуўся ў той бок, дзе між дрэў, за маладымі елачкамі, жаўтлява выдавала сябе іх палатка, і пагрозна гукнуў — як быццам яны тут варагавалі:

— Гэй ты, фраер! Канчай свае амуры! Вылазь, тут ляснік прыйшоў! Пра альтанку пытае!..

Звонку палатка не варухнулася — не падала ніякага знаку, што ў ёй пачулі гэты загадны выклік. Але яго там пачулі. Пачуў той самы, Цыбаты, — ён не ведаў, што ў думках яго заве так Валодзя. Цыбатаму да чорцікаў надакучыла зацятая важданіна з рыжай лялькаю, яна і праўда ж была, як пластмасавая, ледзь лапнеш рукою — напружваецца, касцянее ўся, хто б мог падумаць, што яна такая цнатліўка. І калі ад вогнішча данеслася гэтае «канчай свае амуры», Цыбаты ўжо і рад быў, калі не скончыць іх, дык хоць на нейкі час перапыніць. Ён знясілена адкінуўся дагары і насцярожыўся: які яшчэ ляснік і што яму там трэба?.. «Пра альтанку пытае. Пра альтанку? Ага, навошта паламаў і спаліў яго альтанку. Як гэта — навошта? А што, я павінен на яе маліцца?..»

Валодзя глыбока памыліўся б, калі б падумаў, што Цыбаты аніяк не зможа апраўдаць свой паскудны ўчынак. Гэтак жа, як памыліўся ён ужо і тыдзень назад, палічыўшы з гарачкі, што альтанку зруйнаваў нейкі трагладыт. Цыбаты не быў трагладытам. Бо калі ўзяць, напрыклад, такую сучасную рэч, як магнітафон, дык трагладыт не меў пра яго ніякага ўяўлення. У Цыбатага ж магнітафон быў найноўшай маркі, і ўладаць ім мог толькі сучасны хлопец. Гэта адно, а другое... Ці меў трагладыт пачуццё гумару?.. У Цыбатага яно абудзілася вельмі рана, яшчэ ў чацвёртым класе. Было ў яго такое хобі: заскочыць у будку вулічнага тэлефона, трубку скоранька абарве—і ходу. Але ўсё мацней яму карцела пры гэтым і пажартаваць. І аднаго разу, перш чым тузануць за драцяны шланг, ён набраў «02» і загадна гукнуў у трубку: «Ану падаць сюды сто грамаў міліцыі!» Ён яшчэ не кеміў, што ў міліцыі могуць засекчы, з якога аўтамата ён звоніць, і дзівіўся, чаму яны так ахвотна з ім размаўляюць. Урэшце зладзеяватым рухам тузануў трубку ўніз — каб не ўбачылі з вуліцы, крутнуўся, каб выскачыць, ды перад шклянымі дзвярамі стаяла ўжо міліцыя, і не сто грамаў, як ён загадваў, а кілаграмаў семдзесят — сяржант з партатыўнай рацыяй. Казырнуў і павёў да сябе ў аддзяленне. Туды ж паклікалі і бацьку. Канечне, там, пры бацьку, яго ўшчувалі: маўляў, памірае чалавек, трэба выклікаць хуткую дапамогу, нехта ўскоквае ў тэлефонную будку, а ў ёй — абарваная трубка. Але потым яны сказалі, што будуць лічыць гэта прыкрым непаразуменнем, бо ў такога добрага бацькі не можа сын быць такім паганым. Бацька ж у Цыбатага ніякі не начальнік — просты рабацяга, але рабацяга, якога ведае ўвесь горад. І міліцыі, мабыць, было перад ім няёмка. Таму ўсё і скончылася лагодным смехам; маўляў, бацьку можна павіншаваць: у сына ад прыроды зайздроснае пачуццё гумару, бо не кожны дадумаўся б: «Падаць сюды сто грамаў міліцыі!» На тое ж, што гумар гэты быў нядобры, яны паглядзелі скрозь пальцы. А калі б яны так не паглядзелі і абышліся з ім трохі стражэй?.. Вельмі магчыма, што прыродная дасціпнасць Цыбатага, яго і тады ўжо не бяскрыўдны гумар не сталі б урэшце такімі глумліва-здзеклівымі, якімі былі яны цяпер. Цыбаты шмат ужо дзе пабываў, напрыклад, у Прыбалтыцы, і цяпер ён, спапяліўшы ў гэтым прыгарадным лесе альтанку і стаміўшыся ад марных заляцанняў да рыжай, ляжаў дагары ў палатцы, і ўжо не гумар, ужо д'ябальскі яго сарказм павінен быў спапяліць і самога лесніка, які там, ля вогнішча, патрабаваў ад яго нейкага адказу.

востра адчувацца праблема слухача. Тады, можа, перастанем мы «арганізоўваць» публіку, якая потым губляе ўсялякае жаданне трапіць на канцэрт яшчэ раз. Дарэчы, на канцэрты майстроў, якасць выканання якіх гарантавана іх рэпутацыяй, публіку «арганізоўваць» не трэба.

Сёння ў рабоце са слухачом, думаецца, самым важным паказчыкам мае быць не колькасць «валавай», выпадковай публікі, а кола сталых аматараў — наведвальнікаў канцэртаў. І я не сумняваюся, што кола гэта будзе пашыравацца незалежна ад прададзеных філарманічных абанементаў, калі формы прапаганды будуць удасканальвацца, калі мастацкі ўзровень канцэртаў заўсёды будзе на нязменнай дастойнай вышыні.

Надзённая таксама праблема якасці запісу музычных твораў. Нас не могуць не хваляваць цяжкасці, з якімі сутыкаюцца ў гэтай сферы музычныя калектывы Дзяржтэлерадыё БССР. Цяжка лічыць нармальным такое становішча, пры якім запісы пэўных сімфанічных твораў на радыё залежаць ад «укамплектаванасці» ці «неўкамплектаванасці» аркестра належнымі музыкантамі. А гаворка ж ідзе пра аркестр, патэнцыяльныя магчымасці якога ў справе прапаганды музычных дасягненняў рэспублікі практычна бязмежныя! Шматлікія нараканні выклікаюць і тэхнічныя якасці трансляцый з канцэртных залаў.

У нас на радыё сёння няма эстраднага аркестра. Гэта прывяло ўжо да таго, што мы практычна страцілі сучасную беларускую эстрадную інструментальную музыку. І гэта ў той час, калі неабходнасць супрацьпаставіць заходняй эстрадзе сваю, нацыянальна адметную, як ніколі вялікая. Адсутнасць на радыё калектыву, аснашчанага сучаснай музычнай апаратурай, вядзе да парадаксальных з'яў. Для таго, каб запісаць высакаякасную фанаграму, кампазітары вымушаны далучаць да запісу музыкантаў з апаратурай, якія працуюць у аркестрах прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

Такое становішча на радыё і тэлебачанні, дзе запісы павінны быць эталонам мастацкай і тэхнічнай якасці, падаецца мне недапушчальным.

У ліку праблем, якія хвалююць Саюз кампазітараў БССР, — і праблема стварэння ў рэспубліцы Харавога таварыства, і пытанне адкрыцця ў Мінску Дома кампазітараў, і многія іншыя. Але ўсё ж галоўныя з іх — пытанні, звязаныя з узмацненнем ролі беларускай сур'ёзнай музыкі ў нашым жыцці, з уздымам яе мастацкага ўзроўню, а таксама ўзроўню яе выканання і запісу. Многае тут залежыць ад нас саміх, але не ўсё, на жаль, можна вырашыць сіламі толькі кампазітарскай арганізацыі. Без вырашэння ж гэтых пытанняў цяжка гаварыць пра якасныя змены і паляпшэнне форм нашай музычна-прапагандысцкай работы, пра павышэнне яе эфектыўнасці ў вырашэнні вялікіх і высакародных задач, якія ставіць перад намі час.

Усенародная падрыхтоўка да XXVII з'езда КПСС — сёння найважнейшая частка і грамадскага жыцця беларускай кампазітарскай арганізацыі. Усведамляючы ролю, якую адводзіць партыя творчым работнікам у справе фарміравання духоўнага аблічча савецкага чалавека, нашы кампазітары бачаць сваю задачу як у напісанні высокамастацкіх твораў, так і ў мэтанакіраванай рабоце па максімальным пашырэнні сферы ўздзеяння музычнага мастацтва.

Яскравы прыклад такой работы — праведзены сёлета ў Гомелі выязны пленум праўлення Саюза кампазітараў БССР па праблемах развіцця масавых жанраў у сучаснай беларускай музыцы, прысвечаны XXVII з'езду КПСС. Каля чатырох тысяч слухачоў Гомеля мелі магчымасць пазнаёміцца на канцэртах пленума з лепшымі беларускімі творамі эстраднага жанру, створанымі за апошні час, сустрэцца з кампазітарамі і з любімымі выканаўцамі. І, відаць, лепшым пацвярджэннем неабходнасці такіх мерапрыемстваў былі канцэртныя аўдыторыі, якія не ўмяшчалі ўсіх жадаючых, і гарачы прыём выкананых твораў.

Аўтарскія канцэрты беларускіх кампазітараў, абменныя канцэрты з кампазітарскімі арганізацыямі братніх рэспублік, шматлікія творчыя сустрэчы, іншыя мерапрыемствы нашага саюза, спланаваныя насустрач XXVII з'езду КПСС, не могуць сёння нас задаволіць проста фактам іх выканання. Далучыць да гэтых мерапрыемстваў шырокае кола слухачоў, зрабіць іх падзеямі музычнага жыцця горада, рэспублікі — вось задача, да вырашэння якой паслядоўна імкнецца кампазітарская арганізацыя. Гэта наша работа, гэта наш уклад у вялікую агульнанародную справу, наша праца, скіраваная на фарміраванне сродкамі музычнага мастацтва рознабаковай і духоўна багатай асобы савецкага чалавека.

Уладзімір ДАРОХІН,
намеснік старшыні праўлення Саюза кампазітараў БССР.

НАШЫ ГОСЦІ

ДЗЯКУЙ ВАМ, ЛІТОЎСКІЯ МАЙСТРЫ!

Дзейнасць славутага Літоўскага камернага аркестра пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР прафесара Саўлюса Сандэцкіса — сёння неад'емнае звяно канцэртнага жыцця. Не так даўно калектыў удзельнічаў у фестывалі «Беларуская музычная восень». Пабываўшы на канцэртах, пагутарыўшы з дырыжорам, мы нібыта перагарнулі старонкі творчай біяграфіі аркестра...

Калектыў быў арганізаваны С. Сандэцкісам 25 гадоў назад з выпускнікоў яго камерна-аркестравага класа Літоўскай дзяржаўнай кансерваторыі і некалькіх калег — аднадумцаў маладога дырыжора. Дарэчы сказаць, тыя выпускнікі-студэнты ў свой час прыйшлі ў кансерваторыю з камерна-аркестравага класа Вільнюскай музычнай школы імя М. Чурлёніса, створанага 30 гадоў назад таксама С. Сандэцкісам.

Так! Дырыжор спярша арганізаваў школьны аркестр, праз два гады — студэнцкі, а затым — Дзяржаўны камерны, пры філармоніі.

На Міжнародным конкурсе маладзёжных аркестраў фонду імя Герберта фон Караяна ў Заходнім Берліне, дзе ўдзельнічаў студэнцкі калектыў С. Сандэцкіса, Караян, уражаны майстэрствам літоўскіх студэнтаў, сказаў: «Калі моладзь гэтак іграе, то за будучае музыкі няма чаго трывожыцца». А пра майстэрства Літоўскага камернага высока адгукаецца прэса ва ўсім свеце. Сёння ўсе тры «аркестры Сандэцкіса»—актыўныя ўдзельнікі музычных фестываляў у нашай краіне і за мяжой.

Як удалося гэта С. Сандэцкісу? Яго метад просты: праца, патрабавальнасць да якасці выканання, да творчай дысцыпліны і абавязковае дасягненне плёну. Ён аддае велізарную ўвагу рэпетыцыйнаму працэсу, псіхалогіі выканаўцы-аркестранта, выхаванню рэпертуарам, пазіцыі дырыжора-выхавацеля. Пастаянны яго клопат пра змену забяспечыў трывалы кадравы рэзерв Літоўскага камернага аркестра. У практыцы гэтага калектыву яшчэ не было ніводнага конкурсу; былі запрашэнні, дый толькі з ліку тых, хто «вытрымаў» аркестравую школу С. Сандэцкіса на ўсіх яе этапах.

Вядома, многія радасныя для літоўскага мастацтва падзеі непарыўна звязаны з імем С. Сандэцкіса, таленту і энтузіязму якога Літва абавязана росквітам камерна-інструментальнага выканальніцтва. Ды ён лічыць, што саматугам ці нават з групай аднадумцаў, без дапамогі і разумення кіраўнікоў навучальных устаноў, канцэртных арганізацый, кіраўніцтва рэспублікі не ўдалося б увесці розныя віды калектыўнага музіцыравання ў праграму музычнай адукацыі, а потым — і ў праграму эстэтычнага выхавання масавага слухача.

У Літве праводзяць квартэтныя фестывалі. Камерная музыка — паўнапраўная «ўдзельніца» ўсіх рэспубліканскіх святаў, юбілейных урачыстасцей. На канцэртах (бывае, і на рэпетыцыях) заўсёды прысутнічаюць высокія госці з урада рэспублікі. Такая ўвага жывіць энтузіязм музыкантаў, умацоўвае аўтарытэт іх прафесіі ў народзе.

Вось і вынікі: да арганізацыі камернага аркестра ў Літве музыкі для такога складу не было. Цяпер у рэпертуары калектыву каля 200 твораў! Адносіны ж С. Сандэцкіса і аркестрантаў да літоўскай музыкі можна назваць асабліва трапяткімі — як да нацыянальнай святыні. Якраз на адным з канцэртаў «Беларускай музычнай восені» (выконваліся «Тры танцы» Т. Макачынаса — першая п'еса, спецыяльна напісаная для аркестра, і «Дзукійскія варыяцыі» Б. Кутавічуса — адзін з найбольш адметных твораў сучаснай літоўскай музыкі) аркестр ярка выявіў нацыянальны лад душэўных перажыванняў, свой мастацкі свет. Важна, што гэта нацыянальна адметная музыка гучыць ва ўсіх канцэртных залах, дзе даводзіцца выступаць аркестру.

Музыка XX стагоддзя, зразумела, — цэнтр прыцягнення і для аматараў, і для прафесіяналаў. Клопат пра жывую творчасць сучаснасці — надзённы і для С. Сандэцкіса, які пашырае рэпертуар калектыву, звяртаючыся да музыкі кампазітараў Прыбалтыкі, Беларусі, Закаўказзя, Украіны... Не менш яркая старонка творчасці аркестра — інтэрпрэтацыя старадаўняй і сучаснай музыкі заходнееўрапейскіх кампазітараў. Вопыт паказаў, што сапраўды таленавітым творам сучасных аўтараў суседства вялікіх узораў мінулага — не ва ўрон, бо якраз падкрэслівае іх актуальны характар.

А ў трактоўцы класікі роўных літоўскім артыстам цяжка назваць. Яны не ставяць перад сабой стылізатарскіх задач, гэтаксама пазбягаюць архаізацыі і мадэрнізацыі, імкнуцца перадаць жыццёвую сілу, эстэтычную прывабнасць музыкі, створанай 250 гадоў назад.

Вядомы зальцбургскі крытык Х. Ройшэнбёк зазначае, што выкананне дывертысментаў і сімфоній В. Моцарта ў Зальцбурзе, на радзіме кампазітара, «можна лічыць не толькі рызыкай, але і выклікам». Але — «якое вялікае... было здзіўленне публікі, — піша ён, — калі загучаў Моцарт!» Крытык называе літоўскіх музыкантаў «сапраўднымі майстрамі, для якіх няма тайн у мастацтве».

Будзем шчодрымі і мы, далучыўшыся да ўзрушанага прыёму многіх аматараў музыкі. І выкажам літоўскім сябрам шчырую ўдзячнасць за цудоўныя імгненні сустрэчы з вялікім мастацтвам.

Э. ГАБРЫЭЛЯН.

«А што, я павінен маліцца на тваю альтанку?.. Ты паедзь у Прыбалтыку, там ты прыйшоў у лес, а на паляне ўжо гатовыя дровы — леснікі нацягалі. Таму што культура! А дзе яны ў цябе, твае дровы? Ні сухастою вакол, ні ламачча, дык буду я цацкацца з тваёй альтанкаю?..»

Цыбаты, вядома ж, разумеў, што глуміцца з Валодзі, глуміцца з чалавачай рупнасці, бо не для таго ж людзі рабілі гэту альтанку, каб ён пераварыў яе ў попел. Але гэтак жа як караед не быў бы караедам, каб не ўгрызаўся апантана ў кару, так і Цыбаты, напэўна, не мог ужо не глуміцца, і ён глуміўся, а глумячыся, яшчэ і нахабна апраўдваў сябе — так, напэўна, апраўдвае сябе караед перад дрэвам, якое точыць:

«А той, каторы ля вогнішча гыркае, ён, думаеш, лепшы за мяне? Ашчэрыўся: не чапай альтанку, яна ж, каб нехта мог пасядзець. Але я такі дэбіл, не бачу — начхаць яму на тваю альтанку! Проста ён шукае прычыну, каб прычапіцца. З-за гэтай нарэўлянскай мілэдзі. Сам жа мяне з ёй і пазнаёміў. А яна яму — гуд бай, дарагі. Над ёю ж дамоклаў меч — размеркаванне, а ёй ох як не хочацца вяртацца ў Нароўлю! Дык яна і ўзяла курс на гарадскога. Падатная была. Не тое што гэта рыжая: сцішылася ды нервова тузаецца, няйнакш, плача, нібыта яна нечым тут ахвяравала. А тая, ля вогнішча, здыхае ад рэўнасці папалам з нікацінам. Дык і не ў галаве ім таксама твая альтанка, ляснік. А калі ўжо яна так моцна рупіць табе самому — прыйшоў дакопвацца, дык зараз я цябе так пужну — мільганеш з другой касмічнай хуткасцю, гэта я ўжо табе абяцаю».

6

На паляне, крокаў за дзесяць ад вогнішча, расла тоўстая сасна. Цыбаты падабраў пад ёй пустую зеленаватую пляшку і, ёмка заціскаючы ў кулаку рылца, стаў біць сярэдзінаю пляшкі аб камель. Але тоўстая, парэпаная кара была што корак, і пляшка адскоквала з глухім гукам. Валодзя здагадаўся, што Цыбаты хоча яго папалохаць. Бачыў, мабыць, у кіно, як во так разбіваюць пляшку, і сам гэтак жа пагражае. Але дарма стараецца. Нават каб ён і напраўду кінуўся біцца, Валодзя і не падумаў бы ўцякаць. А то хай і было б напраўду. Бараніўся б, як мог, бо ці ж не той гэта выпадак, калі мо хоць трохі стала б сорамна Фамічу? Хай было б яму сорамна, калі не абышлося б без яго, Валодзевай, крыві. Служыў Фаміч у дэсантных войсках, там яго навучылі такому, што, казаў, выйдзе ў звальненне, дык хлапчукі становяцца ў чаргу, і ў кожнага па цагліне — гэта каб рабром далоні ён паперабіваў іх папалам — ім жа, малым, на ўцеху. І хто-хто, а Фаміч пакрышыў бы гэтага Цыбатага на капусту. Але ж знайшоў адгаворку: не магу ўжываць забароненыя прыёмы — даў падпіску. Не дзіва, што і ў горадзе так: нейкі жаўтароты хуліган вычварае, што яму ўздумаецца, а такія Фамічы абыходзяць смаркатае зло, як быццам усе яны далі некаму падпіску не крануць яго і пальцам.

Большая палова пляшкі нарэшце адскочыла — пырснула шклянне, і цяпер з кулака Цыбатага вытыркаліся няроўныя вострыя зубцы. Злавесна пасвечвала глянцавіта-блішчастае на зломах, чарнаватае шкло. Цыбаты адвёў руку понізу ўбок — даваў зразумець, што рыхтуецца да ўдару знізу. Ён яшчэ яго шкадаваў — не замахваўся зверху. Так ён палохаў, а ў гэту хвіліну да іх на паляну роспачна выбегла ад палаткі тая самая, падобная на рыжую ляльку, дзяўчына. Там, у палатцы, яна ці не плакала — на поўнай шчацэ ў яе Валодзя заўважыў вільготную кропельку. На нейкі міг яна здалася Валодзю той празрыстай кропелькай жывіцы, пра якую нядаўна казаў яму Фаміч.

Валодзя не варухнуўся, і гэта, мабыць, пачынала злаваць Цыбатага — аж неяк пашклянелі яго мутнаватыя вочы і скрывілася ніжняя сківіца. Рыжае дзяўчо нема ўскрыкнула ў яго за спіною, і тады Валодзя пачуў, як хлопец, што сядзеў ля вогнішча, стрымана, але строга, нібыта праз зубы, папярэдзіў Цыбатага:

— Не чапай лесніка, падонак, а то, як жабу, раздзяру, і некаму будзе паскардзіцца. Ты чуеш там? Кінь сваю цацку — пальцы парэжаш!..

7

Фаміч прынёс у цэлафанавым мяшэчку слоік куплёнага кампоту і, ставячы яго, разам з мяшэчкам, на тумбачку, прыстукнуў донцам. Гэта выдавала яго нецярплівы, «выхаваўчы» настрой. Але ж была тут бальнічная палата, і Фаміч узяў сябе ў рукі. Схіліўшы галаву, стаяў над Валодзевым ложкам — так звычайна стаяць над нябожчыкам. Але Валодзя не збіраўся паміраць. Цыбаты крыху падрапаў яму плячо ды рэбры, і ўрач абяцаў неўзабаве выпісаць.

— Ладна, папраўляйся, — уздыхнуў Фаміч. — А там будзем бачыць. Хаця што ж глядзець. Мы ўжо і самі з вусамі. А раз так, дык і нечага мне тут рабіць. Пайду. Бо да цябе тут чарга — з нейкай рыжай за халат пабіўся. Хоць бы дзеўку путную выбраў, а то... шмакадзяўка, зірнуць няма на што!..

— Ідзі, Фаміч, ідзі, — не стаў яго вельмі трымаць Валодзя. — З табой мы яшчэ як-небудзь пагаворым.

Акакій ЦЭРЭТЭЛІ

У Тбілісі, на крутабокіх схілах Мтацмінды, у пантэоне славутых людзей Грузіі ёсць звычайная магіла, на сціплай мармуровай пліце якой выбіта адно толькі слова: «Акакій». І нікому не трэба тлумачыць, хто ляжыць пад гэтай плітою, бо кожны грузін ведае, што чалавек, якога так даверліва называюць толькі па імю,—слыннейшы паэт гордых гор і такога ж гордага народа Акакій Цэрэтэлі.

Сын князя і пясняр рэвалюцыі, ён меў найвялікшую папулярнасць сярод сваіх сучаснікаў: яго партрэты віселі як не ў кожным грузінскім доме, яго ведалі і праўда, здаецца, усе—і старыя, і малыя.

Сам ён адчуваў гэта, а часам і, нібыта прыемна здзіўлёўшыся, згадваў сёе-тое ў сваіх запісах.

Аднойчы паэт ішоў па Фрэйлінскай вуліцы Тбілісі. Насустрач, перавальваючыся з нагі на нагу, тэпаў з нянькаю малы. Убачыўшы Цэрэтэлі, ён узрадаваўся, твар яго расплыўся ў шчаслівай усмешцы. Хлапчук тыцнуў у паэта пальчыкам і, яшчэ не ўмеючы добра гаварыць, пралепятаў: «Эй, Акакій!»

Малы, як высветлілася пасля, пазнаў Цэрэтэлі па партрэце, які вісеў у іх доме.

«Я не абдзелены ўвагаю і спачуваннем грамадства,—успамінаў пра той выпадак паэт,—хто зліча, колькі апладысментаў наслухаўся я ў жыцці, колькі прыемнага бачыў я на свеце! Але ніколі я не адчуваў таго, што далі мне адчуць лепятанне гэтага малога і працягнуты да мяне пальчык».

Слава паэта і яго папулярнасць не зацерліся ў мінулым, яны ўстойліва прыжыліся і ў нашым часе.

Даўно, з самага першага ўзыходжання на Мтацмінду мяне, як мара і як абавязак, непакоіла спакуслівае жаданне даць магчымасць гэтаму мудраму грузіну загаварыць па-беларуску.

Тым часам з'явілася і нагода — у нас у рэспубліцы рыхтуецца двухтомная анталогія грузінскай паэзіі ў перакладзе на беларускую мову. І я, маючы перад сабою падрабязны падрадкоўнік, успамінаючы арліна-горную мову сяброў, паспрабаваў пазнаёміць сваіх чытачоў з гэтым выдатным грузінскім паэтам.

Янка СІПАКОЎ.

Амірані

Да скалы каўказскай моцна
Быў прыкуты Амірані,
Груганнё над ім кружыла
І садзілася на раны.

Падарыў агонь ён людзям —
Таму злыдні цела рвалі,
Ды без лекаў, нейкім дзівам
Раны самі зажывалі.

Ён умеў цярпець нягоды,
Не укленчваў прад бядою,
Перад сілаю варожай
Не схіляўся галавою.

І нарэшце — перамога!
Кожны смелы — з ёю будзе.
Ён у спадчыну, як прыклад,
Перадаў адвагу людзям.

Мая Грузія прыкута
Да скалы, як Амірані,
Груганнё над ёю кружыць
У чаканні, у чаканні...

Ды часіна волі прыйдзе,
Ланцугі парвём і путы.
Зноў там радасць засмяецца,
Дзе журыліся пакуты.
1883

Песня Натэлы

Струны ўмела на чангуры
Я для песні навяла,
І яны зноў загучалі:
«Адэла-дэла-дэлала!»

На свой гук і на свой голас,
Але ўсе звіняць у лад,
Дружна ў злагадзе спяваюць:
«Адэла-дэла-дэлала!»

Хоць адна струна парвецца —
Трэба помач каб прыйшла,
Бо спяваць чангуры вечна:
«Адэла-дэла-дэлала!»

А чангуры — Сакартвела,
Быццам Грузія сама,
Ну, а мы як тыя струны:
«Адэла-дэла-дэлала!»

Ды паслаблі раптам струны,—
Бы паменела святла,
А ў цямрыні як спяваць нам:
«Адэла-дэла-дэлала!»

Бы шакал, пракраўся вораг,
Нарабіўшы многа зла,
Нас не так спяваць змушае
«Адэла-дэла-дэлала!»

Трэба жыць усім у згодзе,
Каб пазбавіцца сіла.
Чаму ж мы спяваем поразь
«Адэла-дэла-дэлала!»

Хай бы еднасць — наша сіла —
Хціўцам вісельняй была.
Хай баяцца нашай песні:
«Адэла-дэла-дэлала!»

Хопіць плакаць! Усе струны
Я слязамі заліла.
Не магу праз плач спяваць я:
«Адэла-дэла-дэлала!»
1897

Кінжалу

Харасанскі мой кінжал,
Дружа мой, люблю цябе я!
Збавіць ад варожых жал —
Ты адзіная надзея.

Я вастру цябе, або
Чышчу, каб срабрыўся болей.
Стань жа братам і рабом
Тым, хто ўніжаны няволяй!

Востры, ты гатовы ў бой,
І няма табе заганы.
Ты стальному сэрцу свой
І руцэ стальной адданы.

Слава кавалю таму,
Што цябе скаваў так чынна!
Дружа мой, рыдаць прымусь
Маці ворага па сыне!

Колькі ворагі раней
Выпіць змусілі заразы.
Палячы, кінжал, мяне
Ад прыгнёту і абразы!

Паміж ім і мной жыві,
Выклік кінь ягонай сіле.
Памакну цябе ў крыві,
Быццам бы пяро ў чарніле.

Кроў чырвоная маю
Сівізну няхай акропіць.
Стогн варожы у баю
Нібы музыка захопіць.

Я вастру цябе, кінжал,
І вучу блішчэць трывожна.
Хопіць, дружа мой, ляжаць —
Час настаў, выходзь жа з ножнаў!
1882

Світанне

Задуменная Мтацмінда
Зорку раннюю вітае,
Што над слыннаю магілай
Гэтак ласкава світае.

Слухае гара, прыціхшы,
Як Кура бесперастанку
Нескаронаму герою
Напявае калыханку.

Да грудзей Мтацмінда туліць
Дарагую нам магілу,
У якой яна люляе
Сына бацькаўшчыны мілай.

І паэт, у хваляванні
Азірнуўшы наваколле,
Да сваёй радзімы любасць
Гэткай песняю спатоліў:

«Край, дзе неба — з бірузою,
Дзе зямля — смарагд адвеку,
Да цябе прыйшоў я хворы,
Ты сустрэў мяне, як лекар.

Не, не вынес я расстання.
Без цябе — мы ўсе сіроты.
Я спяшаўся цябе ўбачыць,
Натаміўшыся самотай.

Я вярнуўся. Мне насустрач
Твае сонца, месяц выйшлі,
Карагоды яркіх зорак
Расквітнелі ў небе пышна.

Радасць сэрца паланіла,
Знік мой сум, не стала жалю.
Ажывіў, мой краю, кветкі,
Тыя, што даўно завялі.

Край, дзе неба — з бірузою,
Дзе зямля — смарагд адвеку,
Твой я, і ў тваіх абдымках
Дай памерці чалавеку.

За цябе памру, мой краю, —
Не кідай, прашу, мяне ты,
Ты накрый мяне сабою
Па старому запавету.

Пахавай мяне, мой краю,
У сваёй зямлі ласкавай,
Там, дзе неба — з бірузою,
Дзе нібы смарагды — травы».
1892

Суліко

Я магілу мілай шукаў,
Толькі не знаходзіў навакол.
Доўга плакаў, суміўся, гукаў:
«Дзе ж ты, дарагая Суліко?»

Я заўважыў ружу між шыпоў —
Век не бачыў вабнасці такой.
Да яе ў трымценні падышоў:
«Ці не ты мая Суліко?»

Кветка невыказнае красы
Нахіліла ў згодзе галаву,
І як слёзы, пацеркі расы
Пырснулі ў зялёную траву.

Салаўя убачыў праз лісты
І патурбаваў яго спакой,
Я спытаўся ў птушкі: «Ці не ты,
Ці не ты мая Суліко?»

І ў адказ пачуў ласкавы спеў
Ціхага дагэтуль салаўя,
Быццам бы сказаць ён мне хацеў:
«Хіба ты не бачыш — гэта ж я!»

Зорка ззяла светла нада мной,
Лашчыў я святло яе рукой.
Запытаў, любуючыся ёй:
«Ці не ты мая Суліко?»

І яна мігнула мне ў адказ,
Промнямі пагладзіла мяне.
І якраз у гэты самы час
Ветрык мне на вуха зазвінеў:

«Тое, што шукаў, ты ўжо знайшоў —
Удыхні, паслухай і зірні.
Ты знайшоў яе — і боль прайшоў,
Хай цяпер твае святлеюць дні.

Стала ружай, зоркай, салаўём
Тая, што пяшчотна ты кахаў,
Не, каханне шчырае тваё
Не зацёрла чорная туга».

Зразумеў я гэты запавет
І не праклінаю я свой лёс,
І ўжо больш не скарджуся на свет,
І не праліваю болей слёз.

Ружаю журбу сваю лячу,
Слухаю, шчаслівы, салаўя,
Радасны, за зоркаю сачу, —
І нібыта зноў з табою я.

Зноў мне стала хораша ў жыцці —
Я знайшоў цябе праз боль вякоў:
Гэта ты спяваеш і мігціш,
Водарыш, як ружа, Суліко!
1895

●

Малады быў, мары песціў,
Сэрца білася старанна,
Я чакаў, не дачакаўся,
Неспатолены, кахання.

Як састарыўся, знясілеў,
Да маршчын дажыў на твары,—
Мяне любяць ці не любяць,
Мне ўсё роўна ужо зараз.

Беднасць гналася за мною —
Пра кавалак хлеба марыў.
Будзе скарб, альбо не будзе,
Мне ўсё роўна ужо зараз.

Сябраваць хацеў з людзьмі я,
Ад мяне яны — як хмары.
Будзе сябра ці не будзе —
Мне ўсё роўна ужо зараз.

Крыўды горкія зазвычай
Нада мной віселі карай.
Будзе слава ці не будзе —
Мне ўсё роўна ужо зараз.

Шапкаваў я дапамогі,
А атрымліваў удары.
Як памру, ці будуць плакаць,—
Мне ўсё роўна ужо зараз.

Лёс — пракляты, сэрца — рана,
Сівізна душу мне старыць...
Буду жыць, такі ці не я,—
Мне ўсё роўна ужо зараз!
1893

Кансультацыя УААП

АЎТАРСКАЕ ПРАВА ЎКЛАДАЛЬНІКАЎ ЗБОРНІКАЎ

У якім аб'ёме распаўсюджваецца аўтарскае права на ўкладальнікаў зборнікаў?

Г. М. СТРУКАЎ.

Творчая дзейнасць укладальнікаў зборнікаў выражаецца ў падборы матэрыялаў, іх класіфікацыі, размяшчэнні паводле пэўнай сістэмы (тэматычнай, храналагічнай), а ў некаторых выпадках—і ў адпаведнай тэксталагічнай апрацоўцы матэрыялаў, якія ўключаюцца ў зборнік. У выніку гэтай дзейнасці ствараецца самастойны аб'ект аўтарскага права—новы твор у выглядзе сістэмы размяшчэння матэрыялаў. Толькі на гэтую сістэму, на падбор твораў распаўсюджваецца аўтарскае права ўкладальніка. Яно не распаўсюджваецца на асобныя творы, якія ўваходзяць у склад зборніка, нават калі гэтыя творы не ахоўваюцца аўтарскім правам.

Такім чынам, укладальнік з'яўляецца суб'ектам аўтарскага права і карыстаецца ўсім комплексам аўтарскіх правамоцтваў, як і ўсе іншыя аўтары—паэты, перакладчыкі, мастакі.

Закон прызнае аўтарскае права за ўкладальнікам незалежна ад таго, што ўключаемыя ў зборнік творы наогул не з'яўляюцца прадметам аўтарскага права, або не ахоўваюцца аўтарскім правам з выпадку заканчэння ўстаноўленых тэрмінаў ці не падлягаюць ахове па тэрытарыяльнасці.

Калі ў зборнік уключаюцца творы, якія не з'яўляюцца прадметам чыйго-небудзь аўтарскага права (законы, судовыя рашэнні, іншыя афіцыйныя дакументы, творы народнай творчасці, аўтары якіх невядомы, старажытныя акты і помнікі і да т. п.), для ўзнікнення аўтарскага права дастаткова падвергнуць іх самастойнай сістэматызацыі або апрацоўцы. Калі ж для зборніка выкарыстоўваюцца творы, якія належаць каму-небудзь на праве аўтарства, неабходна, акрамя самастойнай сістэматызацыі або апрацоўкі, захаваць правы аўтараў гэтых твораў (атрыманне згоды на ўключэнне твора ў зборнік, спасылка на аўтара і да т. п.).

Як ужо гаварылася, аўтарскае права ўкладальніка распаўсюджваецца на зборнік як на сістэму размяшчэння твораў, якія ўваходзяць у зборнік, а не на самі творы. Закон не забараняе іншым асобам выкарыстоўваць тыя ж самыя творы для стварэння новых зборнікаў. І калі гэтыя асобы падвяргаюць творы самастойнай апрацоўцы або ствараюць уласную сістэму іх размяшчэння, яны самі становяцца суб'ектамі аўтарскага права.

Заслугоўвае ўвагі пытанне аб аўтарскім праве ўкладальніка, які з'яўляецца штатным работнікам выдавецтва.

У адпаведнасці з загадам Дзяржкамвыда СССР № 190 ад 5 мая 1985 г. не дапускаецца заключэнне дагавора і выплата ганарару штатным работнікам выдавецтва за рэцэнзаванне і рэдагаванне твораў у выдавецтве, дзе яны працуюць. Што ж датычыць укладання зборнікаў, то ў такіх выпадках, гэтак жа, як і пры выкананні іншых арыгінальных (творчых) работ, з дазволу дырэктара выдавецтва можа быць заключаны выдавецкі дагавор са штатным работнікам пры ўмове, што работа выконваецца не ў рабочы час і без шкоды для выканання ім сваіх прамых службовых абавязкаў.

Размер аўтарскага ганарару і парадак яго выплаты ўкладальнікам зборнікаў устаноўлены пастановай Савета Міністраў БССР ад 28 красавіка 1977 г. № 129 «Аб стаўках аўтарскага ганарару за выданне твораў навукі, літаратуры і мастацтва». У адпаведнасці з пунктам 1.4 гэтай пастановы ганарар выплачваецца з улікам таго, якія творы ўключаюцца ў зборнік. Так, за зборнік літаратурна-мастацкіх матэрыялаў, пры іх навукова-тэксталагічнай падрыхтоўцы, выплачваецца ад 20 да 50 рублёў за адзін аўтарскі аркуш. Пры выкананні такой работы ў адносінах да твораў іншай літаратуры (акрамя мастацкай) размер ганарару складае ад 15 да 40 рублёў за аўтарскі аркуш.

Калі ўкладальнік зборніка з'яўляецца адначасова аўтарам якіх-небудзь раздзелаў або матэрыялаў зборніка, то ганарар за ўкладанне гэтай часткі зборніка яму не выплачваецца.

Пры перавыданні зборнікаў ганарар выплачваецца ў тых жа размерах, што ўстаноўлены для аплаты перавыдання твораў, якія ўваходзяць у зборнікі. Напрыклад, за трэцяе выданне літаратурна-мастацкіх твораў выплачваецца 60 працэнтаў, а твораў палітычнай, навуковай, вытворча-тэхнічнай і іншай літаратуры—50 працэнтаў стаўкі, прадугледжанай для аплаты першага выдання.

Аднак трэба мець на ўвазе, што за выданне зборнікаў ганарар выплачваецца незалежна ад тыражу. Напрыклад, аўтару аповесці, упершыню апублікаванай у зборніку, які выйшаў на беларускай мове тыражом 12 тысяч экземпляраў, будзе выплачаны ганарар за два выданні (100 працэнтаў за першае і 60 працэнтаў за другое), бо перавышана норма тыражу, якая для твораў мастацкай прозы складае 6 тысяч экземпляраў. Укладальніку ж гэтага зборніка будзе выплачана толькі 100 працэнтаў стаўкі, прадугледжанай для аплаты зборнікаў.

Пры стварэнні зборніка некалькімі ўкладальнікамі ўзнікае сааўтарства. У такім выпадку аўтарскае права на зборнік належыць усім сааўтарам сумесна і адносіны паміж імі (напрыклад, па пытаннях апублікавання, размеркавання ганарару) вызначаюцца іх пагадненнем.

С. ШУСТ.

Фёдар ЯНКОЎСКІ

У дарозе. У жыцці

Званкі

Былі мне ў той дзень званкі. Не сотні іх. Яны — небесерапынныя — з кароткімі ці даўжэйшымі перапынкамі, паўзамі-спакоем.

Хто званіў пра завітанне, пра сустрэчу, хто — з сяброўскім паклонам і з даведкаю-просьбаю прабачыць, што і сёння заняты... хто пераказваў паклон і прывітанне ад іх — з вайны сяброў, саміх паплечнікаў.

— Пазналі? Аляксандр. Ну, Алік! І Андрэйка са мною. Мы едзем.

— Я не адважвалася званіць. Але ў мяне ў гасцях бабка-бабуля. Паказвала мне вашу — ёй — паштоўку. І яе на вас крыўдачку скажу... — Апошнія словы казала з жартам: даўнавата наведваў бабулю, забыўся на смак-смакату яе вяндліны, яе вяршкоў — такіх, што ў Мінску і за золата не пакаштуеш...

— Гэта я, Васіль Міхайлавіч, — чую словы з выразным рускім, як кажуць, акцэнтам.— Прыехаў у «Крыніцу». Падлечваюся.

Я перапытваю: «Хто-хто?»

Кажу і прашу па-мужчынску, «не рассыпаючыся ў просьбах». Хачу і трэба ўбачыцца, пасядзець. Падказваю, што да мяне ад «Крыніцы» толькі дзесяць кіламетраў, жыву каля «Алесі». А Васіль Міхайлавіч, той дарагі рускі інтэлігент, мой незнаёмец, які, прачытаўшы дзве мае кніжкі на беларускай мове, прасіў пісаць яму, «уже старику русскому», «даўняму аграному і заатэхніку», — прасіў пісаць яму так, як пішу ўсё жыццё: па-беларуску. Ён жыў і працаваў у суседняй з маім родным Клетным вёсцы Пад'елле, дзе група хлебаробаў і аграномаў «рукамі на самой зямлі, у самой зямлі» шукала палепшання гатунку аўса, ячменю, пшаніцы, проса... А Пад'елле? Дам даведачку: радзіма пісьменніка Аркадзя Марціновіча. Працаваў Васіль Малкоў у Пад'еллі яшчэ ў трыццатых гадах, потым быў шмат дзе на свеце (то камандзіроўкі, то — самой зямлі і людзям — служба, то — само войска, вайна). За гады і гады, як казаў і пісаў мне, душы нідзе не было цяплей, смачней, прыгажэй, чым у Пад'еллі, з пад'ельцамі, чым з імі, з касцамі, з брыгадзірамі, з дрывасекамі, з гадавальшчыкамі табуноў, вялікіх і сытых, жывога, жыўнасці.

— Пад'елле, казаў, — гатовая школа працавітасці, шчыравання на працы; яна, пад'ельская жывая школа, — не на адзін раён.

Я слухаў. І як? Чутае — не толькі дарагое мне і неацэннае. З Пад'елля родам мая мама.

У хаце ў мяне Таня

Званок. Не які асаблівы. Але з першых слоў нібы нясмелы, «вельмі прабачальны»:

— Гэта я — Таня... Ну, што была Таня Сіняк, а тады — Таня Калабан. Голасу не пазналі? Можна зайсці да вас сёння? На трошкі...

Зайшла Таня ў хату не адна. З дзецьмі.

Зайшла радая: сустрэча!.. Сама сустрэча — сама радасць. Дый яны ж з ёю... І неспакойная.

Слоў мала. Нібы асцерагаецца: ці ж усякае яе слова выкажа тое, што на душы. Таня ці не баіцца, што можа сказацца слова не з далікатнасцю.

Прысела. І за хвіліну перамянілася...

Таня не магла стрымацца — задумалася. І са смуткам глядзяць яе вочы. Таніну перамену тую засведчыў тады ж і выказаў сам фатаграфічны апарат, на паперы. На гэтым здымку...

Здымак — трое

Не раз глядзеў я на гэты здымак пасля. Магчыма, смутак і тая хуткая перамена, тая задумлёнасць з'явіліся спачатку на маіх вачах, з'явіліся і ці не перадаліся Тані: пранесліся, успыхнуўшы, як маланкавыя, успаміны, праляцела імгненнае, самою маланкаю вяртанне ў даўняе, у вайну. Успомнілася Таня даўняга часу, з вайны... Успомнілася не толькі Таня.

З таго даўняга

Таня ў полі на дарозе... На яе трынаццатым гадку... І не адна.

Толькі гэта «не адна»... Якое яно балючае «не адна»... І якое яно — на жыццё! на само жыццё!

Не злазячы з каня, глядзеў на поле, на хмызнякі і на далёкія і далекаватыя купкі лесу на ўзгорках, на хутары і пасёлкі ўзгоркаватай падмінскай зямлі. Глядзеў? Бачыць трэба! Што блізка, што далей ад цябе. Сама патрэбная пільнасць. Разведчыкі.

Там, далей, — не адзін фашысцкі гарнізон. Можа, убачыцца і той наш дарагі падпольшчык, што павінен быў прыйсці, але няма яго. Могуць убачыцца, могуць з'явіцца ўзвод ці рота іх, чужынцаў, ды на машынах.

Заўважаю, але ніяк не разбяру: што там, за кіламетр ці крыху болей ад Лекараўкі? Нешта ёсць, на дарозе. Нешта каляін, ні ямінак, а толькі нібы рассыпаны і разраўняны пласт пылу. Па дарозе, бачыў не раз, ганялі на пашу, на вадапой статак, які капытамі раўнаваў тую дарогу. Нібы сам статак пакрыў яе мяккім, што мука, пылам.

Ні весці за ручкі, ні несці на сваіх руках, ні везці, пасадзіўшы на сядло, адразу дзвюх я не мог. Зірнуў у бок Лекараўкі. Адтуль — дапамога, два разведчыкі на конях.

Сястрычкі

Тані былі тады лічаныя месяцы на трынаццаты гадок.

За два дні да сустрэчы сястрычак на дарозе з Мінска ў Лекараўку фашысты зрабілі налёт на сям'ю, на сядзібу падпольшчыкаў — краўца Андрэя Сіняка і краўчыхі, жонкі яго Надзі Сінячыхі. Дзяўчынкі паспелі схавацца ў гародзе. У густым лапушыстым гарбузніку, у высокім кіяшніку.

Што з татам, што з мамаю, дзеці не ведалі. Двое сутак прахаваліся яны між людзей. Хавалі іх, прытулілі іх людзі. І сказалі дзецям: маму з накінутымі жалезнымі наручнікамі фашысты пасадзілі ў машыну, павезлі пад вакзал ці туды, дзе мінская турма; таты не стала, ніхто не ведае, дзе ён. Дзеці не павінны заставацца дома.

Трэба было ратаваць дзяцей. Трэба было ратавацца самім дзецям...

Яшчэ дзіця, Таня, — памагатая партызанскіх сувязных, памагатая і памочніца падпольшчыкаў. Ратавалася і ратавала сястрычку-двухгодачку.

Ачнулася Таня ў лекараўскай хаце, глядзела на тых, хто быў пры ёй. Узіралася ў твары Ганны Быстрык, Рыгора Сташкевіча, Валодзі Жукоўскага. Бачыліся, калі яны прыязджалі — не ўсе разам — у Мінск ці пад самы Мінск. Заданні ж. Арганізацыя абавязковага кантролю: што і якое везлі акупанты праз станцыю Мінск з захаду на ўсход, туды, дзе фронт; што і якое везлі, перакідвалі з фронту з-за Оршы на захад. Не драбніцы, не якая-небудзь, ат, цікавостка: перакідаюць войска, тэхніку не на забаву. Трэба ведаць, трэба разведаць, каб час ад часу праверанае і пацверджанае — браў на сябе гэты клопат камісар партызанскай брыгады «Штурмавая» Ілья Фёдараў — перадаваць (радыё, рацыя) на Маскву, самому камандаванню сіл ратунку радзімы, сіл знішчэння фашызму.

Было не раз, калі Таня рабіла тое і такое, чаго не мог зрабіць дарослы. Яна, як пчолка, вывіваючыся і падскокваючы, то падавала некаму запіску, то прыносіла яе ад салдатаў і афіцэраў — славакаў, мабілізаваных фашыстамі і прыгнаных на барацьбу з беларускімі партызанамі, з беларускімі падпольнымі антыфашысцкімі групамі. Трынаццаць славацкіх хлопцаў, пры Таніным удзеле, на сходзе лета і пачатку восені, у верасні тысяча дзевяцьсот сорак трэцяга года, перайшлі ў лясныя салдаты, сталі партызанамі атрада «Грозны» брыгады «Штурмавая».

Дванаццаць гадоў — яшчэ толькі час, толькі гадочкі рабіць і ляльчыць лялькі, вучыць іх... гаварыць, хадзіць, рабіць спектаклі... А Таня ў атрадзе «Грозны». То пры параненых, то на кухні, то мые бінты... А потым — памочніца разведкі, памагатая разведчыкам. «Асвойвае» яна дарожкі і сцежкі ад вёскі да вёскі.

«Ідзі, Танечка, па дарозе, гуляй... ні на што доўга не ўзірайся, каб не ўгадалі, хто ты, што і чаго табе трэба. Паглядзі, ці багата іх, фашыстаў, між Удранкаю і Радашкавічамі, што робяць яны там».

Такое і іншае чула, такое і іншае рабіла Таня на сваім трынаццатым гадку.

Усё адно як пасталеўшы на цэлы дзесятак, Таня спраўлялася нібы з дробненькімі задачамі і заданнямі, з якімі цяжка або не выпадала справіцца і мускулістаму, дужаму. Яна — памочніца. Яшчэ і яшчэ раз, зноў і зноў — памагатая разведчыкам. Паглядзець, убачыць, вярнуцца, расказаць пра той рух акупантаў-фашыстаў, пра іх нацэленасць, пра іх зборы: куды, у які бок; пра далучэнне да гарнізона новых груп акупантаў або вываз некуды тых, што тут адкормліваліся...

Праз гады. Успаміны

Таня ўспамінае за сталом. Успамінае коратка і (гэта — не дзіва) без сувязі, без стройнасці. Пра некага ці пра нешта спытаецца, пра некага ці пра нешта скажа. То ўсмешка, то дрогне (ужо не раз сёння) яе тонкі чысты голас, змахне слязу... Несла... Не вельмі ведала, куды... не ведала, дзе яе тата, дзе яе мама... Пранесла тады сястрычку праз чатыры фашысцкія пасты. Перад Лекараўкаю ногі не маглі ўжо трымаць, несці і самую сябе...

Ажыўляецца. Шчасліва свецяцца яе вочы.

— Я не забылася, можа, толькі год ці помню. Прыязджаў Ян-Янка і прыходзіў з жонкаю да нас і да вас. Да вас не ў 1967? Тады на вашым стале я ўбачыла такое, што ці не адно аднюткае на свеце... Яно, тое на стале, свяцілася, на ім выгравіраваныя словы самі чыталіся мне...

Гэта — пра запальнічку. З трафейнага нямецкага снарада, з яго гільзы. Узялі грозненцы ў баі каля вёскі Буцькі гармату, узялі снарады, гільзы снарадныя. Залатыя Янавы рукі — запальнічка з гільзы снараднай. Без інструментаў, без электрычнага току, без абсталявання... Душа, рукі — усё, што было ў славака Яна Босака. У душы, у руках — яго майстэрства. Гэта — не які там з кіёска значок. Выштукаваны Янавымі-Янкавымі рукамі ў зямлянцы пры крынічнай беларускай Удры недалёка ад вёсак Маныпы, Даўбарова, Пральня непаўторны і неацэнны дарунак-гасцінец. Трывалы і прыгожы. На векі яна, запальнічка, — знак, сімвал, сведка сяброўства, дружбы, абавязковых, абавязкова патрэбных чалавецтву, свету людзей.

Таня зноў задумалася. І зноў ажыўляецца, весялее.

Лёгка ўгадаць: цэліцца нешта дадаць. Пайшла за сталом размова. Зноў пра іх, славакаў і чэхаў, што былі сярод нас, беларусаў, з намі, беларусамі. Устаюць яны і перад маімі вачамі. То на Мінскай вуліцы, то на ўскраіне Мінска, то недалёка ад Мінска ў хмызняку, то ў самім лагеры «Грознага», то ў баі каля Даўбарова, Слабады, Слабодкі, на берагах Удры. Там, дзе сустракаліся.

Бяжыць дзеўчанятка не азіраючыся, бяжыць падскокваючы, нібы толькі адно ў дзяўчынкі: «Мне весела! Каб гуляць і нагуляцца!..» Нясе яна запіску — вузкую і кароткую, нібы шматок каснічка на ляльку.

(Працяг на стар. 14—15).

Быў у нас, у разведчыкаў, неспакой і клопат. Учатырох прыскакалі ў вёску (пачуй, чытач, яе назву!) Лекараўку, што недалёка ад Купалавых Акопаў, ад Бясядаў і ад Карпілаўкі Ядвігіна-Лявіцкага. Ад Лекараўкі да Мінска, да пачатку самой Пярэспы, — трэць-трацціна сотні, якраз трыццаць тры кіламетры. Прыехалі — было ўжо за поўдзень. Той мінчук, з якім у Лекараўцы мелася быць чаканая і абавязковая сустрэча, не прыйшоў. Данёсся толькі сігнал: перадала сама падпольная «лінія перадачы», «з вуха на вуха»: «Пастараюся прабрацца ў Лекараўку сёння пад самы вечар, а не — на другі дзень, раніцою».

То — чакаць. Спазняецца, а нам чакаць. Чаканне будзе спакойнае? Не вельмі! Чаканы — не які маруда, а чалавек са спрытам, з рухавасцю, з кемлівасцю. І ні сама натура мая, і ні мабілізацыя волі на вытрымку не выручалі: Мінск жа... Там і падполле антыфашысцкае, там і ганчакі, вылюдкі ўсякія.

Праўда, прасцей, чым мне, чакаць ім, тром разведчыкам, што разам са мною прыехалі ў Лекараўку. Тут, у Лекараўцы, яны—свае сваятычы; тут жывуць іхнія свае сваятычы: мама і дзве сястры, пляменнік і пляменніца аднаго — юнага разведчыка Валодзі; жонка, двое дзетак і цешча ўжо сталага мужчыны настаўніка Сымона Смірнова; тут жонка і дзеці, бацькі і сёстры ўчарашняга разведчыка, а сённяшняга інструктара падпольнага райкома Рыгора Сташкевіча. Усе тры разам і кожны з іх клікалі мяне: «Пайшлі!» «Са мною!» «Пайшлі з намі — хоць бы з кім». Я ні да кога не пайшоў: ужо не раз тут — ці ў аднаго, ці ў другога — снедаў ці палуднаваў або вячэраў, прымаў падараваную чыстую хусцінку ці новыя або наладоненыя рукавіцы... А я — нікому з іх ні сват ні брат, нікому з іх ні бацька хросны і ні хрышчонік. Тут, на Міншчыне, у мяне ні радні, ні якіх іншых сваякоў...

Застаўся я на чыстым, як вытачаным, жывым і нейкім надзвычайна вясёлым узгорку пры вёсцы. З гэтага ўзгорка бачылася кіламетры на два ўшыркі і ўдоўжкі поле; злева і справа ад поля — негустыя хмызнякі, такія самыя яны і далей за полем, якое неяк мякка, мала прыкметна рассцілалася і спускалася ўніз, на поўдзень ад Лекараўкі, туды, у той бок, дзе не вельмі блізкі і не далёкі Мінск.

Незвычайнае... А што? Што там такое?..

Стой-стой... Дзён за пяць да гэтага дня пачулі мы: фашысты выхваляліся, лістоўкі раскідалі, а ў іх пісалі і навіну «распускалі»: вынайшлі такія знішчальныя машыны, якія могуць рухацца без рулявога; машыны, якія ўмеюць самі абыходзіць дрэвы, кусты, самі ўмеюць ісці на любое жывое — на людзей, на коней, самі і ўзрываюцца. Разведчыкі тады скемілі: выдумка, чарговы авантурызм і нялюдскасць, застрашваць людзей, не даваць людзям спакою там, дзе яны, фашысты, хадзіць і ездзіць баяцца, а калі адважваюцца, то да зубоў узброеныя, насцярожаныя і з раптоўным знішчальным налётам. Пушчанае гэтакае — фашысцкія «дзейкі» — яшчэ адна, даўно не першая, выдумка палохаць людзей, нерваваць іх. Але спакойна назіраць і варажыць не мог. Што варушыцца там? Што на дарозе?..

А там? Здаецца, не якая машына, выкаваная на заводзе. І не фігура людская. Ледзь прыкметна падавалася невядомае, загадкавае сюды, на Лекараўку.

Ускрайкам хмызняку асцярожнаю рыссю я паехаў туды на загадку.

Было там не проста нечаканае. На дарозе — дзве дзяўчынкі. Большанькая і меншанькая. Ці здалося мне, ці сапраўды разгледзеў: бачыць толькі большанькая, і бачыць, здаецца, толькі дарожку, не далей.

Я саскочыў з каня, прывязаў яго да невысокага і разгалінастага (не беларускага, а прывознага) клёна.

Большая, як ні брала на рукі, як ні старалася, а несці меншую не магла. Два-тры крокі — або сама апускае дзіцятка на зямлю, або тое вывальваецца з рук. Такіх вялых, такіх знясіленых не толькі дзяцей, ніякіх іншых істот за гады і гады маіх «ступеняў» пастухоўства, за свае дваццаць пяць я не бачыў. Твару — ні на адной, ні на другой. Большая ці пачула мае крокі, ці ўбачыла мяне. На твары, у вачах — ні жывінкі, ні крывінкі. Вялыя рукі выпусцілі малую. Прыкленчыўшы, яна паспрабавала ўзяць на рукі, на лано — не здужала. Я падняў малую, паднёс бліжэй да каня, палажыў на нерастрэсены падсохлы пракос, а павярнуўся — на маіх вачах, ступіўшы два крокі, большая ўпала... на роўнай дарозе... дзе не было ні

ЭТЫКА МАРАЛЬ ПРАВА

ХУТЧЭЙ ДОКТАРА!..

НАТАТКІ ЖУРНАЛІСТА

Два лісты ў рэдакцыю, дзве гісторыі з амаль аднолькавым сюжэтам. Адна з іх закончылася трагічна... Але не чакайце, чытач, дэтэктыўнага разгортвання падзей, — гаворка пойдзе пра такую, здаецца, звычайную і зразумелую рэч, як адносіны чалавека да свайго службовага абавязку. Тэма, якая сёння, калі над краінай веюць свежыя ветры перамен, набывае асаблівую вастрыню.

Сфера чалавечых адносін, якую я хачу закрануць, нейкім чынам адметная. Урач і хворы. Або больш правільна — хворы і ўрач. Я не ведаю, калі можна так сказаць, больш сур'ёзных спалучэнняў. Не ведаю, дзе б яшчэ адзін чалавек так залежаў ад другога. Не ведаю, дзе б яшчэ парушэнне службовага абавязку было б такое небяспечнае на вынікі...

Вось як развіваліся гэтыя сюжэты (прозвішчы дзейных асоб у артыкуле зменены).

...Яўгенія Іосіфаўна выклікала хуткую дапамогу а трэцяй гадзіне ночы. Сын яе, трынаццацігадовы Андрэй, дзень ці два ўжо кепска сябе адчуваў, нудзіўся, але вялікай трывогі гэта ў маці не выклікала, тым больш, што напярэдадні была ўчастковая доктарка, якая сказала, што ў хлопчыка звычайная прастуда. Але цяпер, ноччу, Андрэй раптам пабудзіў яе, паскардзіўшыся на боль у жываце, і Яўгенія Іосіфаўна, якая ўсё жыццё чула, што калі баліць жывот — гэта амаль заўсёды небяспечна, адразу выклікала хуткую дапамогу. Праз колькі хвілін прыехала ўрач хуткай П. Бараноўская, якая агледзела хлопчыка і знайшла на яго целе сып. Прымаючы да ўвагі, што ў хворага яшчэ і «малінавы» язык, адчувае ён сябе слабавата, упэўнена паставіла дыягназ — шкарлятына. Рэкамендавала звярнуцца да ўчастковага ўрача.

Праз гадзіну-дзве пасля ад'езду Бараноўскай жывот у Андрэя забалеў мацней, і Яўгенія Іосіфаўна зноў выклікала хуткую дапамогу.

Урач К. Быцько, даведаўшыся, што да яго ўжо прыязджала хуткая, паўжартам папракнула хлопца: «Што ж ты непакоіш і маці, і нас, дактароў?»

Агледзеўшы хворага, яна таксама ўбачыла сып (пасля ўжо, у час нашай сустрэчы, Клара Іванаўна Быцько гэты эпізод падасць наступным чынам: «Я сказала — жанчына, бачыце, у вашага дзіцяці сып. Гэта шкарлятына»). Яўгенія Іосіфаўна нясмела выказала меркаванне, што сып алергічнага паходжання, бо Андрэй дрэнна пераносіць антыбіётыкі... Доктарка на гэта скептычна ўсміхнулася. «Ну, а чаму боль у жываце?» — не сунімалася маці. «Боль? — перапытала Быцько. — А ну, хлопчык, паскачы, — загадала яна. — Бачыце, жанчына, каб балеў жывот, ён бы і з месца не скрануўся»...

Праз дзве гадзіны ўжо сам Андрэй просіць маці хутчэй выклікаць хуткую дапамогу, бо так нясцерпна баліць жывот.

Трэці за тую ноч урач хуткай Л. Дзвінскі ставіць ужо зусім новы дыягназ — вострый гастрыт, і прапануе неадкладна шпіталізаваць хлопчыка. На машыне хуткай дапамогі яго адвозяць у 3-ю дзіцячую бальніцу Мінска.

Вы ўздыхнулі з палёгкай, чытач? Ох, не спяшайцеся. У прыёмным пакоі бальніцы дзяжурны ўрач М. Сталешнікаў ставіць хвораму хлопчыку зноў новы дыягназ — чацвёрты за апошнія шэсць гадзін: вірусны гепатыт (пазней урач скажа, што яму прыйшоў у галаву такі дыягназ з-за распаўсюджанасці гэтай хваробы ў дзяцей). Праўда, пасля аналізу, ад гэтага дыягназу давялося адмовіцца. Тады Андрэя паказваюць хірургу В. Данілавай, якая дае катэгарычнае заключэнне: у брушной поласці хворага ніякай паталогіі няма і хірургічнага ўмяшальніцтва не патрабуецца.

Праз ноч, раніцой, асістэнт кафедры шпітальнай хірургіі, агледзеўшы Андрэя, лакалізаваў у правай паўздошнай частцы жывата запальны працэс. Хлопца, не марудзячы ні мінуты, вязуць у Рэспубліканскі дзіцячы хірургічны цэнтр, дзе яго адразу кладуць на аперацыйны стол. Дзве гадзіны хірург змагаецца за жыццё Андрэя.

Я чытаў дыягназ, апошні, сапраўдны, — сутачны разліты ператаніт у выніку гангрэзнага запалення апендыкса.

Сёння небяспека ўжо адышла. Відаць, хлопцу наканавана доўга жыць. Грэх, вядома, параўноўваць, але гэтая гісторыя міжволі асацыіруецца ў мяне з адной гульнёй. Вы, мабыць, яе ведаеце. Аднаго з удзельнікаў гульні выводзяць з пакоя, а ў гэты час астатнія хаваюць якую-небудзь рэч. Затым той «небарака» вяртаецца і пачынае яе шукаць. У час пошуку ўдзельнікі гульні пэўным чынам арыентуюць шукальніка. Калі ён набліжаецца да схаванай рэчы, яму крычаць: «цяплей», «яшчэ цяплей», ці нават — «горача», а калі аддаляецца, дык — «холадна»...

Калі меркаваць па нашай гісторыі, большасць урачоў — шукальнікаў Андрэевай хваробы былі за рысай, дзе гучыць толькі адно: «вельмі холадна».

Гульня, вядома, вясёлая. А тут...

...Я б не сказаў, што мой візіт у гарадскую станцыю хуткай дапамогі выклікаў вялікую радасць у яго насельнікаў. Хутчэй, наадварот. Не, усё было досыць прыстойна — усе мае пытанні не засталіся без адказаў. Але па асобных рэплініках, па інтанацыі, па тым, што, як гаворыцца, чытаецца між радкоў, адчувалася — урачы пакрыўджаны і нават ці не абураны самім фактам цікаўнасці журналіста.

Я сустрэўся амаль з усімі, хто меў дачыненне да хваробы Андрэя. Шчыра кажучы, мне, між іншым, вельмі хацелася даведацца, як яны перажылі яе. Усё ж такі, яўная ўрачэбная памылка. Але нічога, акрамя ўнутранай насцярожанасці, я не ўбачыў. Выпадак гэты ўсё-такі набыў даволі шырокую вядомасць (за подпісам галоўнага ўрача першай клінічнай бальніцы, да якой належыць дзіцячы хірургічны цэнтр, на гарадскую станцыю хуткай дапамогі прыйшла афіцыйная папера, у якой было ўказана на нясвоечасовую дыягностыку ў выпадку з Андрэем), і ўрачы адчувалі пэўную няёмкасць у сувязі з «праколам».

Так, сапраўды, выпадак быў неардынарны. Апендыкс у хлопчыка знаходзіўся не там, дзе яму належыць быць, — хаваўся недзе за пячонкай, што бывае досыць рэдка і гэта, вядома, ускладніла дыягностыку. Пра гэта мне тут толькі і гаварылі. Ды яшчэ быў у іх другі немалаважны «аргумент» — у трэцяй дзіцячай бальніцы з дыягназам таксама доўга блыталі (у бальніцы ў сваю чаргу спасылаліся на хуткую дапамогу, якая не распазнала хваробу).

— Вы разумееце, — пранікнёна даводзіў мне загадчык дзіцячага аддзялення гарадской станцыі хуткай дапамогі Паланевіч, — у спецыяльнай літаратуры даецца апісанне амаль двухсот сімптомаў апендыцыту, а мы карыстаемся ў асноўным толькі трыма-чатырма.

Прызнацца, я не ведаў, што яму на гэта адказаць. Што мо трэба ўлічваць калі не дзвесце, дык хоць бы дваццаць? Але гэта, нарэшце, на сумленні ўрача. Галоўнае, мне здаецца, у дадзеным выпадку трэба было быць проста больш уважлівым, маючы на ўвазе і самы цяжкі варыянт. Я чуў, што яшчэ ў медінстытуце будучых урачоў ці не на кожным курсе папярэджваюць адносна ўяўнай бяскрыўднасці апендыцыту, памылак у яго дыягностыцы. Чаму скаргі Андрэя на боль у жываце не насцярожылі ўрачоў, я і дагэтуль не разумею. Насцярожылі ж яны маці хлопчыка, а яна, ведаю, не з панікёрак, і без патрэбы тры разы запар выклікаць хуткую дапамогу не стане.

У мяне няма намеру кідаць цень на сталічную службу хуткай дапамогі. Яна шмат чаго робіць карыснага, надзвычай важнага. На яе рахунку не адна тысяча выратаваных жыццяў. Намеснік галоўнага ўрача назваў мне ўнушальную лічбу: за год служба хуткай дапамогі прымае і «рэалізуе» да пяцісот тысяч выклікаў. Уражвае, праўда? Толькі адно мне не спадабалася — дужа ўжо бараніў ён сваіх калег, што выязджалі па выкліках маці Андрэя.

— Я ўжо пабыў там, — сказаў намеснік галоўурача, — здаецца, яна да нас нічога не мае. Але сёння паедзем туды яшчэ раз з загадчыкам дзіцячага аддзялення...

Падумалася тады, калі на яго думку ўрачы выканалі свой абавязак бездакорна, дык навошта ездзіць да Яўгеніі Іосіфаўны? На ўсякі выпадак, каб не скардзілася?

Асабліва абараняў намеснік галоўнага К. Быцько, якая яшчэ і сакратар партарганізацыі.

— Яна вопытны, уважлівы ўрач, — даводзіў ён. — У тую ноч правяла ля хворага хлопчыка больш як паўгадзіны...

Я гэта слухаў і станавілася мне на душы кепска і неспакойна. Сама Клара Сцяпанаўна Быцько у гутарцы са мной зменшыла час свайго візіту ўдвая, а Яўгенія Іосіфаўна сказала, што Быцько была ў іх не больш, як дзесяць мінут. Ведаеце, у мяне ёсць падставы ёй верыць — некаторыя калегі Клары Сцяпанаўны характарызавалі яе, як своеасаблівага «чэмпіёна» па хуткасным выкананні візітаў...

Ох, як усё-такі мяне не любілі тут, на станцыі хуткай дапамогі.

— Усе зараз разумеюць у медыцыне, — з непрыхаванай прыкрасцю сказаў адзін з маіх субяседнікаў. — Усе ведаюць, як лячыць...

Што ж, яго можна і зразумець. Мне самому вельмі не сімпатычныя дамарослыя знаўцы. Але вы заўважылі? — яны, як правіла, паразітуюць менавіта на памылках урачоў.

Дактары, дактары... Што ні кажыце, а ўсё-такі пэўная каста, праўда? Мо з самых старажытных. У сярэднія вякі ўрач быў ахутаны тайнай, праз якую звычайнаму чалавеку было не прабіцца. Ды і пасля. Я нядаўна перачытаў «Запіскі ўрача» В. В. Верасаева, якія выйшлі ў самым канцы мінулага стагоддзя і сталі, кажучы сучаснай мовай, бестселерам. Між іншым, аўтар «Запісак» падкрэсліваў і цэхавую замкнёнасць урачоў, і тое, што пад белым доктарскім халатам, бывае, хаваецца халодны, абыякавы і, галоўнае, некампетэнтны чалавек. Сярод некаторай часткі медыкаў ініга Верасаева ўзняла буру абурэння. Галоўны аргумент праціўнікаў «Запісак» — няма чаго пра ўсё гэта расказваць прафанам, гэта не іх справа. Нехта з пра-

У дарозе. У жыцці.

(Працяг. Пачатак на стар. 13).

— падружоўленую паперку. А на ёй, на паперцы, — сама ўмова: дзе, калі, «колькі на колькі» (колькі нас, беларускіх партызанаў, і колькі іх, славакаў) сустрэнемся, каб параіцца, што і як далей. Кантакты ўжо ёсць, падрыхтаваліся не два і не тры славакі — салдаты, афіцэры — змяніць мінскі гарнізонны адрас на лясны, Маныла́ўскі, Краснасельскі, даць душы і рукам волю, каб іх, волю і сілу, павярнуць на ворага — фашызм. На ворага не толькі Беларусі і беларусаў, на ворага не толькі Славакіі і славакаў.

У Тані ёсць што ўспомніць і, каб умела, ёсць чым пахваліцца. Мае намер, мае падтрымку ад сяброў, з кім працуе, ад кіраўнікоў на працы: трэба паехаць у Славакію. Каму што, а ёй — не хаваецца Таня — знайсці, убачыць хоць двух, хоць бы трох-чатырох, а была б вельмі шчаслівая, калі б усіх, каго ў вайну, улетку і пад восень тысяча дзевяцьсот сорак трэцяга года бачыла, каго сустракала, каму нешта сігналіла ручкаю, каму перадавала кароценькае нібы пісьмо, а то — проста чысценькі квадратовы ці трохкутны шматок паперы — сігнал! Сустракала тых, каго фашысты прывезлі ў Мінск, на Міншчыну, каб зрабіць іх знішчальнікамі. А яны — людзі! Шукалі і знаходзілі людзей, саміх народных мсціўцаў!

І Таня пытаецца ў мяне:

— А калі я ўбачу тых трох, што качаліся ад смеху, што не маглі надзівіцца, што, аж сцелючыся, рагаталі, расказваючы пра сустрэчу ў ляску пад Мінскам з партызанам?

Меліся выйсці на сустрэчу тры славакі і тры партызаны, а выйшаў толькі адзін... Сустракаліся тры высокія, статныя і адзін, невысокі, неплячысты, хударлявы.

Як было? Павінны сустрэцца тры на тры. Месца? У маладым нярэдкім лесе, на яго сярэдзіне — нібы расчышчанай палянцы. Тры партызанскія разведчыкі раіліся, думалі: пад самым Мінскам — і ўсім траім выйсці на сустрэчу? Не парад жа. А пры нейкай горкай выпадковасці? Могуць нечакана паявіцца — на машынах жа — эсэсаўцы, уласаўская або якая іншая рота дрэні. Ці ўсім тром выходзіць на сустрэчу? У аднаго з трох — жонка, двое дзетак, у другога, што толькі ў 1941 годзе скончыў дзевяты клас, — сястрычка і сталая сястра з двума сынкамі, у яго і аўдавелая, не вельмі дужая мама. А трэці? Яго асіраціла карная экспедыцыя. Ён родам не тутэйшы, не з-пад Мінска, то як ні кажы — адзінокі... У яго тут ні крэўных, ні далекаватых сваякоў. І сам вызваўся выйсці на сустрэчу з трыма. Сам прапанаваў: два хлопцы-разведчыкі засядуць між кустоў, трымаючы — вайна ж! вайною ж! — пальцы на спускавых кручках, а выйдзе адзін. І калі ў назначаную хвіліну гэты адзін-адзінокі з-за кустоў убачыў, што на паляну ступілі адзін за адным тры славакі, падняўся і спакойна пайшоў насустрач. І ён, і тыя два, што сядзелі ў засадзе, бачылі: насустрач аднаму ішлі афіцэр і два салдаты; набліжаючыся да партызанскага разведчыка, неяк выстаўлялі наперад рукі, нешта казалі, усміхаліся. Першае, што сказалі славакі, падаючы партызану-разведчыку рукі, вітаючыся з ім, як яны ўспрынялі з'яўленне аднаго, а не трох, — як прыгожы жарт, як жарт упэўненасці, рашучасці, высокай мужнасці. Трэба ж! Адзін!..

Гэты адзін, невысокі і нешырокі, ішоў па Сваёй, па Беларускай Зямлі. Ішоў за Сваю Зямлю і дзеля Сваёй Зямлі. Не яму баяцца. Такімі і іншымі словамі казалі, выказвалі пра ўбачанае тыя тры — заўтрашнія партызаны.

Таня зноў успамінае і дзеля мяне, і каб расказаць маім гасцям пра Яна Босака, з якім сустракаліся ў вайну недалёка ад яе хаты і ў яе хаце, з якім сустракаліся ў Танінай хаце і за

фесараў медыцыны нават напісаў Вікенцію Вікенцьевічу, што «Дрэнная тая птушка, што пэцкае ва ўласным гняздзе»...

Скажуць, успомніў! Параўнаў! Калі тое было... Ну, вядома ж, былому земскаму ўрачу далёка ад выпускніка сучаснага медыцынскага інстытута, узброенага самымі сучаснымі ведамі. Але хіба і сёння пад тым святым белым халатам не хаваюцца, часам, няўважлівасць, чэрствасць, раўнадушша? Дык мо нам трэба пра гэта гаварыць гучна, на поўны голас?

Так, ад памылак ніхто не застрахаваны. І ўрачы, вядома, таксама. Але ж ці не занадта лёгка, часам, спісваюцца з іх любыя памылкі? Вы падумалі, чытач, у што яны абыходзяцца?

Мне казалі, што вельмі цяжка вызначыць, даказаць урачэбную памылку. Маўляў, чалавек не машына, «здароўе» якой можна прагназіраваць. Мо яно і так. Але ад такіх разваг становіцца нешта не па сабе. Дык што — памылак няма, ці яны ёсць, але іх нельга даказаць? А, скажыце, хто іх наогул спрабуе даказваць? Нешта не чуў я, каб у судах калі - небудзь разглядалася крымінальная справа аб урачэбнай памылцы. Дарэчы, што вы думаеце аб самой прыродзе такіх памылак? Некампетэнтнасць, няпопытнасць урача? Так. Але яны выспяваюць, мне здаецца, яшчэ і там, дзе прызвычаіліся да пакут хворых, адапціраваліся да іх, там, дзе мозг урача раўнадушна фіксуе толькі адно: вось яшчэ адзін хворы, яшчэ адзін клопат...

Я падыходжу да другой гісторыі, якая, на вялікі жаль, скончылася трагічна.

27 жніўня гэтага года мастак С., які быў у сваёй майстэрні, раптам адчуў моцны боль за грудзінай. Ён пацягнуўся да тэлефона, набраў дрыжачымі пальцамі 03, і неўзабаве машына хуткай дапамогі з чырвонай паласой на кузаве, з сірэнай і мігалкай прымчала.

Урач Уладзімір Сяргеевіч Лінькевіч... Але дамо яму самому слова:

— У майстэрні знаходзіўся высокі мажны мужчына гадоў сарака пяці. Пачуўшы, што ён скардзіцца на загрудзінны боль, мы зрабілі яму ўкол і знялі электракардыяграму. Яна паказала змяненні ў сардэчнай дзейнасці, адразу ўзнікла моцнае падазрэнне на інфаркт міякарда. Самай блізкай ад майстэрні лячэбнай установай, дзе ёсць кардыялагічнае аддзяленне і рэанімацыя, была другая клінічная бальніца, куды мы і павезлі хворага.

Адразу скажу, што ў прыёмным пакоі бальніцы сустрэлі нас з крайнім незадавальненнем. Зірнуўшы ў пашпарт С., загадчык прыёмнага пакоя пачаў гучна даводзіць, што ён не іх хворы. Мне не было часу з ім спрачацца, і я паехаў, пакінуўшы хворага ў прыёмным пакоі. Калі праз некалькі дзён я даведаўся пра смерць С., дык быў вельмі здзіўлены гэтым. Нішто спачатку не паказвала на лятальны зыход. Але ж я вымушаны быў хутка паехаць і што было пасля мяне не ведаю.

Цяпер, калі я правёў сваё журналісцкае расследаванне, я магу сказаць, што было «пасля»...

Спачатку пра тое, «чый» хворы быў С. Колькі ўжо пра гэта пісалася, колькі жудасных гісторый расказвалася пра тое, як у бальніцы ці паліклініцы адмовілі чалавеку ў дапамозе таму, што ён не з «той» вуліцы. І гэта ў той час, калі ёсць загад Міністэрства аховы здароўя СССР аб тым, што пры выпадках, калі здароўе чалавека знаходзіцца пад пагрозай, яго павінна прыняць кожная лячэбная ўстанова, незалежна ад таго, дзе ён жыве.

Не, не, С. на вуліцы не апынуўся. Ён застаўся ў прыёмным пакоі. Пакуль што... Яму нават зрабілі тут кардыяграму, у якой урач не знайшоў (ці не захацеў знайсці) нічога небяспечнага, пасля чаго загадаў адправіць хворага ў бальніцу хуткай дапамогі. Там адразу па прыездзе, паўтараю, — адразу, у яго фіксуюць вялікі інфаркт міякарда. Праз паўтара сутак С. памёр.

Што і казаць, інфаркт цяжкая, небяспечная хвароба, многія ад яе адпраўляюцца, кажучы па-руску, «в мир иной». Але ж многіх, вельмі многіх і ратуюць, пра што сведчыць і ўласны вопыт аўтара гэтых нататак...

Ці можна было ўратаваць С.? Што тычыцца бальніцы хуткай дапамогі, дык, мяркуючы па тым, што мне расказалі ўрачы і што запісана ў гісторыі хваробы, — тут змагаліся за яго жыццё да канца. Калі стан хворага рэзка пагоршыўся, была праведзена глыбокая рэанімацыя, якая, на жаль, не дала выніку.

А вось што адбылося напярэдадні ў прыёмным пакоі 2-й клінічнай бальніцы, мне не вельмі зразумела. Хто пэўна можа сказаць, што тыя паўтары гадзіны, якія С. правёў тут у невядомасці, ды паўгадзіны яшчэ ў машыне, калі адвозілі яго ў бальніцу хуткай дапамогі, не адыгралі ў яго лёсе пагібельнай ролі. Пры інфаркце міякарда, бывае, пры адным толькі рэзкім руху хвароба рэзка ўскладняецца. У прыёмным пакоі С. быў на нагах, сам сеў у машыну... Скажуць, ён мог памерці і калі б яго пакінулі на месцы. Магчыма. Але я магу з такой жа доляй упэўненасці сцвярджаць і процілеглае. Вось гэтая няпэўнасць і прымусіла мяне ўзяцца за пяро. Бо няпэўнасць узнікае там, дзе нешта недароблена...

Мы нарэшце сустрэліся з загадчыкам прыёмнага пакоя 2-й клінічнай бальніцы Турам Аляксеем Міхайлавічам. У гадах ужо — з-пад белай шапачкі выбіваецца сівізна, вочы глядзяць насцярожана. Паказвае запіс у кнізе за 27 жніўня: калі С. прывезлі, зрабілі кардыяграму, адправілі ў бальніцу хуткай дапамогі...

— Вы зрокава помніце таго хворага? — пытаюся ў Аляксея Міхайлавіча.

— Помню добра, — адказвае ён. — Імпазантны, мажны, як кажуць, мужчына ў саку. Але, разумееце, з месцамі ў нас было цяжка, а ў рэанімацыі наогул ніводнага месца... Цяпер я разумею, што, відаць, не ўнікнуў як след у кардыяграму, не ўбачыў інфаркта, а ён, аказваецца быў, мне пра гэта з бальніцы хуткай дапамогі паведамілі.

Памаўчаўшы крыху, успамінае:

— Дарэчы, хворы быў сам крыху вінаваты — сказаў, што ў яго з сэрцам такое ўжо не першы раз, гэта мяне і супакоіла. Ведаеце, мы асабліва насцярожваемся, калі ў чалавека сардэчна прыступ адбываецца ўпершыню.

— Выходзіць, ён на сваю галаву прызнаўся, што нешта з сэрцам у яго было і раней? — дапытваюся я ў таварыша Тура. — Каб не сказаў, дык мо пакінулі б на месцы?

— Абавязкова, — кажа сівы доктар.

— Дык жа вы казалі, што не было месцаў...

— Знайшлі б, — не маргнуўшы вокам запэўніў Тур. — На раскладушцы паклалі б, у калідоры, нарэшце...

Мілай доктарцы, маёй участковай Надзеі Васільеўне, калі нядаўна быў у яе на прыёме, расказаў у агульных рысах пра ўсё, што вы ведаеце ўжо. .

Надзея Васільеўна ўздыхнула:

— Бедныя ўрачы, усе да іх з прэтэнзіямі...

Што на гэта . адказаць? Што не да ўсіх? Што часцей мы ўсё-такі пачціва схіляем галаву перад людзьмі ў белых халатах? І калі захварэем, ці не першае, што просім:

— Хутчэй доктара!

М. ЗАМСКІ.

Леў Майсеевіч АБЕЛІЁВІЧ

Музычнае мастацтва Беларусі панесла вялікую страту — на 74-ым годзе жыцця пасля цяжкай хваробы памёр кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Леў Майсеевіч Абеліёвіч.

Л. М. Абеліёвіч нарадзіўся 6 студзеня 1912 года ў Вільні. Атрымаў там сярэднюю агульную і музычную адукацыю. У 1941 годзе закончыў кампазітарскае аддзяленне Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага. У гады Вялікай Айчыннай вайны Л. М. Абеліёвіч служыў у палкавым ансамблі і аэрагеадэзічным атрадзе ў Горкаўскай вобласці. У 1944 годзе Камітэтам па справах мастацтваў пры Савеце Народных Камісараў СССР быў адазваны ў Маскву, дзе ўдасканальваў сваё прафесійнае майстэрства ў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. Затым працаваў кіраўніком хору мастацкай самадзейнасці і педагогам музычнай школы. З 1951 года Л. М. Абеліёвіч пастаянна жыў у Мінску і займаўся творчай работай. Член Саюза кампазітараў СССР з 1944 года.

Л. М. Абеліёвіч — адзін з вядомых беларускіх кампазітараў, аўтар вялікай колькасці музычных твораў розных жанраў. Яго музыка вызначаецца высокім прафесійным майстэрствам і пранікнёнай выразнасцю, гуманістычная і шчырая, раскрывае духоўны свет сучаснага чалавека, прасякнута пачуццём трывогі і адказнасці за лёс свету і чалавецтва. Сярод твораў Л. М. Абеліёвіча асабліва вылучаюцца Трэцяя і Чацвёртая (у другой рэдакцыі атрымала назву «Віцебская») сімфоніі, фартэпіянны цыкл «Фрэскі», фартэпіянны канцэрт, «Арыя» і «Вакаліз» для салістаў з аркестрам і інш. Асабліва значныя творчыя дасягненні кампазітара ў галіне сімфанічнага і камернага жанраў. Сачыненні Л. М. Абеліёвіча шырока выконваюцца не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі, уваходзяць у рэпертуар вядомых музыкантаў краіны.

Л. М. Абеліёвіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. На працягу многіх гадоў быў кіраўніком секцыі сімфанічнай і камернай музыкі Саюза кампазітараў БССР, членам праўлення кампазітарскай арганізацыі рэспублікі.

Заслугі Л. М. Абеліёвіча ў развіцці музычнага мастацтва адзначаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета РСФСР, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, ён удастоены ганаровага звання заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Светлая памяць пра Льва Майсеевіча Абеліёвіча, вядомага і таленавітага кампазітара, грамадзяніна назаўсёды захаваецца ў сэрцах тых, хто ведаў яго і працаваў разам з ім.

Міністэрства культуры БССР
Саюз кампазітараў БССР

ПАМЯЦІ КАНСТАНЦІНА СІМАНАВА

Буйніцкае поле... Тут у суровым ліпені 1941-га абаронцы Магілёва паказалі ўзоры храбрасці і стойкасці: у жорсткім баі 12 ліпеня воіны 388-га стралковага палка С. Куцепава знішчылі 39 фашысцкіх танкаў. Пра гэты бой К. Сіманаў, які тады быў пад Магілёвам, расказаў 20 ліпеня ў газеце «Известия» ў нарысе «Гарачы дзень», гэтыя гераічныя падзеі пазней леглі ў аснову яго рамана «Жывыя і мёртвыя». Усё жыццё пісьменнік помніў пра герояў-куцепаўцаў, не раз прыязджаў у Магілёў. Пасля смерці К. Сіманава каля шасэ, дзе некалі пралягаў пярэдні рубеж абароны горада, устаноўлены мемарыяльны знак, а Буйніцкае поле сёння называюць полем бавой і працоўнай славы, на ім вырошчваюць багатыя ўраджаі навучэнцы СПТВ № 1 імя К. П. Арлоўскага, якое знаходзіцца тут жа, у Буйнічах.

У сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння пісьменніка-франтавіка ў СПТВ № 1 адбыўся ўрачысты вечар. Сябры К. Сіманава маскоўскія пісьменнікі Я. Вараб'ёў і Л. Лазараў, а таксама яго сын А. Сіманаў расказалі пра жыццё і творчасць пісьменніка-камуніста, які навечна прапісан у Магілёве. Ветэран вайны, палкоўнік у адстаўцы І. Ціханаў прыгадаў свае сустрэчы з Канстанцінам Міхайлавічам, а сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў І. Аношкін расказаў, як магіляўчане шануюць памяць К. Сіманава.

Былі ўскладзены жывыя кветкі да помніка героям абароны і мемарыяльнага знака — Сіманаўскага камня.

Вечар памяці К. Сіманава прайшоў таксама ў Магілёўскай СШ № 13, дзе адзін з піянерскіх атрадаў носіць імя пісьменніка. Літаратары і блізкія К. Сіманава сустрэліся з работнікамі і чытачамі цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя К. Маркса. У абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна былі праведзены сіманаўскія чытанні.

Мерапрыемствы, прысвечаныя 70-годдзю з дня нараджэння К. Сіманава, завяршыліся вялікім літаратурным вечарам у абласным Палацы піянераў. Прасторную залу запоўнілі рабочыя і служачыя, інтэлігенцыя і студэнты, пісьменнікі і журналісты, кнігалюбы.

Адкрываючы вечар, старшыня Магілёўскага гарвыканкома А. С. Станкевіч адзначыў вялікі ўклад К. Сіманава ў савецкую літаратуру. Даклад аб жыцці і творчасці Сіманава зрабіў дацэнт Магілёўскага педінстытута Б. Бесчарэўных. З цёплымі, пранікнёнымі словамі пра пісьменніка-воіна выступілі першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Н. Гілевіч, П. Шасцерыкоў, студэнтка Магілёўскага педінстытута імя Аркадзя Куляшова Т. Няпрошына.

А. НОВІК.

«ТЭАТРАЛЬНЫ МІНСК» №6

Нумар адкрываецца артыкулам А. Міхалчанкавай «Зімовыя нататкі пра летнія ўражанні», у якім маскоўскі крытык аналізуе гастролі тэатра оперы і балета Беларусі ў Кішынёве.

«Пошукі і традыцыі беларускай аперэты» — роздум калінінградца В. Шпігунова аб гастролях Тэатра музычнай камедыі БССР у Калінінградзе.

Пад рубрыкай «Творчыя партрэты» змяшчаюцца артыкулы У. Рошчына «Справа яго жыцця» (пра тэатразнаўца У. Няфёда), А. Савіцкай «Шукаць сябе» (пра акцёра тэатра імя М. Горкага У. Шэлеста); С. Барысава «На магістральны кірунак» (пра саліста тэатра оперы і балета М. Рысава); А. Вайнштэйна «Мой сябар — балалайка» (пра дацэнта кансерваторыі М. Прашко).

Прэм'еры года разглядаюць В. Каратай («Пакуль ёсць людзі рускія...»), В. Козел («У палоне страху»), Т. Гаробчанка («Усё на продаж»).

Да 90-годдзя з дня нараджэння У. Крыловіча друкуецца артыкул Л. Балынінай «Артыст, грамадзянін, чалавек».

Змешчаны падборкі «Наш каляндар» і «Гумар».

дзень ці два да яго ад'езду ў канцы тысяча дзевяцьсот сорак чацвёртага ў Славакію з Беларусі, з беларускай сталіцы, адкуль яму дапамаглі беларусы знайсці дарогу ў шэрагі людзей з найганаровейшым таго часу імем — Партызаны. Адсюль ён ехаў у славацкую Банску Быстрыцу, ехаў не адзін. Абняўшыся і на ўсё жыццё з сяброўкаю з самога Мінска.

Прайшлі дні. Я гляджу на здымак. Гляджу на «групавы партрэт». Сама Таня, да яе прытуліліся жвавенькія, дасціпныя і кемлівыя ўнучка і ўнучак; дагледжаныя, у шчаслівым яны дзяцінстве.

Шкадаваў: не бачыў тым днём — не было ў маёй хаце — Таніных дачкі і сына. Далекавата, аж у Мурманску, тая двухгодачка — Таніна сястра Галя-Галінка, яе сям'я; з умелымі рукамі, працуюць, шчыруюць, варушацца, з хораша забяспечанымі і шчаслівымі дзеткамі жывуць у Мінску Танін сын і яго сям'я, у Маскве — Таніна дачка, яе сям'я.

Таня з неспакоем і ці не з сумам двойчы сказала, нібы намёкамі, але зразумелымі мне: «Далёка... Нашто ж далёка?.. Нібы рассыпаныя... А я?»

Яшчэ раз успамінае Таня Галю-Галінку. Яе ледзь не паўгоддзе тысяча дзевяцьсот сорак трэцяга, яе больш за паўгоддзе тысяча дзевяцьсот сорак чацвёртага... Успамінае і... пра не раз ашчасліўленую: той самы разведчык, што сустрэў іх, сястрычак, каля Лекараўкі, — ці спяшаўся, ці не, — кожны раз, убачыўшы Галю, браў яе на сядло; хоць на хвілінку, хоць на пяць станавілася Галя нераўнёю ўсім дзецям, — яна каталася на разведчыкавым кані, на шпаркім і стройным, на вычышчаным і блішчастым.

Ці сама гэта запамятала, ці, мабыць, паўтарае: ёй казалі, расказвалі, успаміналі.

Яшчэ з Танінага сёння

Таня — сёння мантажніца радыёэлектроннай апаратуры ў навукова-даследчым інстытуце. Працуе нястомна, рупліва.

Нарадзіла і выгадавала дачку, сына, дачакалася ўнучкі і ўнучка, чакае іх... яшчэ і яшчэ!..

Ратавала і выратавала сястрычку...

Ніякія і нічые рукі і сэрца не заменяць яе, Таню, дзеля дзяцей, дзеля ўнучкі і ўнука. Дарагія ёй завітанні і шчыраванні да старэнькіх мамы, таты: са спрадвечных мінчукоў мама, з падмінскіх апчакоўцаў (з Мінска відаць ён, Апчак) — тата. Завітанні дзеля душы сваёй і душ іхніх, на дапамогу ім, на жыццёвую цеплыню.

Жыве Таня руплівым і рухавым жыццём. З любоўю да яго. З непахісным правілам і правам: Трэба жыць!

(Заканчэнне будзе).

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Ой, дудка мая, дудка...

Пятнаццаты год працуе пры 111-й мінскай сярэдняй школе фальклорны ансамбль «Дударыкі», які сёлета стаў лаўрэатам на аглядзе-конкурсе калектываў мастацкай самадзейнасці беларускай сталіцы. Такіх незвычайных, цікавых і, галоўнае, вядомых калектываў, дзе ўдзельнікамі з'яўляюцца менавіта вучні, у горадзе можна налічыць адзінкі, бо вельмі часта з моманту свайго ўтварэння сустрэчаюцца яны з арганізацыйнымі, фінансавымі і іншымі цяжкасцямі, пераадолець якія пашчасціла не кожнаму.

Многае, зразумела, залежыць тут ад кіраўніка групы, ад таго, наколькі ён улюбёны ў сваю справу, каб прымусіць дзіцячыя сэрцы загарэцца любоўю да музыкі, загартаваць упэўненасць школьнікаў у сваіх магчымасцях. Гэта здолеў зрабіць Д. Равенскі, заснавальнік і музычны кіраўнік ансамбля «Дударыкі», чалавек, для якога адраджэнне народнага мастацтва стала справай жыцця.

— Дзмітрый Дзмітрыевіч, калі ўпершыню прыйшла да вас думка аб арганізацыі фальклорнага ансамбля? Як ён нарадзіўся? Чаму ў якасці асноўнага інструмента ўзята дудка, якая мала выкарыстоўваецца ў іншых народных калектывах?

— Раней без гэтага самаробнага інструмента не абыходзілася ніводнае вясковае свята. Памятаю з маленства прымаўку: «Грай, дудар, весялі, забаўляй народ». Пагулянка якая, вяселле — яго ў круг. Голас дудкі, працяжны, мілагучны, суправаджаў разам са скрыпкаю, цымбаламі, гармонікам усё жыццё селяніна — спяваў яму першую калыханку, вёў на сустрэчу з каханай, пад старасць навяваў успаміны пра маладыя гады. А зрабіць дудку мог кожны. Ды з цягам часу сакрэт той пачаў забывацца. Цяпер на Беларусі майстэрствам яе вырабу валодаюць, на жаль, нямногія старыя ў вёсках, тым больш, што некаторыя з іх, разупэўніўшыся ў неабходнасці перадаваць свае веды і ўменне моладзі, так і знесуць з сабой таямніцу старажытнага інструмента.

Вось я і вырашыў зацікавіць дзяцей гэтай справаю, прывіць ім любоў да набыткаў беларускай культуры. Так узнік гурток, дзе мы спачатку вучыліся самі майстраваць дудкі, а пасля пачалі асвойваць ігру на іх. Пакуль, праўда, большасць дудак для ансамбля раблю сам. Яны металічныя, з густымі, прыгожымі, гучнымі галасамі. На іх дзецям, асабліва малым, лягчэй іграць. Ды толькі часам з'яўляецца жаданне даць людзям магчымасць паслухаць, як гучаць народныя мелодыі стогадовай даўнасці на драўляных дудках. Спадзяюся, што неўзабаве здолеем гэта ажыццявіць.

Калі толькі пачыналі (нас было ўсяго чатыры чалавекі), жыла ва ўсіх у душы нейкая нявыказаная боязь, што не зразумеюць, не падтрымаюць. То ж быў час рок-гітарных бардаў, дык што ім такая «несучасная» музыка. Але першы ж канцэрт прынёс нам прызнанне гледачоў і ўпэўненасць у сваіх сілах.

— Я чула, што ваш дзед быў неблагім скрыпачом, а бабуля — лепшай на вёсцы спявачкай. Атрымліваецца, што далучанасць да музыкі стала ў вашай сям'і традыцыяй, бо па тым самым шляху ідуць цяпер і вашы дзеці.

— Можа, і так. Часта ў дзяцінстве мне даводзілася чуць задушэўныя мелодыі старадаўніх беларускіх песень, якія запомніліся на ўсё жыццё. І цяпер, калі мінула столькі гадоў, я адчуваю, што якраз тая атмасфера блізкасці, роднасці з каранямі, вытокамі народнай творчасці абудзіла маю цікавасць да фальклору, паўплывала на выбар будучай прафесіі. Многія хлопчыкі і дзяўчынкі з «Дударыкаў» хоць крышачку, але звязаны з музыкай, бо, жывучы шмат год у яе цудоўным палоне, нельга потым назаўсёды выкрасліць гэты час з памяці. Гэта як першае, самае таямнічае, непаўторнае, але і, здараецца, кароткае каханне, яго памятаеш усё жыццё. Дзеля таго і ездзіў я з дзецьмі на маю радзіму — Капыльшчыну, каб адшукаць сакрэт дудак, дзеля таго адраджаю, уваскрасаю забытае майстэрства.

— Дык ваш рэпертуар цалкам складаецца з беларускай народнай музыкі?

— Так. Дзеці самі нястомныя шукальнікі фальклору. І калі яны ездзяць па рэспубліцы, абавязкова запісваюць песні. Такая ў нас традыцыя. Але дзеці ёсць дзеці, большую частку забытых мелодый адшукваю сам, раблю аранжыроўкі і ўключаю ў праграму канцэртаў. Мы ўвесь час гаворым пра дудкі. Яны, вядома, пераважаюць у нашым ансамблі, адыгрываюць галоўную ролю, але шмат ім дапамагаюць і скрыпкі, бубны, іншыя інструменты. Не ўспомніць іх нельга. Іграюць на іх не толькі хлопчыкі, але і дзяўчынкі (нас ужо чалавек трыццаць). Дзеці ахвотна ідуць у калектыў, і я не памятаю ніводнага выпадку, каб хто кінуў бы яго. Ахвотна сябруюць, хоць калектыў наш рознаўзроставы — вучні ад першага да дзесятага класаў, наведваюцца часам і былыя выхаванцы.

Такі падбор не выпадковы, бо старэйшыя вучаць малодшых таму, што калісьці засвоілі самі. А малыя растуць паступова ў прафесійным майстэрстве: спачатку лыжкі (дарэчы, раней мы іх рабілі самі, цяпер карыстаемся купленымі — прыгажэйшыя, а гук той жа), потым больш складаныя партыі на бубнах, дудках, скрыпках. Кожны ўдзельнік ансамбля можа іграць на любым з усіх нашых інструментаў. Прыходзяць да нас і так званыя «цяжкія» падлеткі. Не хачу гучна заяўляць, што музыка іх наставіла на шлях ісціны ці зрабіла цуд. Але факт ёсць факт, і ён неабвержна сведчыць: кожны з іх знайшоў сваё месца ў жыцці.

Ужо дзесяты год школьны ансамбль бясплатна адпачывае ў час летніх канікулаў у піянерскім лагеры Мінскага трактарнага завода, начальнікам якога я з'яўляюся шмат гадоў. Месяцы, праведзеныя разам, даюць магчымасць працягваць рэпетыцыі, наладжваць канцэрты перад мясцовымі жыхарамі.

— Але вы кіруеце, акрамя ансамбля, яшчэ і духавым аркестрам і музычнай студыяй. Ці не перашкаджае гэта займацца асноўнай справай?

— Наадварот, дапамагае. Таленавітых дзяцей знайсці не так лёгка. А тут, на занятках, выяўляецца, хто на што здольны.

На развітанне хачу сыграць вам на саломцы. На звычайнай саломцы з засушаным каласком. Дзіўная рэч. Раней на такіх саломках мог іграць ледзь не кожны хлопец. А цяпер выраб іх лічыцца таямніцай, бо трэба ведаць, калі зразаць саломку — у пэўны перыяд паспявання, дзень і нават час сутак. Але адшукалі ж мы сакрэт дудкі, дык знойдзем і таямніцу саломкі. Часу спатрэбіцца, вядома, багата. Ды ўсведамленне таго, што робім мы добрую справу, дапаможа. І захопленасць дзяцей народнай музыкай разгарыцца ў іх сэрцах яшчэ больш. Я ўпэўнены ў гэтым.

Гутарыла
Наталля ШАРАНГОВІЧ.

Заўсёды з вялікім поспехам праходзяць выступленні жаночай вакальнай групы Шаркаўшчынскага раённага Дома культуры. Гэты калектыў, якім кіруе Галіна Пятроўна Сафончык, удзельнік абласных аглядаў, часты госць у калгасах і саўгасах раёна. У яго рэпертуары беларускія і рускія песні. Змястоўнай мае быць і чарговая праграма, што рыхтуецца да навагодняга канцэрта.

На здымку: ідзе рэпетыцыя.

Тэкст і фота
М. МІНКОВІЧА.

НА ЭКРАНЕ

з 16 па 22 снежня 1985 года

16 снежня, 18.45.

Фестываль мастацкіх калектываў рэспублікі, прысвечаны XXVII з'езду КПСС «КВІТНЕЙ, МАЯ РАДЗІМА!»

Канцэрт Дзяржаўнай акадэмічнай народнай харавой капэлы імя Р. Шырмы.

У праграме творы Лучанка, Вагнера, Пукста, Туранкова, Мдзівані. Мастацкі кіраўнік і дырыжор А. Шунтаў.

19 снежня, 18.40.

«І ГАРМОНІЯ, І ПРЫГАЖОСЦЬ»

Да адкрыцця XIII з'езда архітэктараў Беларусі.

20 снежня, 20.20.

СПЯВАЕ НАРОДНАЯ АРТЫСТКА СССР С. ДАНІЛЮК.

Вы пачуеце рамансы А. Багатырова і Д. Смольскага.

21 снежня, 12.00.

«ЛЮДЗІ, ТАЛЕНТ, ДОБЛЕСЦЬ»

Па старонках зборніка нарысаў беларускіх пісьменнікаў. У перадачы прымаюць удзел пісьменнік Л. Левановіч, малады публіцыст А. Шагун. Вядучы — пісьменнік В. Супрунчук.

21 снежня, 15.15.

«ЭКРАН, ПРАБЛЕМЫ, ГЕРОІ...»

У тэлекіназале рэжысёр В. Нікіфараў. Вы ўбачыце таксама ўрыўкі з яго фільмаў «Зімародак», «Дзяржаўная граніца», «Бацькі і дзеці», «Фруза».

21 снежня, 16.20.

«У СВЕЦЕ ТАНЦА»

Перадача расказвае пра гастролі балетнай трупы Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР у Іспаніі і Партугаліі.

21 снежня, 17.45.

«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ»

Перадача падрыхтавана да 80-годдзя народнага мастака БССР Андрэя Ануфрыевіча Бембеля.

Вядучы — мастацтвазнавец У. Бойка.

21 снежня, 18.35.

«ВІЦЕБСКАЯ ВОСЕНЬ-85»

У пятым традыцыйным фестывалі джазавай музыкі прымалі ўдзел музыканты з многіх гарадоў краіны. Адной з цікавых і важных праблем, якія разглядаліся на фестывалі, было пытанне падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне эстраднай і джазавай музыкі.

Вядучы — журналіст Д. Падбярэзскі.

22 снежня, 14.50.

«СУГУЧЧА»

Расказваецца пра выпуск штогодніка перакладаў «Братэрства-85».

22 снежня, 18.45.

«ПА ВАШЫХ ПРОСЬБАХ»

Музычная праграма для энергетыкаў. У ёй выступяць Л. Зыкіна, вакальна-інструментальны ансамбль «Верасы», А. Лазарук, Н. Багуслаўская, Л. Лешчанка, квартэт «Сэрцы чатырох».

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

А. БАЧЫЛА. Крыло неспакою. Пошук, роздум, палеміка, успаміны. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 95 к.

ВОБРАЗ-85. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985.—45 к.

У. КАРАТКЕВІЧ. Мсціслаў. Эсэ пра гісторыю і людзей адной зямлі. На беларускай і рускай мовах. Мн., «Беларусь», 1985.—1 р. 30 к.

М. РЫЛЬСКІ. Світальная зара. Вершы і паэма. Серыя «Паэзія народаў СССР». Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 70 к.

СУЧАСНІК-85. Нарысы, публіцыстыка, хроніка. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 50 к.

К. КІРЭЕНКА. Калыска вятроў. Вершы і паэмы. Мн., «Юнацтва», 1985. — 60 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04554 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра і выяўленчага мастацтва — 33-21-53, аддзела музыкі і кіно —33-21-53, аддзела культуры —33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.